ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

№2 (1001), ЛЮТЫ, 2017
Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

Палітыка, эканоміка, культура

ISSN 0320-7544



# ГОД НАВУКІ
## эвалюцыйная формула

INTERNATIONAL
# The Minsk Times
Socio-political Weekly

## Пра падзеі ў Беларусі і свеце

# Штотыднёвік, які чытаюць у арыгінале

Не спазніцеся аформіць падпіску
Індэксы: ведамасны — 637302, індывідуальны — 63730

# ЗМЕСТ




**4 АДКРЫТЫ ФАРМАТ ВЯЛІКАЙ РАЗМОВЫ**

**8 Змены на паўднёвым напрамку** Беларусь і Егіпет дамовіліся падтрымліваць адзін аднаго ў рэгіянальных эканамічных аб'яднаннях, членамі якіх з'яўляюцца

**10 Дзелавая прыцягальнасць рынку** Судан стаў для Беларусі адным з найважнейшых партнёраў на Афрыканскім кантыненце




**30 АБРЫСЫ НАДЗЕЙНАЙ АБАРОНЫ**

**12 Дакладны кірунак вызначае будучыню** З сімвалічнай падзеі пачынаецца Год навукі, які аб'яўлены ў 2017-м. Прэзідэнт уручыў дыпломы і атэстаты новым дактарам навук і прафесарам

**14 Тут вучаць вучоных**

**18 Традыцыі высокага інтэлекту** Свае навуковыя пошукі ўраджэнцы Беларусі пачалі весці задоўга да таго, як на тэрыторыі краіны ў 1922 годзе ўзнікла першая беларуская навуковая ўстанова

**24 Новая арбіта спадарожніка**

**35 "У яе было вялікае шчырае сэрца"** Беларусцы з палескай вёскі Лактышы Ульяне Дрозд, якая ў 30-х гадах разам з мужам і дзецьмі пераехала ў далёкі аргенцінскі горад Брыса, пісьменнік Анібал Гуараглія прысвяціў апавяданне

**38 Крылы для палёту, альбо Шлях да прафесіі** Жыццёвая гісторыя пра тое, як дарослы сын маёй спадарожніцы знайшоў сябе. Яна можа быць карысная для ўсіх тых бацькоў, якім хацелася б зазахаваць сяброўства са сваімі дзецьмі на доўгія гады

**44 Рух у сваю прастору**

**48 Сардэчна запрашаем у Навагрудак** Дзіўны горад, дзе жыве гісторыя, асабліва прыгожы ўзімку

**50 Сяргей Кавальчык: Я адчуваю сябе шчаслівым, калі зала думае**



**52 ШЭДЭЎРЫ, ЯКІЯ ЗАЎСЁДЫ ПОБАЧ**

**Беларусь. Belarus**

Штомесячны часопіс

**№ 2 (1001), люты, 2017**
Выдаецца з 1930 года.

**Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 8.**
Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:**
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь,
Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия",
ААТ "Белзнешэканамбанк"

**Рэдактар**
Віктар Міхайлавіч Харкоў

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Дызайн і вёрстка:**
Вадзім Кандрашоў
Надзея Панкратава

**"Беларусь.Belarus"** выходзіць на беларускай, англійскай, іспанскай, кітайскай і польскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый.
Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **"Беларусь. Belarus"** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

**Выдавец:**
Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия".
Вул. Б. Хмяльніцкага, 10а,
220013, Мінск.

Часопіс надрукаваны ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
Паліграфічная ліцэнзія №02330/106 ад 30.04.2004.
Пр-т Незалежнасці, 79,
г. Мінск, Беларусь, 220013

Падпісана ў друк 21.02.17 г.
Выпуск у свет 28.02.17 г.

Афсетны друк. Папера крэйдаваная. Фармат 60х90 1/8.
Друкаваных аркушаў 7.
Гарнітура Міньён.

**Заказ № 512**
**Агульны тыраж** — 2327 экз.
(на беларускай мове — 184)

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Кісялёва, 11, г. Мінск, Беларусь, 220029.
Тэл.: +375 (17) 290-62-24,
+375 (17) 290-66-45.
Тэл./факс: +375 (17) 290-68-31.

**E-mail:** belmag@sb.by
**Падпісны індэкс** — 74820.
**Цана дамоўная.**

© **"Беларусь. Belarus"**, 2017

# Час адметных з’яў

Вядома ж, падбіраючы матэрыялы для публікацый, мы расстаўляем своеасаблівыя акцэнты на той ці іншай тэме. Што больш важнае? Без чаго нельга абысціся? — такія пытанні заўсёды ў парадку дня для работы над часопісам.

Уласна, прыкметныя падзеі самі арганічна прыцягваюць да сябе ўвагу. Напрыклад, як гэтая. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з прадстаўнікамі грамадскасці, беларускіх і замежных СМІ. Мерапрыемства прайшло ў пашыраным фармаце пад агульнай назвай “Вялікая размова з Прэзідэнтам”. У ім прынялі ўдзел каля чатырох дзясяткаў журналістаў, якія прадстаўляюць найбольш буйныя дзяржаўныя і недзяржаўныя беларускія СМІ, папулярныя інтэрнэт-парталы, аўтарытэтныя замежныя масмедыя. На сустрэчу былі запрошаны і шматлікія эксперты, сярод якіх вядомыя палітолагі, эканамісты, прадстаўнікі партый, канфесій і грамадскіх аб’яднанняў. Яны таксама ўдзельнічалі ў дыялогу па найбольш актуальных тэмах. Дарэчы, сама сустрэча доўжылася амаль сем з паловай гадзін. Думаецца, фрагменты адказаў Прэзідэнта на пытанні будуць цікавыя і чытачам нашага часопіса. Чытайце ў гэтым нумары публікацыю ***“Адкрыты фармат вялікай размовы”.***



Пачатак года адзначыўся знешняй актыўнасцю Беларусі на паўднёвым і паўднёва-ўсходнім напрамку. Аляксандр Лукашэнка ажыццявіў адразу два візіты — у Егіпет і Судан. Абедзве падзеі вельмі сімптаматычныя. Яны сведчаць на карысць таго, што прынцып знешнепалітычнай шматвектарнасці выконваецца, мае традыцыю, больш за тое прыносіць выгаду, у тым ліку эканамічную. Пацверджанне такіх высноў — у матэрыялах ***“Змены на паўднёвым напрамку”*** і ***“Дзелавая прыцягальнасць рынку”.***

У гэтым годзе, які аб’яўлены ў Беларусі Годам навукі, будзе адчувацца асаблівая ўвага да навуковых дасягненняў, той вялікай ролі, якая ўскладаецца на навуковую супольнасць. Але будзе, безумоўна, весціся размова і пра важнейшыя складнікі паспяховай дзейнасці вучоных. Менавіта ў гэтым кантэксце пабудавана і інтэрв’ю з рэктарам Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктарам фізіка-матэматычных навук, прафесарам Ігарам Ганчаронкам. Падрабязнасці ў публікацыі ***“Тут вучаць вучоных”.***

14-гадовая брытанка, паміраючы ад рэдкай формы раку, распарадзілася замарозіць сваё цела ў надзеі, што калі-небудзь чалавецтва пераможа смяротныя хваробы і навучыцца вяртаць людзей з ледзянога палону жывымі. У гэтым жаданні яна не адзінокая: у крыясховішчаў, створаных у ЗША і Расіі, ужо некалькі сотняў кліентаў, а спіс жадаючых пераваліў за тысячу. Перспектыва, што ўсім ім удасца атрымаць новае жыццё, уяўная. Тэхналогій, якія дазваляюць ажывіць пасля замарозкі нават асобныя органы, не гаворачы пра цэлы арганізм, пакуль няма. Але яны ўжо з’явіліся для тканак і клетак, здольных стаць бясцэнным лякарствам пры многіх захворваннях, і даступныя шырокай публіцы, у тым ліку ў нашай краіне. Напрыклад, у крыябанку Рэспубліканскага навукова-медыцынскага цэнтра “Клетачныя тэхналогіі” пры Інстытуце біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі. Што ж і з якой мэтай там можна замарозіць? Адказ можна атрымаць, прачытаўшы ў часопісе публікацыю ***“Сакрэты нізкіх тэмператур”.***

Ураджэнец Мінскай вобласці, двойчы Герой Савецкага Саюза Уладзімір Кавалёнак — адзін з першых касмічных доўгажыхароў. Яго палёт на караблі “Саюз-29” з Аляксандрам Іванчанкавым працягваўся рэкордныя на той момант 140 сутак. Тады, у 1978 годзе, ніхто не ведаў, ці выжывуць касмічныя марафонцы, вярнуўшыся на Зямлю. Наш зямляк у публікацыі ***“Касмічныя хронікі Уладзіміра Кавалёнка”*** расказаў пра свае прыгоды падчас палётаў.

У фондах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі — нямала прадметаў мастацтва, якія маюць не толькі еўрапейскую, але і сусветную каштоўнасць. У большай ступені гэта датычыцца жывапісу: работ як айчынных мастакоў, так і прадстаўнікоў іншых краін, чые карціны ў свой час былі набыты музеем. Сёння тут ёсць што паглядзець сапраўдным знаўцам — і ў пастаяннай экспазіцыі, і на рэгулярна праводзімых выставах, калі ўвазе наведвальнікаў прадстаўляюцца лепшыя работы з музейных запаснікаў. Вось і ў нашым цыкле мы раскажам пра сапраўдныя шэдэўры беларускага і сусветнага выяўленчага мастацтва, убачаныя ў галоўным музеі краіны. Чытайце ў гэтым нумары часопіса першую публікацыю. Яна называецца ***“Шэдэўры, якія заўсёды побач”.***

**ВІКТАР ХАРКОЎ**



## Дарога вядзе ў СГА

**Беларусь актывізавала працэс уступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю**

Мінск выйшаў на фінішную прамую ў марафонскім забегу ўступлення ў Сусветную гандлёвую арганізацыю. Першыя планы з'явіліся ў кіраўніцтва краіны яшчэ ў 1993 годзе, а калі ў 2016-м з Беларусі знялі санкцыі ЕС, арганізацыя ўзялася аднавіць перагаворы.

Беларуская дэлегацыя на чале з першым намеснікам Міністра замежных спраў Андрэем Еўдачэнкам некалькі дзён працавала ў Жэневе, дзе знаходзіцца штаб-кватэра СГА.

— Я падтрымліваю хутчэйшае ўступленне рэспублікі ў СГА, — заявіў гендырэктар арганізацыі Раберта Азеведа.

У пасяджэнні працоўнай групы, прысвечаным уступленню Мінска ў СГА, удзельнічалі прадстаўнікі сарака краін.

— Беларусь у значнай ступені дэ-факта ўжо жыве па стандартах СГА і мае намер актыўна дабівацца членства, каб скарыстацца ўсімі прагрэсіўнымі механізмамі арганізацыі, — сказаў Андрэй Еўдачэнка. — Адкрыццё нацыянальнага рынку для знешняй канкурэнцыі павінна адбывацца на падрыхтаванай глебе і на ўмовах, якія дазволяць Беларусі пастунова падрыхтавацца да новых рэалій.

Наступнае такое пасяджэнне намечана на другую палову 2017 года. Да гэтага часу Мінск мае намер увасобіць у жыццё рэкамендацыі, якія атрымаў на пасяджэнні. У дзеючай праграме сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны запісана, што Беларусь павінна стаць членам арганізацыі да 2020 года.

## Навукоўцам ёсць што паказаць

**Больш за 500 новых навуковых распрацовак было прадстаўлена на выставе да Дня беларускай навукі ў Нацыянальнай акадэміі навук**

Маштабная экспазіцыя ўключала дасягненні і найбольш значныя вынікі навукова-тэхнічнай ды інавацыйнай дзейнасці Беларусі. Свае распрацоўкі прадставілі навукоўцы і даследчыкі з 78 арганізацый краіны, у тым ліку з НАН Беларусі, міністэрстваў адукацыі, прамысловасці, аховы здароўя, сельскай гаспадаркі, Дзяржаўнага ваенна-прамысловага камітэта і Міністэрства абароны, а таксама з інавацыйных прадпрыемстваў, тэхнапаркаў. Асобна былі прадстаўлены распрацоўкі маладых навукоўцаў.

У рамках выставы таксама прайшоў сход навуковай грамадскасці, прысвечаны Дню беларускай навукі і Году навукі. Лепшым навукоўцам і даследчыкам краіны ўручаны ўзнагароды. Ад НАН Беларусі ўзнагароджаны пераможцы конкурсу "Топ-10" вынікаў дзейнасці навукоўцаў Нацыянальнай акадэміі навук у галіне фундаментальных даследаванняў за 2016 год.


БЕЛТА



## Ганконг дапамагае знайсці партнёраў

**Адбыўся візіт беларускай урадавай дэлегацыі ў спецыяльны адміністрацыйны раён Кітая**

Падчас візіту прайшла сустрэча першага намесніка Прэм'ер-міністра Васіля Мацюшэўскага з кіраўніком адміністрацыі Ганконга Лян Чжэньінам. Бакі абмяняліся меркаваннямі адносна развіцця супрацоўніцтва ў інвестыцыйнай, фінансавай, гандлёва-эканамічнай і турыстычных галінах.

Па выніках перагавораў падпісана пагадненне аб прадухіленні двайнога падаткаабкладання і папярэджанні ўхілення ад выплаты падаткаў на даходы і маёмасць паміж Беларуссю і Ганконгам. Так, напрыклад, у адпаведнасці з пагадненнем стаўка па дывідэндах і працэнтах складзе 5 працэнтаў, стаўка роялці — ад 3 працэнтаў да 5. На думку спецыялістаў, усё гэта створыць спрыяльныя ўмовы для супрацоўніцтва ў фінансавай сферы паміж Рэспублікай Беларусь і САР Ганконг.

Акрамя таго, дасягнута дамоўленасць аб узаемнай адмене віз, якая ўступіць у сілу пасля завяршэння ўнутрыдзяржаўных працэдур у Беларусі і ў КНР і дасць магчымасць істотна актывізаваць кантакты дзвюх краін на ўзроўні бізнесу і турызму.

Урадавая дэлегацыя прыняла ўдзел у інвестыцыйным форуме Belarus calling Hong Kong, прысвечаным супрацоўніцтву ў сферы інвестыцый, фінансаў і турызму паміж Беларуссю і САР Ганконг. Васіль Мацюшэўскі адзначыў, што інвестфорум даў магчымасць дзелавым колам Ганконга больш даведацца пра Беларусь, у перспектыве знайсці надзейных беларускіх партнёраў.

# Адкрыты фармат вялікай размовы

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў сустрэчу з прадстаўнікамі грамадскасці, беларускіх і замежных СМІ. Мерапрыемства прайшло ў пашыраным фармаце пад агульнай назвай "Вялікая размова з Прэзідэнтам". У ім прынялі ўдзел каля чатырох дзясяткаў журналістаў, якія прадстаўляюць найбольш буйныя дзяржаўныя і недзяржаўныя беларускія СМІ, папулярныя інтэрнэт-парталы, аўтарытэтныя замежныя масмедыя. На сустрэчу былі запрошаны і многія эксперты, сярод якіх вядомыя палітолагі, эканамісты, прадстаўнікі партый, канфесій і грамадскіх аб'яднанняў. Яны таксама прынялі ўдзел у дыялогу па найбольш актуальных тэмах. Прамая трансляцыя сустрэчы Аляксандра Лукашэнкі з прадстаўнікамі грамадскасці і сродкаў масавай інфармацыі вялася па тэлеканалах "Беларусь 1", "Беларусь 24" і Першым Нацыянальным канале Беларускага радыё. Дарэчы, сама сустрэча доўжылася амаль сем з паловай гадзін. Прапануем фрагменты адказаў Прэзідэнта Беларусі на пытанні ўдзельнікаў мерапрыемства.**

## Пра зарплаты і пенсіі

Заработныя платы і пенсіі могуць быць павялічаны толькі тады, калі мы ў рэальным сектары эканомікі вырабім больш, якасна і прададзім па больш высокай цане. Формула, па-мойму, адна. Я тут нічога новага прыдумаць не магу. Так складваецца ўсё жыццё. І будзе складвацца. Ёсць другі шлях: можна ў некага пазычыць, адабраць, узяць — але гэта не наш шлях.

Заработная плата, пенсіі могуць быць павышаны толькі за кошт эфектыўнай работы эканомікі. Больш вырабім — прададзім, атрымаем валюту. Наша эканоміка адкрытая. Прыкладна 50 працэнтаў выробленага мы прадаём за межы краіны. І ў гэтым усё наша жыццё. І за тое, што мы атрымаем, трэба купіць тое, што будзе спрыяць далейшай вытворчасці, узнаўленню, — гэта энерганосьбіты, сыравіна, матэрыялы ды іншае. Тое, чаго ў нас не хапае, але за кошт чаго працуе эканоміка. І гэта ў першую чаргу. Калі мы гэта не купім, то заўтра і гэтай зарплаты не будзе — не будзе з чаго вырабляць. Таму трэба спачатку клапаціцца пра вытворчасць. Ну а там — што заробім, то і атрымаем.

Гэта закон, ад яго нікуды не адыдзеш. Ці можам мы мець 500 долараў у будучыні? І чаму 500? 500, як я мяркую, — сярэдняя зарплата ў краіне — гэта тое, што дзяржава павінна дапамагчы зарабіць чалавеку. Для таго, каб ён хоць крыху мог жыць у той сацыяльна-эканамічнай сістэме, якую мы з вамі стварылі. Усё астатняе не забараняецца — вітаецца. Тысячу, 2 тысячы. Хто колькі заробіць. Мы жывём у рынчачнай эканоміцы. Зарабляем.

## Пра дзяржпадтрымку і льготы

Пара забываць пра гэтыя тэрміны: ільготы, бясплатна, яшчэ нешта. Яшчэ раз падкрэсліваю: мы жывём у рыначнай эканоміцы, тым больш усе хочуць у СГА. Вы ведаеце, як ставяцца ў СГА да льгот? Ільгатаваць будзем толькі тое, што заўтра дасць вынік. Устаньце на месца дзяржавы кожны: у вас ёсць нейкія невялікія грошы, каму вы іх дасце? Проста закапаць у пясок? Ці вы падумаеце, што прынясе гэтая пазыка, якую вы некаму дасце? Гэтак жа і ў дзяржаве.

Таму падтрымліваць трэба тых, каго дзяржава абавязана падтрымліваць. І тых, хто мае патрэбу ў падтрымцы. Шматдзетныя сем'і, да прыкладу. У нас галоўная праблема — дэмаграфічная, у нас не хапае насельніцтва. Нам трэба ў два-тры разы больш насельніцтва, ну хоць бы ў два. Гэта галоўная сіла ў любой дзяржаве. Трэба падтрымліваць шматдзетныя сем'і? Трэба. Праўда, і правяраць трэба, а то некаторыя шматдзетныя сем'і, маючы траіх дзяцей, рукі склалі — і ўсё. Прэзідэнт, маўляў, павінен нас забяспечыць, ён гэта сказаў. А бацькі? Так, дзяржава павінна дапамагчы. І мы дапамагаем. І калі ў нас будзе больш грошай — мы будзем больш дапамагаць.

## Пра шматвектарнасць

Гэта было маё жорсткае патрабаванне — шматвектарнасць палітыкі. Я хутчэй інтуітыўна гэта адчуў. У нас не ўсё атрымалася з гэтай шматвектарнасцю, вы гэта ведаеце. Ляцелі на адным крыле, куды прыляцелі, таксама ведаеце.

Гэта традыцыйныя, згодна з нашым менталітэтам, панацэі. Мы павінны сябраваць з усімі нашымі суседзямі. Нам ні



БЕЛТА

Расія, ні Украіна, ні Польшча, ні Літва, Латвія не чужыя. Таму што гэта нашы суседзі. Кропка. Што датычыцца вектараў — у нас адкрытая эканоміка. Чаго я паехаў у Егіпет, Судан? Лабіраваць сваю прадукцыю паехаў! Іду туды, дзе адкрыты дзверы, дзякуй богу, апошнім часам дзверы адкрылі многія. І ні адна паездка Прэзідэнта стратнай не была.

## Пра беларускую мадэль

Я лічу, што мадэль нашага развіцця, наогул славянскіх народаў — гэта сацыяльна арыентаваная эканоміка. Я не прымаю ў нас іншай мадэлі. І я вельмі ўважліва назіраю за варыянтам Расіі, Украіны і гэтак далей, і малю бога, каб у нас гэтага не адбылося. Любая дзяржава толькі тады нечага вартая, калі яна звернута да людзей. Калі чалавек ад гэтага нічога не мае — навошта яму гэтая дзяржава? Я часта гавару: навошта яму гэтыя балты, гайкі? Навошта? Сацыяльна арыентаваная эканоміка — гэта і эканоміка, і дзяржава для людзей. Так, у нас сёння не лепшыя часы, мяне можна за гэта крытыкаваць, нехта мяне разумее, нехта мяне шкадуе, хтосьці са мной згаджаецца, некаторыя крытыкуюць. Усе яны маюць рацыю. Толькі перш за ўсё трэба паглядзець на сябе, што ты не зрабіў... Мы не адыдзем ад сацыяльна арыентаванай эканомікі — я ў гэтым ключы і дзейнічаю. А як жа, я абяцаў адно, а рабіць іншае буду? Гэта не мая палітыка. Я прыхільнік адкрытай палітыкі, сумленнай палітыкі. Справядлівай. Я часта гавару: у законах усяго не прапішаш. А калі не прапісана — рабі справядліва. І я справядлівасць стаўлю вышэй за любы закон.

Справядлівасць павінна быць пакладзена ў аснову ўсіх чалавечых узаемаадносінаў. І дзяржавы з чалавекам у тым ліку.

## Пра адносіны з Расіяй

З аднаго боку, я не павінен як Прэзідэнт раскрываць якія-небудзь карты. Перагаворы заўсёды праходзяць — нейкая частка адкрыта, а большая частка закрыта, і некаторыя рэчы — такія, пра якія гаварыць нельга. Але сітуацыя штурхае да таго, што я павінен пра гэта і вам, і ўсім людзям сумленна сказаць — зноў жа нікога не крыўдзячы, абсалютна сумленна.

Вы павінны разумець: пакуль я Прэзідэнт, ні адзін камень у бок рускага чалавека, расіяніна кінуты не будзе. Вы павінны гэта ведаць дакладна. Але вы павінны разумець і тое, што ў Расіі розных сіл — мора. Калі я Пуціну пачынаю гаварыць, свайму калегу і свайму сябру — мы сапраўды дружныя! — ён мне прама гаворыць: ты не звяртай увагі...

Там розныя сілы. На жаль, яны сёння розныя і ў кіраўніцтве краіны. І што вельмі дрэнна, некаторыя рэчы разыходзяцца з меркаваннем і рашэннямі самога Прэзідэнта — я пра гэта свайму сябру часта гаварыў. Гэта ўжо нікуды не гадзіцца.

Ведаеце, вось гэтыя абвастрэнні — яны ж не ўпершыню. Расія ж часта “хапалася” за газавую трубу, за нафтавую трубу.

Хоць пасля такіх канфліктаў, хай непублічна, але мне заўсёды гаварылі: так, мы пагарачыліся і гэтак далей. Ну хіба не пагарачыліся? Ну навошта хапацца за жывое? Навошта нас браць за горла? Зразумела, што без расійскай нафты мы абыдземся. Нам будзе вельмі цяжка. Адразу скажуць, гэта нерэнтабельна, неэфектыўна, але свабода, незалеж-

насць — гэта вельмі рэнтабельна і не ацэньваецца ніякімі грашыма і ніякімі лічбамі. Гэта несупастаўна. Калі на адной чашы незалежнасць, а на другой расійская, іранская, азербайджанская ці амерыканская нафта — гэта несупастаўна. Мы ўсё роўна знойдзем выхад. Гэтага ў Расіі, на жаль, не разумеюць...

Я ніколі не нарываюся на непрыемнасці. Я ўжо многае паспрабаваў і апёкся на ўсім, што папала. Дзе трэба, магу адступіць і быць гібкім, але, калі зняважаюць маю дзяржаву і народ, я з гэтым ніколі не змірuся...

## Пра пагранічную зону

У нас (з Расіяй. — Заўв. рэд.) няма агульнай візавай дамоўленасці і адзінай візы. Мы маем права прымаць каго лічым патрэбным у сваю краіну, яны гэта робяць.

Чаму кагосьці насцярожвае, што мы адмянілі візы для грамадзян нейкіх краін? Мы ж сябе пазіцыянуем як цэнтр усёй Еўропы і Еўразійскага кантынента. Дык як жа цэнтр можа быць ізаляваны? Але самае галоўнае заключаецца ў тым, што мы дазволілі прыехаць людзям на 5 дзён без візы праз аэрапорт у Мінску. І якая гэта пагроза нацыянальнай бяспецы Расіі? Усё ж засталося, як раней. Ты прыязджаеш з візай ці без візы, пашпарт пaглядзелі.

Спіс ёсць, якім непажадана знаходжанне ў Беларусі і Расіі, адзіны саюзны спіс. Камп'ютарызавана прабілі — не, дарагі мой, да пабачэння. Ты неўязны. Нічога ж не змянілася ў гэтым плане. Мы маем права прыняць гэтае рашэнне, мы суверэнная, незалежная краіна. Больш за тое, мы ж узгаднілі гэты дакумент.

Мы свята аберагаем нашу агульную прастору. Для нас ніколі расіянін не быў чужым чалавекам і не будзе. Усе гэтыя бяздумныя, нескаардынаваныя крокі толькі пагаршаюць нашы адносіны. Гэтага рабіць нельга.

## Пра адносіны з Захадам

Што датычыцца заходняга вектара, я ўжо гаварыў канцэптуальную рэч. У нас шматвектарная палітыка, гэта наш поспех, што мы ў свой час вызначыліся дзейнічаць такім чынам. Праўда, на практыцы не вельмі атрымалася, але зноў жа не ў гэтым наша віна.

Не мы таму былі віной, калі ўвялі санкцыі. У нас што, ядзерная зброя? У нас што, эканоміка такая, што мы можам сабе дазволіць камусьці дыктаваць? Так, мы прама гаварылі, нам не патрэбныя гэтыя санкцыі. Мы іх не заслужылі, душыць нас не трэба. Ну нарэшце прыйшло ўсведамленне. Знялі гэтыя санкцыі. Дзякуй, добра. У нас у эканоміцы яшчэ нічога не адбылося ў сувязі са зняццем гэтых санкцый. Мы пачалі недзе дамаўляцца.

Нам трэба з вялікімі намаганнямі туды пранікаць, з нашым машынабудаўнічым комплексам, нафтахіміяй, гэта ўсё на Захадзе ёсць. Там будзе складаней. Але хоць бы дадатковы глыток эканоміка павінна атрымаць. Ну а самае галоўнае — гэта фінансаванне. На Захадзе вялікая колькасць грошай, і калі б мы маглі падкрэдытоўвацца там хоць бы пад сярэдні, невялікі працэнт, гэта было б для нас добра.

## Пра ваеннае супрацоўніцтва з Расіяй

Некалі была мая прапанова Пуціну: давай будзем праводзіць вучэнні — вялікія, малыя — праз 2 гады. Адзін год у вас, праз год — у нас. І так па чарзе. Надышоў наш час, і


БЕЛТА

мы прымем гэтыя вучэнні ("Захад-2017". — Заўв. рэд.). Гэта будуць адкрытыя вучэнні, мы запросім усіх, каб бачылі, што мы ні на каго не збіраемся нападаць, у нас такой мэты няма. Гавораць — ваенная база. Ды кіньце вы, каму патрэбныя гэтыя 10 самалётаў, якія Расія хацела пасадзіць у Бабруйску.

Што дае гэтая база? Што такое ў сучаснай вайне супраць НАТА, дапусцім, самалёт? 10 хвілін бою, ён узляцеў — і яго няма. Вайна сёння іншая, гэта ў Сірыі можна лятаць, калі няма сістэмы супрацьпаветранай абароны. У нас у Беларусі ты ўзляцеў дзесьці за 200 кіламетраў — мы цябе бачым, і твае ўжо дні злічаны. І потым, што такое аэрадром на пярэднім краі тэатра ваенных дзеянняў? Не дай бог вайна — дзве ракеты на ўзлётна-пасадачнай паласе, — ні адзін самалёт не ўзляціць. Навошта іх сюды?

Калі нехта думае: вось Расія сюды "свае войскі ўводзіць", некалькі тысяч ужо вагонаў загрузілі і нас акупуюць. Слухайце, ну не будзьце вы наіўнымі. Расія на чыгуначныя саставы пагрузіла тэхніку і "акупуе" Беларусь... Як жа можна ваяваць на чыгуначных платформах?

На маючых адбыцца вучэннях войскі высадзяць дзесьці каля палігона, разаб'юць лагер, завязуць пэўную колькасць боепрыпасаў, каб адстраляць па мішэнях. Яны разам з намі. Лагер наш, лагер іх. Гэта ўсё пад кантролем. Расія ніколі не акупуе Беларусь. А вучэнні мы правядзём. Абарона нашай агульнай Айчыны — святая справа.

## Пра атамную станцыю

І МАГАТЭ, і ўсе краіны пра гэта заяўляюць: "Ну як, гэта ж мірны атам. Усе будуюць атамныя станцыі. Чаму раптам у Беларусі не можа быць атамнай станцыі?" Больш за тое, гэта ж не слабенькая дзяржава будуе атамную станцыю. Не мы з вамі. Гэта будуе Расія, ядзерная краіна. І яна яе пабудуе. Таму што яны ў гэтым таксама вельмі зацікаўленыя, каб паказаць новае пакаленне атамных станцый — самых бяспечных. Самая танная будзе атамная станцыя. Я гавару: дык гэта ж добра. Менш крэдытаў трэба будзе даваць. Сямашка (У.І. Сямашка — намеснік Прэм'ер-міністра. — Заўв. рэд.) кантралюе там кожны болт і гайку. Здарылася з корпусам рэактара — адразу ж гавару: Уладзімір Ільіч, ніякіх размоў. У нас чарнобыльская краіна, вельмі балюча ўспрымаюць, замяніце гэты корпус. Прывезлі новы, замянілі. І мы пабудуем гэтую станцыю.



Я літоўцам гавару: чаго вы "ваюеце" супраць нас? Мы ж не крычым, што ў вас небяспечная Ігналінская станцыя, якую вы закрываеце. Не дай бог што здарыцца. Гэта ж горшая станцыя ў свеце. Мы вас разумеем, не крычым дарма. Ну а потым давайце дамовімся. Гэта будзе наша агульная станцыя. Аж да таго, што прымаем усіх вашых людзей, якія здольныя працаваць на нашай станцыі. Нам патрэбныя моцныя спецыялісты, якія маюць досвед работы. І самае галоўнае — давайце вырабім электраэнергію на ёй. У вас жа дэфіцыт, мы вам прададзім па нармальных цэнах. Глядзяць, разумеюць, згаджаюцца. А потым у сродках масавай інфармацыі на публіцы пачынаюць палітызаваць гэтае пытанне. Гэта палітыка. Яе трэба проста адкінуць і забыць. Эканоміка сваю справу зробіць. Калі з'явіцца танная электраэнергія, тады мы з імі дамовімся, а станцыю мы пабудуем. Гэта — найвышэйшыя тэхналогіі.

## Пра бежанцаў

У СМІ прагучала: мы, маўляў, ствараем лагеры для бежанцаў, 7 мільёнаў еўра Еўрасаюз выдзеліў. А якія гэта лагеры мы ствараем і дзе? Мы хочам пабудаваць ізалятары часовага ўтрымання на граніцы, каб затрыманыя нелегалы ў чалавечых хоць умовах знаходзіліся, пакуль мы вырашым, што з імі рабіць. І ніякіх лагераў па прыёме бежанцаў мы ніколі не будавалі і будаваць не будзем.

## Пра нацыянальную ідэю

Патрэбна такая ідэя — дакладная, коратка сфармуляваная, каб яна захапіла ўсіх. Я ўсё больш пераконваюся: напэўна, мы не прыйшлі ў сваім развіцці да той кропкі, калі б гэтая ідэя ўдарыла ўсім па розуме і па сэрцы. Я супакоіўся, думаю, ну раз грамадства нічога прапанаваць не можа — я таксама не магу прыдумаць, нават баюся нешта гаварыць, таму што гэта вельмі адказна. Вось так усё адбываецца, што мы жывём і без гэтай "ідэі". А хацелася б. Але яе пакуль няма. І я абсалютна пераканаyы: выдумаць яе немагчыма. Нас да гэтага павінна падвесці само жыццё, само развіццё нашай краіны. Вельмі мала, напэўна, мы пражылі як абсалютна суверэнная, незалежная дзяржава, нават Расія не ў стане яе сёння сфармуляваць. Тут трэба быць вельмі дакладнымі, акуратнымі. І каб гэта захапіла ўсіх.

Але фармуляваць яе трэба, таму што гэты рух наперад, пасланне ўсім пакаленням — вось наша будучыня.

## Пра мову

Я вельмі акуратна стаўлюся да гэтага пытання. І дзякуй богу, што ні руская, ні беларуская, ні іншыя мовы ў нас у грамадстве не сталі нейкай перашкодай. Пакуль я Прэзідэнт, я не дапушчу таго, каб мы адзін аднаго "дубасілі" па моўнай праблеме і дзялілі людзей па тым, "ведаеш ты беларускую мову ці ты яе не ведаеш".

Што датычыцца нацыянальнага ўніверсітэта. Адразу ж узнікае пытанне: ну а Беларускі дзяржуніверсітэт у нас не нацыянальны? Яны ўсе нашы нацыянальныя. Там вывучаюць і рускую, і беларускую мову, і англійскую, і іншыя. Гаворка ідзе пра ўніверсітэт ці вышэйшую навучальную ўстанову, дзе было б выкладанне на беларускай мове, так? Я не магу сказаць "не" і не магу сказаць "так".

Трэба прапрацаваць гэтае пытанне. Гэта было б нават ня дрэнна. Толькі я супраць таго, каб некаторыя людзі выхваляліся беларускай мовай. "Вось я беларускую мову ведаю, я больш беларускі".

І яшчэ. Я вас заклінаю і прашу: не адмаўляйцеся ад рускай мовы. Таму што вы адмовіцеся ад свайго роднага. Руская мова — гэта вялікае і гэта наша.

## Пра смяротную кару

Я не крыважэрны. Калі расстрэльныя справы мне на стол кладуцца, я падпісваю кожны ўказ па смяротнай кары, вы не ўяўляеце, што са мной адбываецца. Я апошнім (гэта не толькі ў нашай краіне, у многіх краінах) стаўлю гэты подпіс. Я разумею, што пасля гэтага чалавека ўжо не будзе.

І мне нясуць папку, фатаграфіі, аператыўныя матэрыялы, фільмы ды іншае. Я калі гэта бачу, у мяне кроў стыне ў жылах. Разумееце, калі чалавека падонак рассякае на кавалкі ці топіць жанчыну ў ванне, потым на кавалкі рассякае, некуды вывозіць, хавае. Гэта ж нават не звер. Гэта горш. Гавораць: "Ніхто не мае права. Бог даў жыццё, бог павінен забраць". А яму хто даў права забраць чужое жыццё, і не адно?

Гэта проста чалавечае тое, што праз мяне праходзіць.

А цяпер — палітыка. Не спяшайцеся, хутка Еўропа да гэтага прыйдзе. А наогул, я часта ім гавару: слухайце, давайце пачнём з Амерыкі. Вы іх прымусьце адмяніць смяротную кару. І іншых, у каго вы грошы вялікія бераце, з кім вы абдымаецеся. Давайце з іх пачнём. А не... Вось яны, двайныя стандарты. І потым, што мяне стрымлівае. Я не маю права адмяніць ці накласці мараторый на смяротную кару. У нас рэферэндум прайшоў. Калі б гэтага рэферэндуму не было, я б неяк думаў. І тым не менш, калі ад мяне пачынаюць гэта патрабаваць, я гавару: добра, давайце будзем пераконваць грамадства. Давайце гэтую дыскусію разгорнем у Парламенце, у партыях, грамадскіх арганізацыях. І калі мы ў грамадства потым спытаем, сумленна яму расказаўшы ўсе "за" і "супраць", і людзі прагаласуюць большасцю супраць смяротнай кары, я ў гэты ж дзень падпішу вынікі гэтага рэферэндуму.

## Пра беларускую мару

Я быў бы рад, калі б у беларуса заўсёды ў кішэні былі грошы, каб ён мог задаволіць свае патрэбы. Што датычыцца дзяржавы, я вельмі хацеў бы, каб мая дзяржава, мая краіна, у якой я першы Прэзідэнт, была ціхай, спакойнай і вельмі зручнай для жыцця людзей. Каб камфортна вам было ў ёй жыць, каб, ад'язджаючы куды-небудзь, на другія суткі вельмі хацелася дадому.

Я хачу, каб кожнага беларуса, усіх, хто пабываў у нас, цягнула сюды. Калі ваша душа будзе тут, у Беларусі, значыць, я нездарма пражыў сваё прэзідэнцтва.

*Пачатак года адзначыўся знешняй актыўнасцю Беларусі на паўднёвым і паўднёва-ўсходнім напрамку. Аляксандр Лукашэнка ажыццявіў адразу два візіты — у Егіпет і Судан. Гэтыя абедзве падзеі вельмі сімптаматычныя. Яны сведчаць на карысць таго, што прынцып знешнепалітычнай шматвектарнасці выконваецца, мае традыцыю. Прыносіць выгаду, у тым ліку эканамічную.*

# Змены на паўднёвым напрамку

## Беларусь і Егіпет дамовіліся падтрымліваць адзін аднаго ў рэгіянальных эканамічных аб'яднаннях, членамі якіх з'яўляюцца

Афіцыйны візіт Прэзідэнта Беларусі ў Егіпет пачынаўся ў нядзелю. Для арабскай рэспублікі гэта першы працоўны дзень тыдня, а таму з самай раніцы нас літаральна аглушыла нязвыклая мітусня і бойкае шумнае жыццё 20-мільённага мегаполіса з яго бясконцымі аўтамабільнымі пробкамі і эмацыйнымі мясцовымі жыхарамі. Зрэшты, пры ўсёй сваёй эмацыйнасці егіпцяне на дзіва добразычлівы, адкрыты і шчыры народ. Гэта — першае, што кідаецца ў вочы прыезджаму. Вось і зносіны Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Егіпта Абдэль Фатаха аль-Сісі праходзілі ў вельмі душэўнай і камфортнай абстаноўцы. Мяркую, такая даверная атмасфера перагавораў на вышэйшым узроўні наклала адбітак і на выніку беларуска-егіпецкага бізнес-форуму.

Самай яркай і прыкметнай падзеяй форуму стала маштабная выстава беларускай тэхнікі. Новенькім энерганасычаным трактарам і МАЗам не прыйшлося доўга чакаць сваіх пакупнікоў. Кантракты падпісвалі прама тут жа, што называецца, не адыходзячы ад касы. Генеральны дырэктар МТЗ Фёдар Дамаценка выглядаў цалкам задаволеным і, напэўна, нават шчаслівым. Сваю праграму-мінімум ён выканаў, адкрыўшы напярэдадні візіту ў Александрыі мадэрнізаваную вытворчасць трактароў: цяпер з канвеера штогод будуць сыходзіць да дзвюх тысяч (а з часам у два разы больш) беларускіх трактароў, і не толькі для мясцовых фермераў.

Гендырэктар МАЗа Дзмітрый Кацярыніч ахвотна расказваў пра планы па адкрыцці да канца года дзвюх зборачных вытворчасцяў у краіне пірамід. Не скупіўся на эпітэты і старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір Улаховіч:

— З егіпецкага боку да нас праявілі цікавасць каля 400 кампаній. Самае галоўнае, што мы сур'ёзна і надоўга заходзім у машынабудаўнічы сектар. Егіпет для




БЕЛТА

Аляксандр Лукашэнка і Абдэль Фатах аль-Сісі падчас наведвання выставы беларускай тэхнікі

нас — гэта вароты ў Афрыку і выдатная пляцоўка для прасоўвання нашых тавараў на ўсім кантыненце. Каір жа зацікаўлены ў хутчэйшым далучэнні да зоны свабоднага гандлю з ЕАЭС.

Раней Прэзідэнт паставіў задачу трэць усяго беларускага экспарту накіраваць на краіны так званай далёкай дугі. У гэтым плане Афрыка дагэтуль заставалася не тое каб па-за полем зроку, але асаблівых прарываў на гэтым напрамку не назіралася. Але ж магчымасці ёсць. Мне, напрыклад, больш за ўсё не хапала ў Каіры чыстай пітной вады. У Егіпце, асабліва ў гарачую пару, гэта сапраўдная раскоша. Чаму б не наладзіць экспарт таго, чым прырода адарыла нас у вялікай колькасці?

Паніжэнне эканамічнай актыўнасці часткова можна растлумачыць чарадой рэвалюцый і пераваротаў, якія ахапілі рэгіён пасля “арабскай вясны”. Цяпер Егіпет паступова прыходзіць у сябе ад наступстваў палітычных бур. Краіну ўзначаліў моцны і рашучы лідар (аль-Сісі зрабіў бліскучую ваенную кар’еру, даслужыўся да фельдмаршала), які імкнецца дыверсіфікаваць знешнюю палітыку з апорай на правераных і надзейных сяброў. У ліку такіх Каір бачыць і нашу краіну. Аляксандр Лукашэнка параіў бізнесу быць больш актыўным:

— Бізнесмены павінны рэгулярна мець зносіны, а палітыкі ствараць для гэтага ўмовы. Егіпту пашанцавала з Прэзідэнтам. Гэта моцны, мужны чалавек. Ён забяспечыў галоўнае — мір і стабільнасць у краіне. Цяпер слова за бізнесам. Мы заўсёды былі канкрэтнымі і абавязковымі людзьмі, і калі дамовіліся, ніколі вас не падвядзём.

Стварэнне сумесных зборачных вытворчасцяў — толькі адно звяно ў гэтым ланцугу. У Егіпце распрацавалі цэлую нацыянальную праграму па распрацоўцы новых радовішчаў граніту, мармуру, золата, волава, вапняку ды іншых карысных выкапняў. Тэхніка БелАЗа тут прыйдзецца ў самы раз, як і нашы геолагаразведачныя тэхналогіі. Прывабным для нашых спецыялістаў стане праект па свідраванні глыбакаводных свідравін у Егіпце.

Яшчэ адна праблема густанаселенай дзяржавы асабліва прыкметная, калі праязджаеш па некаторых каірскіх вуліцах. Егіпет перапрацоўвае ўсяго толькі 4 працэнты з 25 мільёнаў тон смеццевых адходаў. Беларускія тэхналогіі і тут акажуцца нялішнімі.

Ёсць напрацоўкі і планы па ўзаемадзеянні ў сельскай гаспадарцы, ваенна-прамысловай сферы, навуцы і фармацэўтыцы. Усё гэта вылілася ў падпісанне канкрэтных дагавораў, пагадненняў і кантрактаў на дзясяткі мільёнаў долараў. Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на адзін прынцыповы момант:

— Важна, што мы не толькі прадаём беларускую тэхніку, але і гатовыя прыходзіць сюды са сваімі тэхналогіямі і спецыялістамі, ствараць тут узорнапаказальныя прадпрыемствы, паказваць, як мы можам працаваць, і вучыць егіпцян выраблядь гэтую прадукцыю.

У бліжэйшы час урады дзвюх краін распрацуюць дакладны пакрокавы план дзеянняў на перспектыву, пасля чаго ў Мінску з візітам у адказ чакаюць Прэзідэнта Егіпта для пашырэння новых праектаў.

Пасля завяршэння візіту ў Егіпет самалёт Прэзідэнта ўзяў курс на Хартум.


БЕЛТА

Аляксандр Лукашэнка выступае ў парламенце Судана

# Дзелавая прыцягальнасць рынку

## Судан стаў для Беларусі адным з найважнейшых партнёраў на Афрыканскім кантыненце

У Хартуме прайшлі асноўныя мерапрыемствы афіцыйнага візіту Прэзідэнта ў Судан. Аляксандр Лукашэнка правёў перагаворы з Прэзідэнтам Амарам аль-Баширам, сустрэўся ў Нацыянальнай асамблеі з дэпутатамі верхняй і ніжняй палат парламента. Імкненне двух краін да актыўнага развіцця ўзаемадзеяння замацавана сумеснай заявай кіраўнікоў дзяржаў. Прэзідэнты таксама падпісалі дагавор аб дружбе і супрацоўніцтве нашых краін. Агульнае ўражанне: Судан дзелавіты, дружалюбны і адкрыты да канструктыўнага дыялогу на любыя тэмы. І гэтая выснова ў добрым сэнсе перавысіла спадзяванні.

Рыхтуючыся да камандзіроўкі, я вывучаў інфармацыю пра Судан у інтэрнэце. Цяпер, убачыўшы краіну, магу з поўнай упэўненасцю сцвярджаць: свет яе ведае мала. Да ўсяго, што пішацца ў сетцы, трэба адносіцца з добрай доляй скептыцызму. Як правіла, паведамляецца, што тут няпростая ўнутрыпалітычная сітуацыя, мясцовыя жыхары насцярожана ставяцца да чужынцаў, фанатычна ахоўваюць традыцыі і жорстка спаганяюць за іх парушэнне, у тым ліку з заезджых замежнікаў.

Рэальны Судан аказаўся іншым. Прыветлівыя і дружалюбныя прахожыя гатовыя з радасцю паціснуць руку любому сустрэчнаму. Яны ахвотна адгукаюцца на просьбу разам сфатаграфавацца. Не разбалаваныя турыстамі гандляры сувенірамі, знарок гандлюючыся, ідуць на двайныя-трайныя зніжкі. Заадно цікавяцца жыццём у Беларусі і не забываюць сказаць, што Лукашэнка — гут.

Беларускія сцягі і плакаты з партрэтамі прэзідэнтаў двух краін у гэтыя дні на вуліцах Хартума сустракаеш часта. Не разумею мясцовага дыялекту, але па ТБ-карцінцы мясцовых каналаў бачу, што візіту беларускага кіраўніка тут надаюць вялікае значэнне. Так што суданцы добра паінфармаваны пра галоўную палітычную падзею цяперашняга моманту. І шчыра ёй радуюцца. На што ёсць цалкам зразумелыя, чыста чалавечыя прычыны.

Судан стаміўся жыць пад санкцыямі, якія, на шчасце, ужо памякчаны і вось-вось павінны быць адменены цал-



ВАДЗІМ КАНДРАШОЎ

кам. У выніку абставінаў гэта зусім не заможная краіна. Але і далёка не бедная. А калі разважаць пра перспектывы, то пры граматным падыходзе да існуючых рэсурсаў у Хартума ёсць усе шанцы стаць адным з цэнтраў росту Афрыканскага кантынента. Нетры багатыя на карысныя выкапні, даволі шчодрая, арашаемая Нілам зямля дае багатыя ўраджаі, прырост насельніцтва каля мільёна чалавек у год. Гэта магутныя стартавыя пазіцыі, з якіх Судан усё актыўней шукае новых партнёраў у свеце.

Судан стаміўся ад прадузятых адносінаў да сябе. Ён хоча сябраваць. І калі бачыць шчырыя сустрэчныя памкненні, ахвотна гатовы на іх адгукнуцца.

Інфармацыю пра эканамічныя вынікі візіту ўжо разнеслі па свеце інфармагенцтвы. Таму спынюся на іх толькі тэзісна. Мінск і Хартум абазначылі ўзаемную цікавасць да стварэння ў Судане сумесных вытворчасцяў беларускай сельгастэхнікі. Успрымальны мясцовы рынак да нашых кар'ерных самазвалаў, прадукцыі МАЗа, "Белшыны", харчовых тавараў, угнаенняў. Нафтагазаваму сектару цікавыя напрацоўкі беларускіх спецыялістаў у геолагаразведцы і свідраванні. Сельскай гаспадарцы — нашы тэхналогіі павышэння эфектыўнасці вытворчасці... Усяго, мабыць, і не пералічыш. За адзін толькі дзень работы беларуска-суданскага бізнес-форуму, які праходзіў паралельна палітычным мерапрыемствам візіту на вышэйшым узроўні, заключана кантрактаў на 50 мільёнаў долараў.

Аднак першыя сумесныя поспехі — гэта тактычны момант. Яшчэ больш важныя стратэгічныя задумы і сам дух усталяванага дыялогу. Амар Аль-Башыр з натхненнем адгукаўся на прапанову Аляксандра Лукашэнкі не зацягваць з напаўненнем дамоўленасцяў канкрэтнымі праектамі. Мінск запрашае ў бліжэйшы час прадстаўнікоў урада, суданскага бізнесу наведаць нашу краіну і разам з беларускімі калегамі вызначыць па тры-пяць напрамкаў, якія лягуць у аснову "дарожнай карты" развіцця супрацоўніцтва. Прэзідэнт Беларусі гарантуе:

— Мы заўсёды былі абавязковымі людзьмі. Калі мы дамовімся, чаго б нам ні каштавала, мы вельмі хутка і аператыўна рэалізуем гэтыя дамоўленасці. І калі суданскія спецыялісты, члены ўрада будуць дзейнічаць хутка, мы ўжо на працягу бліжэйшых двух-трох гадоў створым такія вытворчасці, якія будуць працаваць у Судане дзесяцігоддзямі...

Гэта што датычыцца дзелавога вымярэння. А дух дыялогу вельмі ярка выявіўся падчас зносінаў Прэзідэнта з суданскімі парламентарыямі. Асабіста мяне тут вельмі ўразілі два моманты. Першае. У амфітэатры Нацыянальнай асамблеі не менш як палову, а то і большую частку месцаў займалі жанчыны. Хто пасля гэтага будзе гаварыць пра суровыя, незразумелыя еўрапейцам норавы і традыцыі? Другое. Слухачы перарывалі апладысментамі прамову Прэзідэнта раз дваццаць, тонка ўлоўліваючы сутнасць, нягледзячы на сінхронны пераклад з рускай на арабскую мову. Што ні тэзіс, то сапраўды кладзецца на душу.

Калі Прэзідэнт гаварыў пра зборачныя вытворчасці, то абавязкова з такім разлікам, каб працавалі на іх суданскія спецыялісты. А іх навучанне беларускі бок забяспечыць. У выніку гэта будуць мясцовыя заводы, якія працуюць і на эканоміку краіны, і на занятасць насельніцтва. Закранулі тэмы дэфіцыту пітной вады. Ці варта тут захапляцца праджэктамі паставак гэтага рэсурсу? З улікам транспартнага пляча вада можа аказацца на вагу золата. Прэзідэнт прапаноўвае падзяліцца тэхналогіямі бурэння артэзіянскіх свідравін. Або вось такі момант дыялогу, які запомніўся. Аляксандр Лукашэнка прызнаўся: са здзіўленнем даведаўся, што ў аграсектары Судана налічваецца 130 мільёнаў буйной, сярэдняй і дробнай рагатай жывёлы.

— А колькі вы перапрацоўваеце мяса? — спытаў ён.

— Зіроу (нуль), — выгукнуў нехта з залы пасля некаторай паўзы.

— Дык чаму б нам разам не пабудаваць мясаперапрацоўчы камбінат, каб прадаваць гатовую прадукцыю? У тым ліку і ў суседнія краіны. І калі вы вырашыце, што вам гэта падыходзіць, будзем распаўсюджваць гэты досвед на ўсю краіну.

Тым цікавы і важны для Хартума дыялог з Мінскам, што ён мае прыкладны характар. Мы не робім шматслоўных заяў, а гаворым пра канкрэтныя намеры, якія пры сустрэчнай волі могуць стаць рэалізуемымі планамі. Мінск запрашае Хартум да раўнапраўнага і ўзаемавыгаднага партнёрства. Менавіта гэта і цэніцца перш за ўсё.

# Дакладны кірунак вызначае будучыню

**З сімвалічнай падзеі пачынаецца Год навукі, які аб'яўлены ў 2017-м. Прэзідэнт уручыў дыпломы і атэстаты новым дактарам навук і прафесарам. Мерапрыемства традыцыйнае, але ўсё ж гэтым разам яно напоўнена асаблівым сэнсам.**

На працягу года сфера разумовай працы будзе ў полі асабліва пільнай увагі. У нашы дні, калі новыя тэхналогіі старэюць гэтак жа імкліва, як і з'яўляюцца, быць у авангардзе інавацыйнага працэсу без перабольшання — жыццёва важная неабходнасць. Звяртаючыся да навукоўцаў, Прэзідэнт сказаў:

— Менавіта з перадавымі распрацоўкамі непасрэдна звязаны рост нашага дабрабыту ды інтэлектуальнае развіццё нацыі. Яны вызначаюць у канчатковым выніку ўзровень эканамічнай канкурэнтаздольнасці дзяржавы на міжнароднай арэне. Больш за тое, гарантуюць яе палітычную вагу ў свеце.

Дыялог Прэзідэнта з дактарамі і прафесарамі стаў своеасаблівым прологам да больш шырокага абмеркавання стану і перспектыў беларускай навукі. Такую размову плануецца правесці ў бліжэйшы час з запрашэннем вялікай колькасці ўдзельнікаў. Але асноўныя моманты, вакол якіх разгорнецца дыскусія, у цэлым абазначаны.

У навуковай дзейнасці мы дабіліся многага. Атамная энергетыка, космас, біятэхналогіі... За апошнія гады ў структуры нашай эканомікі з нуля з'явіліся цэлыя інавацыйныя галіны. Зрэшты, не зусім з нуля. Наша перавага ў тым, што мы не разбурылі навуковыя школы, якія дасталіся ў спадчыну з савецкіх часоў, развілі іх. Сёння навука ў Беларусі пастаўлена на службу рэальным патрэбам краіны. Перспектыўныя распрацоўкі даволі хутка ўкараняюцца ў практыку і даюць рэальную камерцыйную аддачу.

Тлумачачы важнасць інавацыйнага развіцця, Прэзідэнт прывёў прыклад сваіх нядаўніх візітаў у Егіпет і Судан. Нехта яшчэ, можа, задаецца пытаннем: навошта ехаць за край свету? А сутнасць у тым, што ў свеце немалая колькасць краін, у якіх у тэхналагічным плане няма і паловы таго, што маем мы. Рэсурсы — каласальныя. А ведаў і ўменняў, як імі рацыянальна распарадзіцца, не хапае. Тут падумалася, што ў Афрыцы яшчэ адбіваецца і не такое ўжо даўняе каланіяльнае мінулае. Калі краіны-гаспадары проста выцягвалі з падкантрольных земляў матэрыяльныя каштоўнасці, не клапоцячыся пра інтэлектуальнае развіццё народаў, якія жывуць там. Таму сёння, калі мы гаворым пра свабоду да раўнапраўнага і ўзаемна карыснага партнёрства, нас там сапраўды чакаюць.



Удзельнікі сустрэчы з Прэзідэнтам

Аляксандр Лукашэнка:

***— Нам незалежнасць вельмі танна дасталася: усе народы ваявалі, сёння ваюе наша брацкая Украіна. Нам нельга дапусціць таго, каб ваяваць. Мы народ міралюбівы. Напэўна, Бог перад намі паставіў гэтыя цяжкія задачы, каб мы адчувалі, што такое незалежнасць. Пераадолець усё гэта мы можам, толькі аб'яднаўшыся. І, дзякуй Богу, галоўны напрамак нашай барацьбы за незалежнасць праходзіць праз эканоміку — не ў ваеннай сферы, не ў палітычнай.***

Кажучы прасцей, ёсць яшчэ няма-ла месцаў, дзе мы можам прадаць свае веды. Але трэба пастаянна трымаць у галаве галоўнае, звяртае ўвагу Прэзідэнт. Тыя тэхналогіі, якія карыстаюцца попытам сёння, ужо заўтра могуць аказацца нікому не патрэбнымі як маральна састарэлыя. Таму асноўная задача навукі — пастаянна рухацца наперад.

Праз навуковы падыход ляжыць шлях і да дасягнення важных тактычных арыенціраў. Будуць інавацыі працаваць на павышэнне эфектыўнасці эканомікі, прадукцыйнасці працы, адпаведна пацягнуцца ўверх і даходы насельніцтва. Прэзідэнт нагадаў пра мэту:

— У нас няма такой катастрофы, калі нельга зарабіць. Зарабіць можна. Але тым не менш нам трэба павышаць жыццёвы ўзровень. Сярэдняя зарплата ў 500 долараў — гэта не завоблачная лічба. Папярэдне мне далажылі, што мы ўжо ў снежні мінулага года мелі пад 417 долараў сярэднюю зарплату па краіне. Засталося зусім крыху, каб дасягнуць 500.

Камусьці можа здацца не так ужо і шмат. Але з улікам бясплатных інстытутаў сацыяльнага забеспячэння лічба бачыцца інакш. Можна атрымліваць і ўдвая больш, але адразу траціць на навучанне дзяцей, медыцынскае абслугоўванне, поўную аплату паслуг ЖКГ. І не факт, што пасля гэтага нешта застанецца...

Хоць размова з навукоўцамі і адбылася напярэдадні свята, Прэзідэнт, віншуючы іх, завяршыў мерапрыемства па-дзелавому. Абяцаў са свайго боку "сур'ёзны націск", паколькі краіне патрэбна "эфектыўная навука для вытворчасці".

Дзмітрый **Крат**

# Тут вучаць вучоных

**Сёлета будзе адчувацца асаблівая ўвага да навуковых дасягненняў, той вялікай ролі, якая ўскладаецца на навуковую супольнасць. Але будзе, безумоўна, весціся размова і пра важнейшыя складнікі паспяховай дзейнасці вучоных. Менавіта ў гэтым кантэксце была пабудавана і наша размова з рэктарам Інстытута падрыхтоўкі навуковых кадраў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктарам фізіка-матэматычных навук, прафесарам Ігарам Ганчаронкам.**

*— Відавочна, што Год навукі стане ўвасабленнем актыўнай публічнасці навуковай супольнасці. Мяркую, што недахопу інфармацыі пра тыя ці іншыя аспекты дзейнасці навукоўцаў мы наўрад ці адчуем. Давайце пагаворым пра тое, што больш блізкае вашаму інстытуту: пра падрыхтоўку навуковых кадраў. Як пабудавана гэтая работа? Якія яе мэты і задачы?*

— У снежні 2001 года ў складзе Нацыянальнай акадэміі навук быў створаны Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў НАН Беларусі, асноўнымі мэтамі дзейнасці якога былі вызначаны інтэграцыя вышэйшай адукацыі і навукі, умацаванне сувязі вышэйшай школы з акадэмічнымі навукова-даследчымі ўстановамі, падрыхтоўка кадраў для навуковых арганізацый НАН Беларусі. За пятнаццаць гадоў Інстытут стаў унікальнай нацыянальнай установай вышэйшай адукацыі, якая захоўвае і прымнажае айчынны і замежны досвед у сферы падрыхтоўкі навуковых кадраў.

Мы пазіцыянуем нашу ВНУ ў якасці вядучага нацыянальнага і еўрапейскага навукова-адукацыйнага цэнтра, арыентаванага на забеспячэнне поўнага цыкла падрыхтоўкі работнікаў вышэйшай навуковай





ПАВЕЛ ЧУЙКО

кваліфікацыі ў адпаведнасці з патрэбамі эканомікі высокіх тэхналагічных укладаў. Інстытут таксама забяспечвае функцыі дадатковай адукацыі для фарміравання інавацыйнай успрымальнасці і адказнай грамадзянскай пазіцыі ў кіраўнікоў навуковых і адукацыйных устаноў.

***— У чым спецыфіка работы інстытута? Уяўленне, напрыклад, пра вышэйшыя навучальныя ўстановы больш зразумелае: там вучацца студэнты. Але падрыхтоўка навуковых кадраў — гэта ўсё-такі нешта іншае. Хацелася б даведацца пра яе складнікі.***

— Сёння Нацыянальная акадэмія навук пераўтвараецца ў буйную навукова-вытворчую карпарацыю. У краіне ідзе актыўнае фарміраванне новых галін, якія будуць вызначаць эканоміку будучыні. Гэта ключавыя моманты, адзначаныя Старшынёй Прэзідыума НАН акадэмікам Уладзімірам Рыгоравічам Гусаковым на V Усебеларускім народным сходзе. У гэтым кантэксце разглядаецца і канцэпцыя развіцця нашага Інстытута, якая ўключае эфектыўнае ўзаемадзеянне з навуковымі арганізацыямі, навукова-практычнымі цэнтрамі і грамадскімі арганізацыямі, ВНУ ды іншымі ўстановамі адукацыі, міністэрствамі і ведамствамі, нацэлена на сацыяльна-эканамічныя і культурныя пераўтварэнні ў нашай краіне. Сёння мы абавязаны ўлічваць высокую апераджальную якасць паслуг, уключаючы экспарт, шырокае публічнае распаўсюджванне вынікаў сваёй дзейнасці, кіраванне кадравым развіццём на аснове інвестыцый і матывацыі персаналу. Вось чаму ў ліку нашых прыярытэтаў — інтэнсіўнае фарміраванне інфраструктуры, інфармацыйная адкрытасць і празрыстасць; эфектыўная іміджавая дзейнасць; актыўная работа са школьнікамі, школьнымі педагогамі, рэгіянальнымі інстытутамі для забеспячэння доступу да элітнай адукацыі і навуковых даследаванняў таленавітай моладзі з усіх раёнаў рэспублікі. На адно з вядучых месцаў у сваёй рабоце мы ставім супрацоўніцтва з міжнароднымі навукова-адукацыйнымі арганізацыямі і асацыяцыямі.

У якасці прататыпа мадэлі развіцця нашай ВНУ можа разглядацца Еўрапейскі інстытут інавацый і тэхналогій (European Institute of Innovation and Technology), дзейнасць якога накіравана на садзейнічанне ўстойліваму эканамічнаму росту і канкурэнтаздольнасці аб'яднанай Еўропы праз інтэграцыю найбольш перспектыўных напрамкаў інавацыйнай, навукова-даследчай і адукацыйнай дзейнасці. Падкрэслю, што ЕІІТ прапагандуецца як новая мадэль узаемадзеяння і сінергіі навукі, адукацыі і бізнесу і папулярызуецца як сімвал фарміравання адзінай навуковай агульнаеўрапейскай прасторы і каталізатар развіцця навукова-адукацыйных ды інавацыйных цэнтраў у ЕС. Мы актыўна вывучаем і іншыя міжнародныя мадэлі, уключаючы Карэйскі інстытут навукі і тэхналогіі (Korean Advanced Institute of Science and Technology), Інстытут падрыхтоўкі навуковых кадраў Кітайскай акадэміі грамадскіх навук (Graduate School of the Chinese Academy of Social Sciences), Масачусецкі тэхналагічны інстытут ды іншыя. Лепшы замежны досвед дбайна аналізуецца і акумулюецца ў нашым Інстытуце.

***— Пагадзіцеся, лозунг пра тое, што кадры вырашаюць усё або, ва ўсякім разе, вельмі многае, па-ранейшаму актуальны. Да навуковага асяроддзя гэта мае непасрэднае дачыненне. Цікава, які статус у тых, хто заканчвае ваш інстытут? Што дае атрыманая ў ім адукацыя?***

— Нашы выпускнікі — магістры навук. А сучасная магістратура — гэта ўнікальная магчымасць фарміравання і развіцця навуковых школ. Інстытут забяспечвае падрыхтоўку магістрантаў па наступных спецыяльнасцях: біялогія, мастацтвазнаўства, машынабудаванне і машыназнаўства, прыкладная матэматыка і інфарматыка, сацыялогія, фізіка, хімія, эканоміка і кіраванне народнай гаспадаркай. Гэты спіс бесперапынна пашыраецца, будуць з'яўляцца новыя праграмы, перш за ўсё запатрабаваныя інавацыйнай эканомікай краіны. Прыцягненне да навучальнага працэ-






су вядучых замежных спецыялістаў, падрыхтоўка кадраў для замежных дзяржаў актуалізуе арганізацыю навучальнага працэсу і падрыхтоўку навучальных выданняў на англійскай мове. Праграма навучання ўключае ў сябе агульнаадукацыйныя дысцыпліны, такія як "філасофія і метадалогія навукі", "замежная мова", "асновы інфармацыйных тэхналогій" са здачай кандыдацкіх экзаменаў і кандыдацкага дыферэнцыраванага заліку. Магістранты вывучаюць спецыяльныя прадметы, праходзяць практыку, актыўна займаюцца навукова-даследчай працай. У ліку выкладчыкаў і навуковых кіраўнікоў — дактары і кандыдаты навук, вядучыя навукоўцы і спецыялісты акадэмічных арганізацый, выкладчыкі беларускіх ВНУ. Мы маем унікальную магчымасць запрашаць у якасці навуковых кіраўнікоў магістарскіх праграм правадзейных членаў і членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі. Усё гэта працуе як сістэма забеспячэння якасці. Мы ажыццяўляем пастаянны маніторынг, нацэлены на бесперапыннае ўдасканаленне адукацыйных працэсаў і пошук новых унікальных формаў развіцця творчага патэнцыялу магістрантаў.

Завяршаецца навучанне ў магістратуры абаронай магістарскай дысертацыі, нацэленай на вырашэнне канкрэтнай значнай навуковай праблемы ці задачы рэалізуемай ў НАН Беларусі інавацыйнай вытворчасці. Як правіла, у рамках нацыянальнага ці міжнароднага праектаў. Штогод дзяржаўныя экзаменацыйныя камісіі і заказчыкі навуковых кадраў адзначаюць высокі ўзровень ведаў нашых выпускнікоў па абранай спецыяльнасці, глыбокае разуменне вывучанага матэрыялу, актуальнасць даследавання, творчы падыход у вырашэнні пастаўленых задач. Найвышэйшыя балы па выніках выніковай атэстацыі атрымліваюць, як правіла, больш за 80 працэнтаў студэнтаў. Такі вынік, а таксама перамогі ў конкурсе "100 ідэй для Беларусі", удзел у міжнародных грантах, унікальныя творчыя знаходкі, патэнты і публікацыі ў вядучых айчынных і міжнародных выданнях дэманструюць сфарміраванасць у нашых магістрантаў прафесійных аналітычных і даследчых кампетэнцый, якія даюць магчымасць паспяхова працаваць у навуковых арганізацыях, органах дзяржаўнага кіравання, у рэальным сектары эканомікі. Пераважная большасць выпускнікоў размяркоўваюцца на працу ва ўстановы Акадэміі навук, больш як палова, а гэта самы высокі паказчык у краіне, вытрымліваюць конкурс у аспірантуру.

***— Сёння як ніколі раней на авансцэну выходзіць прыкладны характар навукі. Наколькі ўлічваецца ў праграмах інстытута гэтая акалічнасць? Як адукацыйны працэс зарыентаваны на такія сучасныя "выклікі"?***

— Адукацыйны працэс у Інстытуце непарыўна звязаны з прыярытэтнымі навуковымі напрамкамі, вызначанымі дзяржавай. Прынцыповае значэнне для ўстойлівага і дынамічнага развіцця сучаснай дзяржавы маюць і стратэгічныя мэты ў адпаведнасці з Канцэпцыяй комплекснага прагнозу навукова-тэхнічнага прагрэсу і прыярытэтных напрамкаў навукова-тэхнічнай дзейнасці ў Рэспубліцы Беларусь на перыяд да 2020 года, падрыхтаванай у НАН Беларусі. Да таго ж, не варта забываць, што сучасныя навука і адукацыя развіваюцца ва ўмовах глабальных выклікаў, няўстойлівасці каштоўнасцяў, маштабных і дынамічных міждзяржаўных інтэграцыйных працэсаў. Менавіта ў гэтай сувязі мы аптымізавалі навукова-адукацыйны працэс, інтэнсіфікавалі міжнароднае супрацоўніцтва, ствараем сістэму дадатковай адукацыі ў галіне эфектыўнай прафесійнай навуковай і гутарковай камунікацыі на замежнай мове, а для замежных грамадзян на дзяржаўных мовах нашай краіны — беларускай і рускай. Мы прыхільнікі кластарызацыі адукацыйных праграм у рамках парадыгмы "Універсітэт 3.0 — навука, адукацыя, інавацыі" і актыўныя яе выканаўцы. Інстытут на працягу многіх гадоў паспяхова ажыццяўляе сістэмную інтэграцыю ў сферах навукі і адукацыі ў рамках сеткавага ўзаемадзеяння з навуковымі арганізацыямі — шляхам сумеснага выкарыстання ўнікальнага навуковага абсталявання, рэсурсаў навукова-метадычнага і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння.

***— На які прамежак часу разлічана навучанне ў Інстытуце? Чым абгрунтаваны гэты тэрмін?***

— Мы прапаноўваем адукацыйныя праграмы рознай працягласці: ад аднадзённых семінараў, тыднёвых курсаў павышэння кваліфікацыі да гадавых магістарскіх праграм і трохгадовай аспірантуры. Галоўнае, што гэтыя праграмы забяспечваюць паўнату цыкла падрыхтоўкі навуковага работніка — ад фарміравання прафесійнай навуковай цікавасці да дасягнення і захавання прафесійнай кампетэнтнасці ў навуковай ды інавацыйнай дзейнасці. Важнымі фактарамі з'яўляюцца таксама пераемнасць і бесперапыннасць у адукацыйным працэсе.

***— Ці ёсць у Інстытуце якая-небудзь спецыялізацыя? Якія напрамкі навуковай дзейнасці тут лічацца прыярытэтнымі для слухачоў?***

— Наша ўнікальная спецыялізацыя — падрыхтоўка навуковых кадраў, актыўная дзейнасць па забеспячэнні інтэлектуальнай бяспекі дзяржавы. Мы імкнёмся рыхтаваць кадры, якія "робяць" навуку не толькі асновай



Жарэс Алфёраў — госць інстытута

эканомікі, але і, як нядаўна падкрэсліў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка, “апорай дзяржаўнай ідэалогіі”. Іншая адметная рыса вучобы ў Інстытуце звязана з адсутнасцю шаблонаў у навуковай дзейнасці. Адсюль і наяўнасць значнай колькасці ступеняў свабоды ў прапануемых магістрантам “навукова-адукацыйных траекторыях”. Бо кожны будучы навуковец — унікальны.

амаль няма немагчымага. Таму неабходна разумная дапушчальнасць”. На мой погляд, апошняе і ёсць — аптымальнае рашэнне.

***— У нашы дні многае значыць актыўная інтэграцыя навукоўцаў, рэалізацыя сумесных праграм з замежнымі калегамі. Праграма падрыхтоўкі ў Інстытуце ўлічвае гэтую акалічнасць? Яна адаптавана пад такія патрэбы?***

Міністэрствам адукацыі, дарэчы, Кітайскай Народнай Рэспубліцы, для атрымання адукацыі за мяжой. Мы распрацоўваем сумесна з навуковымі кіраўнікамі, вядучымі навукоўцамі НАН Беларусі магчымыя тэмы навуковых даследаванняў для будучых замежных аспірантаў і размяшчаем іх на афіцыйным сайце Інстытута. Акрамя ўсяго, у Інстытуце прапаноўваюцца таксама падрыхтоўчыя курсы па рускай і беларускай мовах як замежных, профільных прадметах для паступлення ў ВНУ краіны.

Безумоўна, інтэрнацыянальны характар сучасных навуковых даследаванняў павінен быць забяспечаны акадэмічнай мабільнасцю студэнтаў, маладых навукоўцаў, прафесарска-выкладчыцкага складу. Узаемадзеянне з замежнымі партнёрамі, пасольствамі, для забеспячэння замежных стажыровак, удзелу ў міжнародных навуковых конкурсах, рэалізацыі сумесных даследчых грантаў — наш прыярытэт.

***— Год навукі толькі пачаўся — але час імклівы. А таму, напэўна, ёсць загадзя звярстаныя планы. Што трэба зрабіць, каб год для Інстытута стаў удалым. Каб яго з упэўненасцю можна было занесці ў залік важкіх спраў.***

— Год навукі — гэта перш за ўсё час актыўнай і сістэмнай работы па выпрацаванай стратэгіі развіцця Інстытута. А што датычыцца поспеху, то мы імкнёмся адпавядаць ідэі, сфармуляванай вялікім рускім хірургам, прыродазнаўцам і педагогам Мікалаем Іванавічам Піраговым: “Аддзяліць вучэбнае ад навуковага ва ўніверсітэце нельга. Але навуковае і без вучэбнага ўсё-такі свеціць і грэе. А вучэбнае без навуковага, як ні была б спакуслівая яго знешнасць, толькі блішчыць”. Іншымі словамі, мы павінны быць прыметныя і паспяховыя, канкурэнтаздольныя і эфектыўныя. Абавязаны рыхтаваць інтэлектуальную эліту, забяспечваючы дынамічнасць і ўстойлівасць развіцця сучаснай маладой незалежнай дзяржавы. Мы нацэлены на тое, каб, паводле вобразнага выразу Прэзідэнта Беларусі, рыхтаваць не проста навуковых работнікаў, а навукоўцаў, “здольных на нешта вялікае”.

Уладзімір **Міхайлаў**

***Мы маем унікальную магчымасць запрашаць у якасці навуковых кіраўнікоў магістарскіх праграм правадзейных членаў і членаў-карэспандэнтаў НАН Беларусі. Усё гэта працуе на развіццё творчага патэнцыялу магістрантаў і забеспячэння якасці ведаў***

***— У апошнія гады модным стала такое паняцце, як “аптымізацыя”. У свеце ўсё шукаюць адзіна правільныя аптымальныя рашэнні ў няпростых крызісных сітуацыях. Знайсці такія рашэнні вельмі складана — многае залежыць ад падрыхтаванасці кадраў. Як у Інстытуце ўлічваюць гэтую асаблівасць часу? Якія формулы поспеху раскрываюць слухачам?***

— Наша “формула” — гэта тыя каштоўнасці навукова-адукацыйнай працягласці, якіх мы прытрымліваемся: ісціна, прагрэс і адказнасць. Яшчэ адзін складнік — успрымальнасць да інавацый і нацэленасць на дасягненне выніку. Нарэшце, залог поспеху — у напружанай творчай рабоце, на якую мы настроены ў Год навукі. Мне вельмі падабаецца выказванне навукоўца-матэматыка, аўтара першай мовы праграмавання, жанчыны-контр-адмірала, якая нарадзілася 110 гадоў назад, Грэйс Хопер: “Караблю бяспечней за ўсё ў гавані, але ён не для гэтага будаваўся”.

Што датычыцца пошуку аптымальных рашэнняў у складаных сітуацыях, то, як адзначыў у адным з нядаўніх інтэрв’ю акадэмік Уладзімір Гусакоў, “для сучаснай навукі ўжо

— Мы распрацоўваем унікальныя для еўрапейскага рэгіёна магістарскія праграмы са значным экспартным патэнцыялам. Нашы партнёры — вядучыя ВНУ Еўропы і Азіі. Электронная ахова здароўя, нанаматэрыялы і нанатэхналогіі, адытыўныя тэхналогіі, аднаўляльныя крыніцы энергіі — высока запатрабаваныя ў свеце напрамкі падрыхтоўкі, якія мы прапаноўваем і распрацоўваем.

***— Цікава, якія праграмы навучання для патэнцыйных слухачоў з іншых краін сёння можа прапанаваць Інстытут? Якія ўмовы такога навучання, калі яно прадугледжана?***

— Замежным грамадзянам, якія валодаюць англійскай мовай, прадстаўлена магчымасць навучання, падрыхтоўкі дысертацыйнага даследавання і абароны дысертацыі на англійскай мове па 47 навуковых спецыяльнасцях аспірантуры прыродазнаўчанавуковага, тэхнічнага і гуманітарнага профіляў. Гэта самы высокі паказчык у краіне. Актыўна праектуюцца англамоўныя магістарскія праграмы. Інстытут уваходзіць у пералік ВНУ, рэкамендуемых

# Традыцыі высокага інтэлекту




НАДЗЕЯ ПАНКРАТАВА

**Свае навуковыя пошукі ўраджэнцы Беларусі пачалі весці задоўга да таго, як на тэрыторыі краіны ў 1922 годзе ўзнікла першая беларуская навуковая ўстанова**

Год навукі на Беларусі пачаўся з прэс-канферэнцый, круглых сталоў, інтэрв'ю для вядучых СМІ аўтарытэтных беларускіх вучоных. Пры тым адзначалася: Год аб'яўлены дзеля таго, каб павысіць ролю навукі ў выкананні задач сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, стварыць спрыяльныя ўмовы для захавання і развіцця навуковага патэнцыялу, далей фарміраваць міжнародны імідж Беларусі як краіны з высокім узроўнем інтэлектуальнага і чалавечага капіталу. Рэдакцыі, журналісты часцей сустракаюцца з навукоўцамі, вызначаюць, да якіх актуальных навуковых тэм яшчэ варта звярнуцца. І, вядома ж, у ліды публікацый выносіцца ўсё найбольш важнае, што вызначае абрысы "мацерыка навукі", ягоныя адметнасці ў сучасным беларускім грамадстве.

А навуковы пошук у Беларусі моцна спалучаны сёння з эканомікай: каля 85 працэнтаў інвестыцый у навуку накіроўваюцца на даследаванні прыкладнога характару. Між тым і космас беларускія даследчыкі асвойваюць, і ўжо сёлета спецыялісты Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі пачнуць выраб спадарожніка БКА-2. Разам з калегамі з Беларускага дзяржуніверсітэта вучоныя і спецыялісты акадэміі стварылі яшчэ і нанаспадарожнік, які плануецца запусціць у 2017-м, стварыць для яго сістэму кіравання. Мяркуецца, што выкарыстоўвацца нанаспадарожнік будзе як у вучэбных, так і ў навуковых мэтах.

Прэзентуючы Год навукі ў Беларусі, Старшыня Прэзідыума НАН Уладзімір Гусакоў засяродзіў увагу, што "цяпер навуковая сфера пераходзіць на кластарную арганізацыю. Працуюць створаныя на базе НАН Беларусі міждысцыплінарныя навукова-даследчыя цэнтры і навукова-тэхналагічныя кластары пошукавага і стратэгічнага характару. Па найбольш запатрабаваных напрамках ствараюцца скразныя навукова-вытворчыя аб'яднанні". Вядома ж, пільная ўвага грамадства скіравана туды, дзе навука рухае наперад тэхніку, спрыяе з'яўленню новых тэхналогій. У якасці прыкладу акадэмік прывёў Навукова-тэхналагічны парк "БелБіяград" з поўным цыклам работ: ад даследаванняў і распрацовак да вытворчасці навукаёмістай прадукцыі. Сярод важнейшых навуковых праектаў года і бліжэйшай будучыні — распрацоўка новага беларускага спадарожніка дыстанцыйнага зандавання Зямлі, суперсучасных шматфункцыянальных беспілотных лятальных комплексаў, развіццё 3D-друку. Шмат увагі надаецца комплекснаму навуковаму абслугоўванню АЭС, што будуецца пад горадам Астраўцом, на Гродзеншчыне. І хоць атамная энергія, мяркуецца, параўнальна хутка зойме значнае месца ў энергабалансе краіны, аднак вядзецца і распрацоўка навуковага і тэхналагічнага патэнцыялу новых відаў энергетыкі, у тым ліку і сонечнай.

І яшчэ ўдакладненне для тых, хто, як кажуць, не ў тэме: Беларусь яшчэ з савецкага часу мае і актыўна развівае даволі значны навукова-тэхналагічны патэнцыял па шэрагу галін — гэты набытак адметны як у рэгіянальным, так і ў сусветным маштабе. І таму, напрыклад, не выпадкова ў сусветным рэйтынгу паспяховых краін Good Country Index у 2016 годзе Беларусь заняла 37-е месца ў спісе 163 краін у намінацыі "Навука і тэхналогіі".

## "...Прыбыў нейкі вельмі вучоны малады чалавек"

Сімвалічна, што Год навукі аб'яўлены якраз сёлета, калі спаўняецца 95 гадоў, як у Беларусі была адкрыта першая навукова-даследчая ўстанова: Інстытут беларускай культуры (Інбелкульт). Праз некаторы час, у 1928-м, якраз на яго аснове была ўтворана Нацыянальная акадэмія навук Беларусі.

Заўважым, аднак: яшчэ й за чатыры стагоддзі да стварэння Інбелкульта інтэлектуальная эліта беларускіх зямель была далучана да вучоных эліт свету, найперш свету еўрапейскага. А тэрыторыі нашы, нагадаем, пасля часоў старажытнай Русі ўвайшлі спачатку ў склад Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага: даследчыкі сцвярджаюць, што тая двухэтнічная дзяржава паступова ўтварылася прыкладна ў 1245—1315 гадах з пляменных балцкіх княстваў і значнай часткі тэрыторыі старажытнай Русі. Перад тварам знешніх пагроз ВКЛ шукала моцных саюзнікаў. І ў 1569 годзе ў Любліне, горадзе на ўсходзе Польшчы, была падпісана унія: пагадненне аб дзяржаўна-палітычным саюзе ВКЛ з Польшчай. Так і ўтварылася федэратыўная дзяржава Рэч Паспалітая, што ў перакладзе з польскай мовы азначае: рэспубліка. На карце Еўропы з'явілася новая дзяржава, прычым адна з самых вялікіх і магутных на той час. Ды нішто ў свеце, як кажуць не вечнае. З часам у выніку геапалітычных падзей канца XVIII стагоддзя, што атрымалі назву Тры падзелы Рэчы Паспалітай (1772, 1793 і 1795 гады) гэтая дзяржава перастала існаваць, а беларускія землі аказаліся ў складзе Расійскай імперыі.

Што вядома пра нашых продкаў, людзей высокай вучонасці, у пару ВКЛ? Не будзем тут паглыбляцца ў гэтую вялікую тэму. Прывядзём толькі адзін яскравы факт: наш знакаміты зямляк, першадрукар і асветнік, доктар мастацтваў Францыск Скарына стаў яшчэ і доктарам медыцыны, здаўшы адпаведны экзамен у італьянскай Падуі больш за 500 гадоў таму: у 1512-м. Руплівыя даследчыкі расшукалі ў італьянскіх архівах найкаштоўны дакумент з тых часоў — своеасаблівае прадстаўленне маладога вучонага, які гатовы трымаць адказны экзамен. "Найдастойнейшыя паны дактары! Прычына склікання Вашых Дастойнасцяў наступная: прыбыў нейкі вельмі вучоны малады чалавек, доктар мастацтваў, бедны, родам з надзвычай далёкіх краёў, магчыма на чатыры тысячы міляў і больш ад гэтага слаўнага горада, для таго, каб узвялічыць славу і бляск Падуі, а таксама красуючай супольнасці філасафаў гімназіі ды святой нашай Калегіі. Ён звярнуўся да Калегіі з просьбай



дазволіць яму ў якасці дару і асобай міласці падвергнуцца з ласкі Божай выпрабаванням у галіне медыцыны пры гэтай святой Калегіі. Калі, Вашыя Дастойнасці, дазволіце, прадстаўляю яго самаго. Малады чалавек і вышэйзгаданы доктар носіць імя пана Францыска, сына нябожчыка Лукі Скарыны з Полацка, русін". А падпісаны гэты дакумент так: "Тадэа Мусаці, царква св. Урбана, Падуя, 5 лістапада 1512 года".

Між тым пакуль невядома: дзе ж Скарына вучыўся, каб здаць той экзамен? Цікавую версію на гэты конт вылучыў летась навуковец Алесь Жлутка пасля працы ў архівах Ватыкана. Раней былі вядомыя сведчанні, што Францыск Скарына пэўны час быў на службе ў дацкага караля Ханса (Іагана): якраз тады і здаваў экзамен на званне доктара медыцыны. Жлутка ўстанавіў, што ў Еўропе ў той час прадпрымаліся, у тым ліку і з удзелам дацкага караля, спробы экуменічнага паяднання ўсходняй і заходняй галін хрысціянства. У Ватыкане праходзіў V Латэранскі сабор (1512-1517), прычым у складзе дэлега-

цыі дацкага караля на саборы быў і нейкі Скарына. Даследчык разважае: “Узнікае пытанне: навошта Скарына спатрэбіўся дацкаму каралю ў якасці сакратара? Адказ напрошваецца сам сабой: для дыпламатычных адносін як з ВКЛ і Вялікім князем Жыгімонтам (Сігізмундам), так і з маскоўскім царом Васілём III. Скарына выконваў экуменічную місію ў справе прымірэння дзвюх галін хрысціянства. Вельмі верагодна, што ў Даніі ён і атрымаў медыцынскую адукацыю, каб пасля абараніць дысертацыю па медыцыне ў Падуі”. Што ж, лагічна. І ў кнігах Скарыны, дарэчы, адстойваюцца хрысціянскія прынцыпы, аднак няма яўнага пахілення ні ў каталіцтва, ні ў праваслаўе.

Яшчэ адна загадка — з часу жыцця Скарыны ў Вільні (цяперашні Вільнюс). Там беларускі першадрукар выдаў “Малую падарожную кнігу” (1522) і “Апостал” (1525), а яшчэ — не менш за чатыры гады (1525-1529) служыў у віленскага біскупа Яна. І паколькі чалавек высокай вучонасці, усебакова адукаваны не мог займацца шараговымі справамі, то даследчыкі вылучаюць гіпотэзу: добра ведаючы “правы боскія і правы чалавечыя”, Скарына быў асноўным аўтарам Першага Статута ВКЛ 1529 года. Значэнне гэтага дакумента цяжка пераацаніць, і яго нездарма называюць першай еўрапейскай канстытуцыяй. Хоць Статут, напісаны на старабеларускай мове, надоўга застаўся ў рукапісе, аднак і яго стварэнне вывела ВКЛ на адно з першых месцаў у свеце па развіцці права і прававой культуры. Але як устанавіць аўтара? Магчыма, варта параўнаць лексіку вядомых выданняў Скарыны і лексіку Статута 1529 года. Гэта, пэўна, няцяжка, бо ёсць сучасныя камп’ютарныя тэхналогіі. Якраз да 500-годдзя беларускага кнігадрукавання ўпершыню перавыдадзены 20 факсімільных кніг Францыска Скарыны — яны, дарэчы, дэманстраваліся і на нядаўняй Міжнароднай кніжнай выставе ў Мінску. Што да статута, то ў нэце знаходзім: “Упершыню Статут 1529 надрукаваны ў 1841 годзе ў Познані ў “Зборы літоўскіх законаў з 1389 да 1529 год” (лацінскім шрыфтам), у 1854 г. — кірыліцай у Маскве”.

Пэўна ж, і не адзін такі Францыск Скарына разумны ў ВКЛ тады быў! І ў больш позняй беларускай гісторыі знойдзеш нямала прыкладаў, як сыны зямлі нашай рэалізоўвалі свае таленты па свеце, у тым ліку і ў навуцы. Сярод іх і нацыянальны герой Чылі, вучоны-геолаг Ігнат Дамейка (ён закончыў Горную школу ў Парыжы ў 1837 годзе), сябар вялікага паэта Адама Міцкевіча. Пра спрадвечную любоў беларусаў да ведаў, пра традыцыі шанавання вучонасці я падрабязней пісаў у папярэднім нумары часопіса ў артыкуле “Спадчына інтэлекту”.

## Няпростая навука: выжываць

Чаму, аднак, параўнальна позна з’явіліся навуковыя ўстановы на беларускіх землях? Так складваліся рэаліі жыцця нашых продкаў... У самы цэнтр еўрапейскага кантынента, на скрыжаванне стратэгічна важных шляхоў, на берагі паўнаводных, адкрытых у вялікі свет рэчак Дняпро, Дзвіна, Нёман прыходзілі розныя людзі, у тым ліку і ліхія, са знішчальным агнём ды смертаноснай зброяй. Таму ў найбольшай пашане ў беларускім гаспадарстве спрадвеку была вялікая і няпростая ў сваім практычным прымяненні навука выжываць. Многія тагачасныя пошукі, даследаванні, разлікі разумных людзей скіроўваліся пераважна ў бок таго, як абараніцца падчас рэальнай небяспекі. Таму нават храмы, палацы ў нас навучыліся будаваць — як крэпасці.

> ***У найбольшай пашане ў беларускім гаспадарстве была навука выжываць. Многія ранейшыя пошукі, даследаванні, разлікі разумных людзей скіроўваліся пераважна ў бок таго, як абараніцца падчас рэальнай небяспекі***

Дарэчы, знакаміты Тадэвуш Касцюшка (родам з тэрыторыі цяперашняга Івацэвіцкага раёна Брэстчыны) стаў Нацыянальным героем ЗША дзякуючы якраз таленту і ведам фартыфікатара, якія спатрэбіліся, калі Злучаныя Штаты адстойвалі сваю незалежнасць.



Нагадаем: тэрмін “фартыфікацыя” — з Сярэднявечча, ён азначаў спачатку доўгатэрміновыя фартыфікацыйныя збудаванні, а навуку, што вывучала адпаведную тэорыю і практыку, называлі ваеннай архітэктурай. У інтэрнэце знаходзім: “У 1776 годзе Касцюшка пераехаў у Паўночную Амерыку, дзе прыняў удзел у вайне за незалежнасць ЗША ў званні палкоўніка Кантынентальнай арміі. Будучы дасведчаным ваенным інжынерам, ён распрацоўваў праекты і камандаваў будаўніцтвам самых сучасных умацаванняў, у тым ліку форта ў Вэст-Пойнце, Нью-Ёрк”. У 1783 годзе Кантынентальны кангрэс у знак прызнання заслуг нашага земляка вылучыў яго ў брыгадныя генералы.

Крэпасці, аднак, трэба было і абараняць пад час нападзення ворага, працяглай асады адпаведным чынам: проста адсядзецца за тоўстымі мурамі не заўсёды ўдавалася. Вось і думалі беларусы, вынаходзілі ды ўдасканальвалі зброю. Навука, дарэчы, гэта была ці практыка? А ўсё адразу! Час прымушаў найхутчэй прымяняць навуковыя знаходкі, вынікі розных эксперыментаў, складаных разлікаў у жыццё: каб выжыць. Сярод вучоных беларусаў з XVII стагоддзя згадаем Казіміра Семяновіча, аўтара кнігі “Вялікае мастацтва артылерыі”. Заўважым адразу: войны гэты “шляхціч-ліцьвін з тэрыторыі

Вялікага Княства Літоўскага" — так сябе называў — лічыў найвялікшым няшчасцем для чалавецтва.

Пра шлях земляка ў эксперыментальнай прыродазнаўчай навуцы цікава напісалі гісторыкі Аляксандр Бельскі ды Міхась Ткачоў у кнізе "Вялікае мастацтва артылерыі" (1992). Вось адзін з фрагментаў: "У 1650 годзе ў сталіцы Нідэрландаў Амстэрдаме, славутым асяродку рамёстваў, гандлю і кнігавыдання, у вядомай друкарні Яна Янсана пабачыла свет кніга "Вялікае мастацтва артылерыі". Напісаў яе наш суайчыннік, генерал-лейтэнант кароннай артылерыі Казімір Семяновіч. На працягу паўтара стагоддзя кніга была ў Еўропе самай грунтоўнай і аўтарытэтнай навуковай працай па артылерыі ды піратэхніцы. Вядомы яе пераклады на французкую, нямецкую, ангельскую ды іншыя мовы. Пра ўплыў кнігі К. Семяновіча на развіццё ракетнай справы і артылерыйскага мастацтва можна было б напісаць спецыяльнае даследаванне. Амаль у кожнай працы, прысвечанай артылерыі ды піратэхніцы і напісанай у другой палове XVII стагоддзя і ў XVIII стагоддзі, можна знайсці звесткі, узятыя з ягонага твора, аднак не заўсёды са спасылкай на першакрыніцу. Кнігай К. Семяновіча карысталіся перш за ўсё еўрапейскія прафесіяналы-артылерысты і феерверкеры, якія шырока дастасоўвалі ягоныя адкрыцці ў галіне ракетнай справы. Ракетамі сталі цікавіцца ў канцы XVII стагоддзя і ў Расіі. Першыя звесткі пра выкарыстанне там ракет (феерверк у горадзе Усцюг) датуюцца 1675 годам. Пётр I, імкнучыся як мага паўней азнаёміцца з дасягненнямі сусветнай навукі і тэхнікі, сабраў вялікую асабістую бібліятэку па артылерыйскім мастацтве. У тым кнігазборы быў і нямецкі пераклад кнігі К. Семяновіча".

На заканчэнне грунтоўнага даследавання сучасныя аўтары пішуць: "На небасхіле беларускай нацыянальнай навукі нямала зорак першай велічыні. Адна з іх ззяе сваім нязгасным святлом вось ужо больш за 300 гадоў. Гэта Казімір Семяновіч, ураджэнец беларускай зямлі, выдатны вучоны ў галіне артылерыі ды піратэхнікі. Ягоны геній выкарыстоўваем мы сёння, пасылаючы да Месяца, Сатурна, Марса ды іншых планет касмічныя апараты з дапамогай шматступеневых ракет. Прататып, будову і стабілізатары гэтых складаных ракет ён распрацаваў яшчэ ў сярэдзіне XVII стагоддзя".

І тут варта яшчэ дадаць: цяперашнія касмічныя праграмы Беларусі, нашы спадарожнікі на арбіце, касманаўты з беларускімі родавымі каранямі (а сярод іх і першая ў свеце жанчына-касманаўтка Валянціна Церашкова…) — гэта лагічны працяг на новым вітку гісторыі тых традыцый, што маем у спадчыну ад вялікіх папярэднікаў нашых

Яшчэ адным важным складнікам у тагачаснай "навуцы выжывання" быў конь: працаўнік у гаспадарцы, транспарт, своеасаблівая зброя ў баях… І першы ў Рэчы Паспалітай грунтоўны і дэталёвы дапаможнік па конегадоўлі, коннай яздзе, па анатоміі ды фізіялогіі каня напісаў Крыштаф Мікалай Дарагастайскі (Монвід-Дарагастайскі). Пра яго чытаем: "Паходзіў з аднаго з самых заможных і старажытных магнацкіх родаў у Вялікім Княстве Літоўскім… Нарадзіўся ў сям'і полацкага ваяводы Мікалая Дарагастайскага і Ганны Вайнянкі". Кніга, якую можна лічыць каштоўным навукова-практычным выданнем, пабачыла свет у Кракаве ў 1603 годзе. У XVII — XVIII стагоддзях неаднаразова перавыдавалася. На беларускую мову перакладзена ўжо ў наш час, выдадзена ў 2007 годзе.

## Энергіі дабра і ліха

Каго яшчэ згадаем з удзячнасцю за навуковую працу на грамадскую карысць, у імя жыцця на Зямлі? Сусветна вядомага фізіка Георгія Ляхоўскага (1870-1942), які вывучаў энергіі, прыдумаў і зрабіў шматчастотны генератар, шукаючы дзейсны сродак для комплекснага лячэння розных хвароб, у тым ліку і анкалогіі.



Доўгі час у Беларусі не ведалі, што Георгі Ляхоўскі — наш зямляк, бо ягоны шматгранны талент раскрыўся ў Парыжы. Пра ўраджэнца Міншчыны (ці то горад Вілейка, ці то мястэчка Ілья прэтэндуюць на званне ягонай малой радзімы) цікава напісалі ў наш час беларускія навукоўцы Любоў Уладыкоўская і Валеры Шалатонін у газеце "Голас Радзімы" ("Навука шчасця ад Георгія Ляхоўскага", 13.11.2014). Вось урывак з іх тэксту: "Вучоны-вынаходнік выкладае арыгінальныя падыходы да фундаментальных праблем жыцця. Ён лічыць, і пазней пацвярджае тое эксперыментальна, што ўсе жывыя клеткі валодаюць вагальнай структурай з пэўнай рэзананснай частатой. Такім чынам, кожная клетка — і крыніца, і адначасова прыёмнік выпраменьванняў. Знешнія нябачныя "добрыя" энергіі, што гарманізуюць клеткі і арганіз-



Шматчастотны генератар Георгія Ляхоўскага і цяпер запатрабаваны



Актывісты Іркуцкага таварыства беларускай культуры імя Яна Чэрскага памятнай шыльдай ушанавалі памяць пра знакамітага вучонага-супляменніка на адной з горных вяршынях у Прыбайкаллі

мы, — гэта, на думку аўтара, выпраменьванні зямныя, атмасферныя і касмічныя. Жывучы ў электрамагнітным полі, якое мае шырокі спектр частот, кожная клетка асімілюе знешнюю энергію той частаты, якая ёй патрэбная, прытым таксічнае, “ліхое” выпраменьванне бактэрый ці вірусаў падаўляецца. Гэтая ды іншыя ідэі сталі асновай для стварэння вучоным новага метаду і спецыяльнага генератара (Multiple Wave Oscillator, 1931г.), прызначанага для лячэння ў тым ліку і анкахвароб”.

А між тым ёсць у Георгія Ляхоўскага і славуты, таксама высокаадукаваны супляменнік-папярэднік: Якуб-Сармант-Жыгімонт Наркевіч-Ёдка (1848-1905). Ураджэнец мястэчка Турын (цяпер вёска ў Пухавіцкім раёне) таксама спрабаваў паяднаць у сваёй практыцы глыбокае веданне фізікі з клопатамі пра здароўе людзей. У інтэрнэце знаходзім: фізік, медык, біёлаг, а яшчэ — доктар медыцыны (1893), прафесар (1900), член-карэспандэнт Расійскага геаграфічнага таварыства (1889). Звернем увагу: закончыўшы Мінскую гімназію, Якуб Наркевіч-Ёдка вучыўся ў медінстытуце ў Фларэнцыі, потым — у Венскім універсітэце ў Сарбоне. Так што адукацыю атрымаў заходнееўрапейскую. І ўжо ў 1872 годзе ў маёнтку Атонава (цяпер вёска Сінячова, Капыльскі раён) збудаваў метэаралагічную станцыю, яе ж у 1888-м перанёс у маёнтак Наднёман (цяпер вёска, Уздзенскі раён). Расказваем пра тое падрабязна, бо гэта ж беларус Якуб Наркевіч-Ёдка ў 1891 годзе вынайшаў спосаб бяздротавай перадачы і прыёму электрамагнітных хваляў на адлегласці — зрабіў першы ў свеце правобраз радыёпрыёмніка. На той час ён быў супрацоўнікам Інстытута эксперыментальнай медыцыны ў Пецярбурзе. І хоць вынаходніцтва не запатэнтаваў, ды ёсць дакумент, які пацвярджае прыярытэт беларуса ў гэтай справе: пратакол пасяджэння Французскага фізічнага таварыства ў Парыжы за снежань 1898 года. У ім адзначаецца, што: “Лоджу належыць першая ідэя бяздротавай тэлеграфіі, калі мы не пажадаем дайсці да Наркевіча-Ёдкі, ...які двума-трыма гадамі раней выканаў у Вене вельмі цікавыя перадачы са шпуляй Румкарфа (праўда, можа быць, без выразнага ўсведамлення ролі электрамагнітных хваляў у тых доследах”.

Варта яшчэ дадаць: Якуб Наркевіч-Ёдка зрабіў адкрыцці ў галіне метэаралогіі, за што быў ушанаваны сярэбраным медалём Расійскага геаграфічнага таварыства. Ён жа адкрыў у сваім маёнтку санаторый, распрацаваў метады лекавання нервовых захворванняў электратокам: у гэтым кірунку ягоныя даследаванні блізкія да таго, чым займаўся пазней Георгі Ляхоўскі. У розных крыніцах знаходзім яшчэ весткі пра ягоны метад электраграфіі для дыягностыкі захворванняў, а таксама лекаванне кумысам, святлом. Скарыстоўвалася ў лячэбным працэсе паводле рэкамендацый Якуба Наркевіча-Ёдкі таксама гімнастыка, мясцовыя мінеральныя воды.

Што цікава: нябачныя энергіі, якія пранізваюць усё навокал, чамусьці асабліва прыцягваюць увагу нашых супляменнікаў. У прыватнасці, праславіўся ў навуковым свеце даследчык энергіі Сонца Аляксандр Чыжэўскі, у якога родавыя карані з Гродзенскай вобласці. Цяпер, напрыклад, у продажы ёсць “люстры Чыжэўскага” — гэта ўвасабленне ягоных ідэй пра электрычную іанізацыю паветра.

Многія ведаюць сёння пра расійскіх навукоўцаў-прыродазнаўцаў Яна Чэрскага, Бенедыкта Дыбоўскага — абодва яны родам з Беларусі, былі сасланы ў расійскую Сібір за ўдзел у паўстанні 1863 года. Там і пачалі рэалізоўваць свае таленты. Яшчэ раней на задворках імперыі за ўдзел у паўстанні 1830-1831 года апынуўся ўраджэнец Нясвіжа Адольф Янушкевіч. І там, у так званых кіргізкіх стэпах, стаў этнографам, даследчыкам культуры казахаў: землі ж іх таксама ўваходзілі ў склад Расійскай імперыі. У Расіі ж дасягнулі поспехаў як вучоныя Нобелеўскі лаўрэат па фізіцы Жарэс Алфёраў (нарадзіўся ў Віцебску), славуты авіяканструктар Павел Сухі (родам з горада Глыбокае), кіраўнік Новасібірскага аддзялення Расійскай акадэміі навук акадэмік Валянцін Капцюг (родавыя карані ў яго з Віцебшчыны)... Пералік можна доўжыць.

Не толькі ў Расіі, аднак, знойдзеш сярод навукоўцаў людзей з беларускімі родавымі каранямі. Скажам, знакаміты бацька сусветнай акіянаграфіі Жак Іў Кусто — таксама з нашых. Кажуць, з ваколіц мястэчка Лынтупы (цяпер Віцебшчына) паехаў шукаць лепшую долю ў Францыі напрыканцы XIX — пачатку XX Даніла Куст, ягоны бацька. Там і асеў, ажаніўся з француженкай, стаў Даніэлем Кусто.

Ёсць такі выраз: час збіраць камяні… То і ў Год навукі, спадзяёмся, нам удасца больш даведацца, расказаць як пра малавядомых беларускіх вучоных з мінулага, так і тых, што вядомыя цяпер у свеце як грамадзяне іншых краін, аднак маюць родавую повязь з нашай Бацькаўшчынай.

Іван **Ждановіч**



УЛАДЗІМІР ШЛАПАК

# Стаўка робіцца на інавацыі

**Якой будзе краіна ў 2020 годзе? Зазірнуць у будучыню можна з зацверджанай на днях дзяржпраграмай інавацыйнага развіцця на бліжэйшыя пяць гадоў. Стаўка ў ёй зроблена на бія- і нанаіндустрыю, электронную і фармацэўтычную прамысловасць, інфармацыйна-камунікацыйныя і авіякасмічныя тэхналогіі, прыборабудаванне, атамную энергетыку і альтэрнатыўныя крыніцы энергіі. Ужо сёння відавочна: канкурэнтаздольнасць і рост эканомікі магчымыя толькі дзякуючы развіццю высокатэхналагічных, навукаёмістых напрамкаў. І сярод 75 уключаных у дзяржпраграму праектаў іншых варыянтаў няма.**

Буйная вытворчасць легкавых аўтамабіляў "БелДжы" і серыйная — верталётаў-беспілотнікаў. Стварэнне суцэльнаметалакордных шын радыяльнай канструкцыі на "Белшыне" і новы азотны комплекс "Гродна Азот". Укараненне новых тэхналогій вытворчасці мікрасхем на "Інтэграле". Выраб малалітражных дызельных рухавікоў на Мінскім маторным заводзе і будаўніцтва акумулятарнага завода ў Брэсцкай вобласці. Далейшае ўзвядзенне Беларускай АЭС. Вось толькі шэраг задач на бліжэйшы час, прадугледжаных дзяржпраграмай. Важную частку работы традыцыйна будзе весці Нацыянальная акадэмія навук.

— Мы працуем над васьмю праектамі, і кожны з іх — гэта рэалізацыя распрацовак, зробленых у Акадэміі навук, прамысловае асваенне іх вытворчасці, якая адносіцца да V і VI тэхналагічных укладаў, — уводзіць у курс справы намеснік старшыні прэзідыума Нацыянальнай акадэміі навук Сяргей Кілін. — Напрыклад, мікраўгнаенне "Нанаплант", створанага на аснове нанатэхналогій. Яшчэ па біялагічным напрамку будзе створаны біятэхналагічны комплекс па мікракланальным размнажэнні гаспадарча карысных раслін, гэтым займаецца наш батанічны сад, і заробіць доследна-прамысловая вытворчасць ферментаў у Інстытуце мікрабіялогіі — для атрымання лекавых субстанцый і найноўшых дыягнастычных сродкаў. Другі напрамак звязаны з машынабудаваннем і апрацоўкай матэрыялаў. Сюды ўваходзіць вельмі значная работа НВА "Цэнтр" па арганізацыі вытворчасці аўтаматызаванага модуля для сухога ўзбагачэння мінеральнай сыравіны. Гэта важна для будаўнічай галіны, шкляной прамысловасці, золатаабагачэння — заказчыкі ўжо ёсць як унутры краін, так і за яе межамі. Прыменена шмат ноу-хау, якія робяць працэс больш эфектыўным і энергазахавальным. Акрамя таго, мы плануем стварыць доследную вытворчасць кампазіцыйных матэрыялаў для 3D-друку — такой пакуль у краіне няма. Таксама будзем асвойваць вытворчасць распрацаванай Інстытутам машынабудавання камбінаванай камунальнай вакуумнай падмятальна-прыбіральнай машыны і многае іншае.

Як адзначылі ў Дзяржкамітэце па навуцы і тэхналогіях, у дзяржпраграме таксама надаецца вялікая ўвага развіццю інавацыйнай інфраструктуры. Плануецца, што ў агляднай будучыні ў нас з'явіцца сетка навукова-тэхналагічных паркаў і цэнтраў трансферу тэхналогій, якая ахоплівае ўсе рэгіёны. Зрэшты, дакумент застаецца адкрытым і штогод будзе папаўняцца новымі пазіцыямі.

Юлія **Васілішына**

## Дарэчы

**■ Рэалізацыя Дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця дасць магчымасць да 2020 года павялічыць долю экспарту навукаёмістай і высокатэхналагічнай прадукцыі ў агульным аб'ёме беларускага экспарту да 33 працэнтаў (30,8 працэнта ў 2015 годзе) і стварыць каля 9 тысяч новых высокапрадукцыйных працоўных месцаў.**

# Новая арбіта спадарожніка



НАДЗЕЯ ПАНКРАТАВА

**Нацыянальная акадэмія навук Беларусі пачынае выраб Беларускага касмічнага апарата дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі высокага распазнавання**

Кіраўнік апарату Нацыянальнай акадэміі навук акадэмік Пётр Віцязь падчас прэзентацыі Года навукі ў Беларусі расказаў, што за апошнія два гады ў краіне з'явілася новая галіна навукі — касмічныя даследаванні.

— Для гэтага ў нас створана сістэма дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі, ёсць свой спадарожнік. Цяпер мы працуем над стварэннем новага спадарожніка дыстанцыйнага зандзіравання з распазнаваннем 0,5 метра. Наша задача сёлета — пачаць яго выраб. Мы ўжо прапрацавалі тэхнічныя патрабаванні, падпісалі неабходныя дагаворы, — сказаў Пётр Віцязь.

Ён растлумачыў, што касмічная інфармацыя з першага спадарожніка дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі выкарыстоўваецца 11 міністэрствамі Беларусі.

— Работа БКА-1 прадоўжана на два гады, гэта ўжо ўзгоднена з Раскосмасам. Акрамя таго, разам з БДУ мы стварылі нанаспадарожнік, які трэба сёлета запусціць, стварыць сістэму кіравання. Лічу, што мы гэта будзем рабіць разам, каб выкарыстоўваць спадарожнік не толькі ў вучэбных мэтах, але і ў навуковых", — расказаў Пётр Віцязь.

Ужо вядома, што БКА-2 будзе ствараецца ў той жа кааперацыі распрацоўшчыкаў, якія выраблялі і БКА-1. З расійскага боку гэта карпарацыя "УНДІЭМ" (Усесаюзны навукова-даследчы інстытут электрамеханікі з заводам імя А.Г. Іасіф'яна). Мэтавую апаратуру будзе вырабляць беларускае прадпрыемства "Пеленг". Эксплуатацыя БКА-2 дасць магчымасць ствараць тапаграфічныя навігацыйныя карты ў маштабе 1:10 000. Адпаведна гэта стане асновай для вырашэння розных кадастравых задач. Запусціць другі касмічны апарат дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі плануецца ў канцы 2019 года.

Варта нагадаць, што першы Беларускі спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі быў паспяхова выведзены на разліковую арбіту 22 ліпеня 2012 года з касмадрома Байканур у Казахстане ў кластары з пяці касмічных апаратаў. У цяперашні час БКА ажыццяўляе касмічную здымку ў інтарэсах двух дзясяткаў арганізацый, якія знаходзяцца ў падпарадкаванні адзінаццаці міністэрстваў Беларусі, а таксама камерцыйную здымку ў інтарэсах шэрага замежных заказчыкаў.

— Гарантыйны тэрмін эксплуатацыі БКА-1 — пяць гадоў, ён заканчваецца ў сярэдзіне 2017 года. Мы пастаянна адсочваем стан бартавых сістэм, і аказалася, што дэградацыя элементаў ніжэйшая, чым разліковая. Таму летась было прынята рашэнне аб прадаўжэнні тэрміну эксплуатацыі да канца 2018-га. Спачатку будзе зроблены чарговы аналіз, і, калі апарат не страціць працаздольнасць, тэрмін будзе прадоўжаны. Запасу гаручага на борце хопіць да 2020 года, хоць гэта не вызначальны фактар, бо спадарожнік працуе ў жорсткіх умовах. Але ў нас аптымістычны прагноз: спадзяёмся, што наш першы спадарожнік будзе лятаць да таго, як мы запусцім новы, — такі варыянт развіцця падзей бачыць Сяргей Залатой, дырэктар прадпрыемства "Геаінфармацыйныя сістэмы" акадэміі.

> ***Варта нагадаць, што першы Беларускі спадарожнік дыстанцыйнага зандзіравання Зямлі быў паспяхова выведзены на разліковую арбіту 22 ліпеня 2012 года з касмадрома Байканур у Казахстане***

Спадарожнікі — рэнтабельны праект. У выпадку з першым касмічным апаратам выручка ад продажу здымкаў, тэхналогій, апаратуры ўжо на 8 мільёнаў долараў перавысіла затраты на яго стварэнне. Плюс трэба ўлічыць, што дзякуючы яму ў краіне з'явілася поўнафункцыянальная касмічная структура — цэнтр кіравання палётам і сістэма прыёму інфармацыі ў Мінску, камандна-вымяральны пункт у Плешчаніцах. І яе можна будзе лёгка мадэрнізаваць для работы з новым спадарожнікам, які, як мяркуецца, будзе запушчаны з касмадрома "Усходні" і стане працаваць у групоўцы з расійскімі спадарожнікамі.

Уладзімір **Веліхаў**



## Зубры з'явіліся на Зямлі даўно

**З дапамогай аналізу ДНК старажытных рэштак зуброў навукоўцы высветлілі, што гэтыя жывёлы існуюць ужо больш за 120 тысяч гадоў. Дагэтуль гісторыя з'яўлення жывёлы для іх заставалася загадкай.**

Аўстралійскія навукоўцы раскрылі таямніцу паходжання зуброў. Аказваецца, яны з'явіліся на Зямлі больш за 120 тысяч гадоў назад. Вывучыўшы геном 64 старажытных зуброў, біёлаг Алан Купер і яго калегі з дапамогай аналізу ДНК даказалі, што гэтыя жывёлы — нашчадкі ўжо вымерлых стэпавых бізонаў і продкаў сучаснай буйной рагатай жывёлы.

Раней лічылася, што зубры ўзніклі на планеце прыкладна 11,7 тысячы гадоў назад, ужо пасля знікнення стэпавых бізонаў. Тым больш што на многіх наскальных малюнках тых часоў былі адлюстраваны жывёлы, якія нагадваюць сучасных зуброў. Усё змянілася, калі былі знойдзены больш старажытныя рэшткі гэтых млекакормячых, якімі і заняліся навукоўцы. Дарэчы, колькасць беларускай папуляцыі зубра набліжаецца да аптымальнай — не менш за 1.500 асобін. На 1 лютага ў нашых лясах пражывала 1.428 асобін. Жывёлы знаходзяцца ў 10 мікрапапуляцыях, ізаляваных адна ад адной. Толькі ў Белавежскай пушчы налічваецца 480 зуброў.

Вольга **Савіцкая**




# Касмічныя хронікі Уладзіміра Кавалёнка

## Славуты зямляк распавядае пра свае прыгоды падчас палётаў

### Дасье

■ Уладзімір Кавалёнак нарадзіўся 3 сакавіка 1942 года ў вёсцы Белае Крупскага раёна Мінскай вобласці. Здзейсніў тры палёты ў космас — на караблі "Саюз-25" у 1977 годзе, "Саюз-29" у 1978 годзе, "Саюз Т-4" у 1981 годзе. Агульная працягласць палётаў склала 215 дзён 33 гадзіны 9 хвілін 40 секунд. Двойчы Герой Савецкага Саюза. Генерал-палкоўнік. Прэзідэнт Федэрацыі касманаўтыкі Расіі.

Двойчы Герой Савецкага Саюза Уладзімір Кавалёнак — адзін з першых касмічных доўгажыхароў. Яго палёт на караблі "Саюз-29" з Аляксандрам Іванчанкавым працягваўся рэкордныя на той момант 140 сутак. Па сутнасці, яны былі смяротнікамі. Тады, у 1978 годзе, ніхто не ведаў, ці выжывуць касмічныя марафонцы, вярнуўшыся на Зямлю.

— Лічбу 140 сутак выбралі невыпадкова. Асноўны эксперымент, які выконваўся ў тым палёце, быў звязаны з чалавечай крывёй, — расказаў Уладзімір Васільевіч. — Справа ў тым, што цыкл змены эрытрацытаў, чырвоных крывяных цельцаў, займае 120 дзён. За гэты час кроў у арганізме цалкам абнаўляецца. Мы з Іванчанкавым былі першымі ў свеце, у каго гэты працэс адбыўся на арбіце.

Ці можа чалавек з "касмічнай крывёй" жыць на Зямлі без фатальных наступстваў — навукцы тады было невядома.

— Як бачыце, можа, — усміхаецца двойчы Герой. — Мы сваім эксперыментам праклалі лыжню, як мы жартуем, іншым касмічным доўгажыхарам. Далей пайшлі ўжо палёты на 180, затым на 215 сутак. Там і гадавы рубеж пераскочылі.

***— У космас паляцеў беларус Алег Навіцкі, рады гэтаму?***

— Не проста рад, я шчаслівы і ганаруся гэтым. Алег узяў на арбіту беларускі сцяг. Я ж калі лятаў, абавязкова браў з сабою жменю зямлі з Хатыні — ва ўсіх трох палётах. Для беларуса няма нічога святейшага за хатынскую зямлю.

***— Якая наша планета з космасу?***

— Прыгожая невыказна, але вельмі маленькая. Карабель яе аблятае ўсяго за паўтары гадзіны.

У мяне ёсць ідэя! У свеце сёння зноў напружана. Я даўно прапаноўваў — сабраць усіх ястрабаў-палітыкаў, якія каламуцяць ваду і не даюць чалавецтву жыць спакойна, і запусціць іх гуртам на арбіту на паўгодзіка. Праве-



***— Ежа касмічная смачная?***

— Вельмі смачная і разнастайная. Усім падабаецца. Ніхто ў космасе яшчэ не пахудзеў. Да таго ж я непераборлівы. Вырас у вёсцы, мне любая ежа даспадобы. Хоць сумаваў, безумоўна, па бульбе — сапраўднай, рассыпістай, з малаком, з кропам. На арбіце яна сублімаваная, вадой разводзіш — атрымліваецца пюрэ.

У космасе, дарэчы кажучы, ужо даўно ніхто не есць з цюбікаў. У тубах толькі соусы і мёд. Хлеб спецыяльна фасуецца ў вельмі маленькія ўпакоўкі, літаральна на адзін укус. Каб крошкі не разляталіся, ва ўмовах бязважкасці гэта небяспечна — могуць трапіць у дыхальныя шляхі.

***— Сумяшчальнасць псіхалагічная вельмі важная ў экіпажы?***

— На гэты конт я нават вывеў уласную формулу. Сумяшчальнасць важная толькі тады, калі два дурні пачынаюць высвятляць, хто з іх разумнейшы. Гэтым звычайна ўсё і заканчвалася — іх палёт спынялі або наогул не дапускалі да старту, адпраўляючы на арбіту экіпаж-дублёр.

***— Бог ёсць?***

— Веру, што ёсць. Але ў космасе яго не бачыў.

Барыс **Арэхаў**

трыць мазгі. Быць можа, зразумеюць, што нам няма чаго дзяліць у нашым малюсенькім доме. Пра гэта вам скажа любы астранаўт.

***— Запалкі на станцыі вы навошта запальвалі?***

— Таксама эксперымент. Крок у нязведанае. Адна піянерка падказала ідэю. На сустрэчы са школьнікамі незадоўга да палёту дзяўчынка раптам пытае: “Таварышы касманаўты, а запалкі ў космасе гараць?” А хто ж яго ведае? Разводзіць агонь на борце катэгарычна забаранялася тэхнікай бяспекі.

Вось і вырашыў паспрабаваць. Чыркнуў — гарыць. Хуліганства, вядома, але чаго не зробіш дзеля навукі. Затое практычны эфект быў вялікі. Пасля гэтай запалкі касманаўты сталі спакойна працаваць на борце з паяльнікам. І грузаабарот паміж Зямлёй і космасам скараціўся на сотні, калі не тысячы кілаграмаў. Замест вельмі цяжкіх блокаў цяпер возяць грамавыя супраціўленні і няспраўнасці ў апаратуры экіпажы ўстараняюць прама на арбіце.

***— Пажар на борце вам таксама ж давялося перажыць?***

— Страшная справа! Небяспечней, чым на падводнай лодцы. Шанцаў на выратаванне ў экіпажа — нуль. Куды ратавацца? Кантакт дзесьці замкнуў, і пайшло-паехала — іскра, полымя… Мы тады з Іванчанкавым не разгубіліся. Дзейнічалі радыкальна, затое эфектыўна: абясточылі частку станцыі і залілі агонь з ручных вогнетушыцеляў.

Дарэчы, у тым жа палёце мы пры знешнім аглядзе выявілі ўвагнутасць на абшыўцы карабля — сантыметраў пяць глыбінёй. Хутчэй за ўсё, метэарыт шарахнуў.

***— Можа, іншапланецяне пажартавалі?***

— Ага, з рагаткі стрэлілі. Не смяшыце. Пусты космас. Вакуум. Што ім там рабіць? Наогул, яны, вядома, існуюць. Цяжка паверыць, што мы адны ў бясконцым Сусвеце. Зразумела, не. Але боўтацца ў космасе проста так — няма сэнсу. Былі іншапланецяне на Зямлі ці не — цяжка сказаць. Быць можа, мы, людзі, самі адтуль?



# Сакрэты нізкіх тэмператур

**14-гадовая брытанка, паміраючы ад рэдкай формы раку, распарадзілася замарозіць сваё цела ў надзеі, што калі-небудзь чалавецтва пераможа смяротныя хваробы і навучыцца вяртаць людзей з ледзянога палону жывымі. У гэтым жаданні яна не адзінокая: у крыясховішчаў, створаных у ЗША і Расіі, ужо некалькі сотняў кліентаў, а спіс жадаючых пераваліў за тысячу. Перспектыва, што ўсім ім удасца здабыць новае жыццё, падманлівая. Тэхналогій, якія даюць магчымасць ажывіць пасля замарозкі нават асобныя органы, не гаворачы пра цэлы арганізм, пакуль няма. Але яны ўжо з'явіліся для тканак і клетак, здольных стаць бясцэнным лякарствам пры многіх захворваннях, і даступныя шырокай публіцы, у тым ліку ў нашай краіне. Напрыклад, у крыябанку Рэспубліканскага навукова-медыцынскага цэнтра "Клетачныя тэхналогіі" пры Інстытуце біяфізікі і клетачнай інжынерыі НАН Беларусі. Што ж і з якой мэтай там можна замарозіць?**

Галоўная асаблівасць гэтага крыябанка ў тым, што ён арыентаваны на захоўванне клетак дарослага чалавека. Бо спецыялізацыя двух іншых банкаў, якія працуюць на базе 9-й клінічнай бальніцы ў Мінску і ў РНПЦ дзіцячай анкалогіі, гематалогіі ды імуналогіі ў Бараўлянах, — ствалавыя клеткі пупавіннай крыві. Матэрыял, які можа спатрэбіцца дзіцяці потым, у працэсе росту і развіцця, атрымліваюць пры родах. І, натуральна, далёка не ва ўсіх была ды і ёсць магчымасць скарыстацца такім шанцам і зрабіць "страхоўку" на будучыню. Таму ў Цэнтры клетачных тэхналогій у Нацыянальнай акадэміі навук узяліся за крыякансервацыю ды індывідуальнае захоўванне ствалавых клетак і фібрабластаў (клетак скуры) менавіта дарослых. Людміла Дубоўская, дырэктар Інстытута біяфізікі і клетачнай інжынерыі, тлумачыць, чаму было вырашана сканцэнтравацца менавіта на гэтым матэрыяле:

— Мезенхімальныя ствалавыя клеткі — універсальнае лякарства, іх можна прымяняць пры цэлым спектры захворванняў. У Беларусі зацверджана ўжо каля 30 новых метадаў лячэння з іх выкарыстаннем — пульманалагічных захворванняў, уключаючы сухоты, гематалагічных, рассеянага склерозу. На падыходзе яшчэ шэраг спосабаў — для стаматалогіі, траўматалогіі, неўралогіі. За два-тры гады яны выйдуць на рынак. У нашым цэнтры, напрыклад, пры дапамозе ствалавых клетак вядзецца тэрапія трафічных язваў. Разам з медыцынскімі арганізацыямі мы распрацоўваем новыя тэхналогіі для лячэння дэфектаў храстковай і касцявой тканкі, дзяснаў і парадонта, язваў рагавіцы вачэй, апёкаў, ран, пролежняў, уралагічных праблем у жанчын. Яны таксама стануць даступныя пацыентам у агляднай будучыні. Фібрабласты адказваюць за стан скуры, а значыць, дапамогуць пазбавіцца ад яе недахопаў — як узроставых, так і тых, што з'явіліся ў выніку траўмаў.

Работы на клетачным узроўні — вельмі складаныя. У іх аснове ляжаць уласныя распрацоўкі інстытута,



*У ЗША кошт выдзялення і крыякансервацыі клетак даходзіць да* **2.000** *доларAў, а іх персаніфікаванае захоўванне абыдзеца ў* **100-150** *долараў у год. У Расіі адпаведна 1.000 і 100 долараў, у Беларусі —* **75 і 40** *долараў*


УЛАДЗІМІР ШЛАПАК

у тым ліку шматгадовы падбор крыяпратэктараў, якія абараняюць клеткі ад магчымых пашкоджанняў у працэсе замарозкі. І калі спачатку крыязахоўванне вялося выключна для навуковых мэт, то з 2014 года, калі быў створаны банк, стала даступнае ўсім жадаючым. Цяпер у ім замарожана больш за мільярд ствалавых клетак. У тым ліку на камерцыйнай аснове — тых пацыентаў, якія праходзілі ў цэнтры лячэнне трафічных язваў. Сярод іх, напрыклад, дама саліднага ўзросту, якая пакутавала на гэтую хваробу больш за 30 гадоў.

— Трэба разумець, што такія язвы — гэта не толькі касметычны дэфект, але і найстрашнейшы боль, які вымушае сядзець на абязбольвальных, што пашкоджваюць печань, ныркі... Мы зрабілі гэтай пацыентцы дзве падсадкі па два мільёны ствалавых клетак — і гэтага аказалася дастаткова. Ужо пасля першай боль зменшыўся, раны пачалі гаіцца, а праз месяц зацягнуліся. На поўнае аднаўленне скуры пайшло паўгода, — дзеліцца вынікамі начальнік вытворчасці біямедыцынскіх клетачных прадуктаў Сяргей Пінчук. — Нашы супрацоўнікі працавалі над тым, каб захаваць кожную клетку і падсадзіць самыя актыўныя, нягледзячы на тое што з узростам гэтая якасць ідзе на змяншэнне.

У выніку пацыентка, якая прыходзіла на прыём з сынам, вырашыла залажыць свае клеткі на персаніфікаванае захоўванне — на выпадак, калі хвароба вернецца. Гэтак жа зрабіў і малады супрацоўнік МНС, якому пасля шматгадовых пакут дапамагла клетачная тэрапія. А першым, хто звярнуўся ў крыябанк, стаў урач, беларус, які працуе ў ЗША. Прыехаўшы ў адпачынак пабачыцца з бацькамі, ён даведаўся пра тое, што ў нас з'явілася крыясховішча, і замарозіў свае клеткі на ўсякі пажарны. Дарэчы, у Амерыцы і Еўропе такая практыка паўсюдная. Яе сэнс яшчэ і ў тым, што чым у маладзейшым узросце зроблены "ўклад", тым больш актыўныя клеткі. І калі ў іх узнікне неабходнасць, не трэба губляць некалькі тыдняў на выдзяленне і нарошчванне "лякарства", што можа быць крытычна, напрыклад, у выпадку траўмаў і апёкаў. Яго атрымліваюць за дзень-два. Важна, што пры лячэнні выключана адрыньванне, бо выкарыстоўваюцца ўласныя клеткі пацыента.

Пры звышнізкіх тэмпературах, у вадкім азоце, захоўваць іх можна практычна бясконца. Эксперыменты ў Інстытуце біяфізікі паказалі, што пасля крыязамарозкі цалкам аднаўляюцца ад 70 да 90 працэнтаў клетак, якія можна затым нарошчваць. Уся гэтая вытворчасць у Цэнтры клетачных тэхналогій сертыфікавана па міжнародным стандарце якасці GMP і выглядае даволі футурыстычна, хоць пазнаёміцца з ёю можна толькі праз невялікае акно ў дзвярах. Справа ў тым, што ва ўсіх памяшканнях, дзе працуюць апаратары цэнтра, падтрымліваецца клас чысціні А, найвышэйшы, і трапляюць туды толькі праз сістэму шлюзаў і ў спецыяльным адзенні. А вось сама працэдура забору матэрыялу ў пацыента простая. Для атрымання фібрабластаў патрэбны кавалачак скуры ў некалькі міліметраў, які хірург бярэ пад абязбольваннем — з унутранага боку перадплечча ці бядра, вобласці каля пупка ці за вухам... Ствалавыя клеткі атрымліваюць з тлушчавай тканкі: патрэбныя 2-5 мл "здабываюць" метадам ліпааспірацыі пры дапамозе спецыяльнай трубкі-канюлі з мінімумам дыскамфорту.

Не выключана, што ўжо хутка гэтыя маніпуляцыі стануць для нас такімі ж прывычнымі, як і прышчэпкі, якія мы таксама робім для таго, каб пазбегнуць захворванняў. І гэтаму толькі паспрыяе запланаваны ў нас бурны рост клетачных тэхналогій, накіраваных на захаванне здароўя і прыгажосці.

Юлія **Васільева**

## Дарэчы

**У эмбрыёна адна ствалавая клетка на 10 тысяч звычайных, а ў 70-гадовага чалавека — адна на 8 мільёнаў. Таму ў пажылых выдзеліць і нарасціць іх неабходную для лячэння колькасць значна складаней.**

# Абрысы надзейнай абароны

**Парадокс апошніх дзесяцігоддзяў: свет усё больш адкрыты — значнасць жа граніц узрастае з кожным днём. Не проста як фактар стабільнасці. Як залог самой дзяржаўнасці.**

Прэзідэнт, назначаючы ў канцы мінулага года новага кіраўніка Дзяржпагранкамітэта, адразу ж выразна даў зразумець: паўнацэнная работа неабходная адразу. Без перыяду разварушвання і ўваходжання на пасаду.

Да гэтага пытання Аляксандр Лукашэнка вярнуўся пры зацвярджэнні рашэння на ахову Дзяржаўнай граніцы Беларусі органамі пагранічнай службы ў 2017 годзе.

І матыў усё той жа:

— Такая ўвага пагранічным пытанням удзяляецца нездарма. Няпростая міжнародная абстаноўка, узрастанне тэрарыстычнай небяспекі ў свеце, незаконная міграцыя, распаўсюджванне наркотыкаў, зброі прымушаюць бесперапынна павышаць узровень абароны нашых граніц.



ПАВЕЛ ЧУЙКО

## Даслоўна

**Аляксандр Лукашэнка:**

*— Нядаўна мы адмянілі візы для грамадзян 80 дзяржаў, калі яны прыбываюць праз Нацыянальны аэрапорт і на тэрмін да 5 сутак. Дакумент распрацоўваўся паўтара года і быў дасканала выверваны ўсімі дзяржаўнымі органамі — у першую чаргу з пункту гледжання ўзнікнення якой-небудзь рызыкі. Аднак цяпер у прэсе пачала з'яўляцца інфармацыя, што, маўляў, гэта небяспечна для нашай краіны і для саюзнай Расіі, з якой у нас адкрытая граніца. Часам знаёмішся з заўвагамі такіх аўтараў і дзіву даешся. Гэта людзі, якія не разумеюць сутнасці або ж спецыяльна нагнятаюць абстаноўку. Хутчэй за ўсё, спецыяльна. Адмена віз не азначае адмены пагранічнага кантролю. Як ён быў, так і застаецца!*

Пакуль не прыходзіцца разлічваць на тое, што ў бліжэйшы час пагроз пагранічнай бяспекі стане менш.

Зрэшты, краіна традыцыйна порах трымае сухім. Уводзяцца ў строй сучасныя комплексы пагранічных застаў і пастоў. Планамерна абсталююцца інжынерныя загароды і рубяжы аховы. Няхай не так хутка, як хацелася б, але куды актыўней вядзецца дэмаркацыя паўднёвай граніцы. Частку матэрыяльна-тэхнічных сродкаў — праўда, пакуль вельмі нязначную — удаецца атрымаць па лініі міжнароднага супрацоўніцтва з Еўрасаюзам.

Вынікі ў наяўнасці. Амаль напалову знізілася колькасць парушальнікаў граніцы, нелегальных мігрантаў, выпадкаў перамяшчэння праз "зялёную граніцу" ў краіну наркотыкаў ды іншых незаконных тавараў. Але Аляксандр Лукашэнка схільны ўспрымаць усё гэта крытычна:

— Хацелася б верыць, што колькасць гэтых парушэнняў менавіта зніжаецца, а не выпадае з поля зроку пагранічнікаў.

Як вынікае са слоў старшыні Дзяржпагранкамітэта Анатоля Лапо, у аснове пазітыўнай статыстыкі — менавіта прафесіяналізм пагранслужбы:

— Лепш працуем. Сваю ролю адыгрываюць і прафілактыка, і новыя сігнальныя комплексы на граніцы.

— У цэлым якіх-небудзь сістэмных праблем або правалаў у дзейнасці ДПК летась дапушчана не было, — пацвердзіў Дзяржаўны сакратар Савета Бяспекі Станіслаў Зась. — Ведамствам праведзена вялікая работа па ўмацаванні бяспекі нашых граніц.

Прэзідэнт рашэнне на ахову дзяржграніцы ў 2017 годзе зацвердзіў. І асобна закрануў тэму стварэння ў краіне цэнтраў часовага ўтрымання мігрантаў. Прычына — нагнятанне асобнымі СМІ істэрыі пра ледзь не пераўтварэнне Беларусі ў нейкі "адстойнік". Аляксандр Лукашэнка адрэагаваў дакладна і адназначна:

— Ніякага "адстойніка" ў Беларусі быць не павінна. Нам чужыя мігранты не патрэбныя. Калі нехта ў гэтым зацікаўлены, то грошы павінны вылучацца не толькі пад стварэнне такіх пунктаў і пасяленчаў для незаконных мігрантаў, але і на далейшую іх экстрадыцыю. Таму, пакуль мы далёка ў гэтым плане не зайшлі, калі ёсць нейкая небяспека, мы павінны неадкладна прыпыніць такія працэсы. Калі гэта неабходна.

Уладзімір **Якаўлеў**

## Даведка

### Не прайшлі

**■ У 2016 годзе затрыманы 69 арганізатараў і супольнікаў, якія займаюцца незаконнай транзітнай міграцыяй. Выяўлена больш за 5 тысяч патэнцыйных незаконных мігрантаў. А таксама 65 асобаў, якія знаходзіліся ў вышуку. У цэлым колькасць парушэнняў пагранічнага заканадаўства ў параўнанні з 2015 годам знізілася на 17,6 працэнта.**



УЛАДЗІМІР КОЗАРАЎ

## Маршруты, дзе не патрэбна віза

**Гродна без віз упершыню наведалі госці з ЗША, Ірландыі і Македоніі. Геаграфія турыстаў пашыраецца: з пачатку дзеяння бязвізавага рэжыму для замежных грамадзян, якія наведваюць парк "Аўгустоўскі канал" з прылеглымі тэрыторыямі, сюды прыбылі турысты з 21 краіны. Усяго па спецыяльным дазвольным дакуменце ўжо пабывала каля дзвюх тысяч замежнікаў, а зарэгістравалася на ўезд значна больш.**

Таццяна Лідзяева, намеснік начальніка ўпраўлення спорту і турызму Гродзенскага аблвыканкама, расказвае: "У турыстаў папулярныя Стары і Новы замкі, музеі. А польскія групы з задавальненнем наведваюць Дом-музей Элізы Ажэшкі. Акрамя экскурсій, прыезджыя любяць пешыя прагулкі па гістарычным цэнтры горада. Моладзі спадабаліся гродзенскія клубы — там кіпіць начное жыццё. У сталых людзей запатрабаваны мясцовыя аграсядзібы".

Нагадаем, магчымасць без віз наведваць тэрыторыю спецыяльнага турысцка-рэкрэацыйнага парку "Аўгустоўскі канал" у турыстаў з'явілася з канца кастрычніка. У парку і ў прылеглых населеных пунктах Гожскага, Копцеўскага, Адэльскага, Падлабенскага, Сапоцкінскага сельсаветаў Гродзенскага раёна, а таксама ў Гродне можна знаходзіцца да 5 сутак.


ЮРЫЙ МАЗАЛЕЎСКІ

# Эксперты задаволены

## У Мінску прагучала кампетэнтнае меркаванне: Беларусь узводзіць сваю першую АЭС па вышэйшых стандартах бяспекі

Такую выснову зрабіла аўтарытэтная каманда экспертаў МАГАТЭ, падчас так званай SEED-місіі дасканала вывучыўшы пытанне пра магчымае ўздзеянне навакольнага асяроддзя на атамную электрастанцыю, якая будуецца пад Астраўцом. Прасцей кажучы, гаворка ішла пра магчымасці АЭС супрацьстаяць самым неверагодным знешнім катаклізмам ды іншым НЗ.

Гжэгаж Ржэнтоўскі, кіраўнік дэпартамента па ядзернай бяспецы МАГАТЭ, выказаўся наконт гэтага цалкам зразумела:

— Мы прыйшлі да высновы, што праект Беларускай АЭС улічвае пытанні знешняга ўздзеяння і пытанні бяспекі. Распачаты захады, каб у выпадку неабходнасці прадухіліць развіццё сітуацыі па найгоршым сцэнарыі з тых, якія можна дапусціць. Мы таксама правялі дыскусію па пытаннях забеспячэння бяспекі з улікам урокаў аварыі на "Фукусіме". Адкрыты і добразычлівы падыход беларускага боку дазволіў нам паспяхова правесці гэтую місію.



Такая ацэнка вельмі важная. Бо МАГАТЭ — вядучае агенцтва свету ў галіне развіцця атамнай энергетыкі. Вось чаму Беларусь ледзь не з першых дзён, прыняўшы рашэнне пра будаўніцтва АЭС, звярае з яго стандартамі практычна кожны крок. У гэтыя ж дні, напрыклад, непасрэдна на будпляцоўцы яшчэ адна міжнародная каманда правяла семінар па пытаннях абыходжання з ужо адпрацаваным палівам і радыеактыўнымі адходамі. Усё гэта дало магчымасць Міністру энергетыкі Уладзіміру Патупчыку запэўніць гасцей:

— Беларусь прыняла рашэнне аб развіцці атамнай энергетыкі і будаўніцтве АЭС у поўнай адпаведнасці са сваімі міжнароднымі абавязацельствамі. Сёння на ўсіх аб'ектах станцыі ідуць поўнамаштабныя работы. Хачу падкрэсліць: яны здзяйсняюцца па стандартах МАГАТЭ з прыцягненнем яе кансультантаў і экспертаў.

Сёлета, паводле дадзеных МЭС, у нас будзе працаваць, прынамсі, яшчэ адна місія МАГАТЭ. Цяпер на будпляцоўцы непадалёк ад Астраўца рыхтуюцца да прыёмкі корпуса рэактара, галоўных цыркуляцыйных помп ды іншага асноўнага абсталявання, за гэтым у бліжэйшы час будзе ажыццяўляцца мантаж першага энергаблока.

І ніхто больш чым мы не зацікаўлены ў тым, каб усё было зроблена без сучка і задзірынкі, надзейна і бяспечна, на многія дзясяткі гадоў.

Уладзімір **Якаўлеў**

# Пластык куды зручнейшы

## Развіццё безнаяўных плацяжоў — задача стратэгічная

На руках у насельніцтва каля 12,7 мільёна банкаўскіх плацежных картак. Папулярнасць разлікаў з дапамогай пластыку расце: калі на пачатак 2010 года крыху больш за палову ўсіх аперацый былі звязаны са зняццем наяўных грошай, то цяпер толькі каля 20 працэнтаў. Праўда, па суме здыманне наяўных грошай па-ранейшаму займае большую долю, чым беспапяровыя плацяжы, але прагрэс ёсць. За шэсць з паловай гадоў удзельная вага сумы наяўных грошай аперацый знізілася з 86,9 да 63,2 працэнта. Эксперт Цэнтра эканамічных даследаванняў Верас Анастасія Лузгіна тлумачыць:

— Адна з важнейшых умоў папулярызацыі безнаяўных плацяжоў — стварэнне развітой інфраструктуры. У нас, як і ва ўсім свеце, асноўная частка наяўных аперацый ідзе менавіта за кошт насельніцтва. Людзі не заўсёды ахвотна прымаюць новыя аплатныя інструменты. Таму важна ствараць асяроддзе, у якім расплачвацца безнаяўным шляхам будзе камфортна.

Цяпер на 240 тысяч зарэгістраваных касавых апаратаў прыпадае каля 137 тысяч тэрміналаў. Аднак лічба будзе расці. Ужо сёлета для юрыдычных асобаў канчаюцца тэрміны падключэння тэрмінальнага абсталявання. З 1 красавіка — у гарадах абласнога падпарадкавання і Мінску, з 1 ліпеня — у гарадах раённага падпарадкавання, з 1 кастрычніка — на ўсёй тэрыторыі краіны. У індывідуальных прадпрымальнікаў больш часу: 1 лютага 2018-га дэдлайн наступае ў гарадах абласнога падпарадкавання і Мінску, з 1 мая 2018-га — у гарадах раённага падпарадкавання і з 1 жніўня — па ўсёй краіне. За невыкананне патрабаванняў заканадаўства бізнес будуць штрафаваць: юрыдычных асобаў — на суму ад 10 да 200 базавых велічынь (ад 230 да 4600 рублёў), для індывідуальных прадпрымальнікаў — да 100 базавых (да 2300 рублёў).

Яшчэ адзін важны нюанс: згодна з патрабаваннямі Нацбанка, з гэтага года банкі перастануць падключаць абсталяванне, якое не падтрымлівае бескантактавы спосаб аплаты. Праўда, гаворка ідзе толькі пра новыя тэрміналы, ранейшыя ўстройствы замяняць неабавязкова. Бескантактавы пластык у нас выпускаюць ужо некалькі гадоў — каб здзейсніць аплату, дастаткова проста паднесці картку да тэрмінала. Справа пары секунд. Картак, якія даюць магчымасць скарыстацца такім спосабам плацяжу, у нас каля 1,67 мільёна. Аднак прыём плацяжоў бескантактавым шляхам падтрымлівае толькі 25 тысяч аплатных тэрміналаў. Анастасія Лузгіна адзначае:

— Нацыянальны банк праводзіць паслядоўную палітыку адносна развіцця безнаяўных плацяжоў. Аснашчэнне гандлю і сферы паслуг тэрміналамі — слушны напрамак. Бо калі чалавек ведае, што ён у любым месцы зможа расплаціцца карткай, у яго менш стымулаў здымаць наяўныя грошы. За апошнія гады мы ў гэтым плане прайшлі вялікі шлях, але нам ёсць над чым працаваць: напрыклад, забяспечыць прыём картак у аўтаматах з ежай і напоямі, каб нават за дробныя пакупкі можна было разлічыцца пластыкам.

Валерыя **Гаўрушава**





Беларусы Яўген Няўгень і Сяргей Ганчар — распрацоўшчыкі дадатку MSQRD — патрапілі ў рэйтынг “30 да 30” за 2017 год, які склаў часопіс Forbes

# У рэйтынгу апынуліся нездарма

Выданне тлумачыць свой выбар так: “Калі Facebook хацела дагнаць Snapchat, яна звярнулася да двух прадпрымальнікаў з Беларусі. Няўгень і Ганчар стварылі MSQRD — дадатак, які дадае незвычайныя фільтры на вашы сэлфі. Пасля таго як дадатак быў падхоплены ў ЗША, Facebook купіла MSQRD за невядомую суму ў сакавіку 2016 года”.

У гэтым рэйтынгу знакамітага часопіса — 600 самых яркіх маладых прадпрымальнікаў і наватараў. Словам, тых, хто мяняе правілы гульні. 75 працэнтаў спіса — жыхары ЗША. Прадпрымальнікі з Беларусі згадваюцца ў спісе лепшых у катэгорыі “Спажывецкія тэхналогіі”. Дарэчы, гэтай зімой часопіс Software Magazine — адно з самых уплывовых выданняў сусветнай IT-індустрыі — таксама апублікаваў свой рэйтынг — Software 500. Дык вось, дзесяць буйнейшых сусветных распрацоўшчыкаў праграмнага забеспячэння, якія ўваходзяць у яго, маюць даччыныя структуры ў беларускім Парку высокіх тэхналогій.

Дарэчы, такі прарыў нашых распрацоўшчыкаў уражвае. І цалкам можа стаць далёка не адзіным. Пад заслону мінулага года беларускія праграмісты прадставілі свету яшчэ адзін новы дадатак — пад назвай Fabby. Ён абяцае пакарыць сэрцы мільёнаў карыстальнікаў сацсетак не горш за MSQRD. У Fabby пры дапамозе нейрасетак можна “ажыўляць” сэлфі, замяняючы фон фотаздымка. Сярод варыянтаў фону шмат навагодніх стылізацый. На выбар карыстальнікаў прапаноўваюцца 28 фантастычных варыянтаў фону, 11 з іх анімаваныя.

Максім **Восіпаў**

## Язда з падзарадкай

**Выпрабаванні беларускага электрамабіля пройдуць да канца гэтага года**

Адзін з беларускіх інстытутаў цяпер актыўна працуе над праектам. Беларускую электрычную распрацоўку будуць выкарыстоўваць на аснове аўтамабіля “Белджы”. Ужо да восені павінны атрымаць прататып і правесці выпрабаванні ў Беларусі. “Спадзяюся, да канца 2017 года будзе вынік у гэтым напрамку”, — сказаў галоўны навуковы сакратар Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі прафесар Аляксандр Кільчэўскі.

Развіццё новых навуковых напрамкаў, у тым ліку ў галіне распрацоўкі беларускіх электрамабіляў, стане больш даступным, калі ўвядуць у эксплуатацыю БелАЭС.

“Для Беларусі гэта знакавая падзея. Адна з задач Акадэміі навук — гэта яе навуковае забеспячэнне. Толькі ўявіце, пасля запуску БелАЭС прыкладна напалову ўзрасце забяспечанасць краіны электраэнергіяй. Гэта значыць, што можна будзе выкарыстоўваць таннейшую электраэнергію. Напрыклад, хутка мы пачнём распрацоўку аднаго з першых у Беларусі дамоў, які будзе практычна цалкам функцыянаваць за кошт электрычнасці. З аднаго боку, гэта эканомія газу, з другога — не трэба будаваць цеплатрасы і іншае”, — расказаў навуковец.






# “У яе было вялікае шчырае сэрца”

**Беларусцы з палескай вёскі Лактышы Ульяне Дрозд, якая ў 30-х гадах разам з мужам і дзецьмі пераехала ў далёкі аргенцінскі горад Бярыса, пісьменнік Анібал Гуараглія прысвяціў апавяданне**

У вёсцы Лактышы ў Ганцавіцкім раёне Брэсцкай вобласці я апынулася не выпадкова. Прыехала па заданні рэдакцыі: пісаць артыкул пра традыцыйнае свята вёскі, якое праходзіць там ужо каля 10 гадоў, восенню. Пазнаёмілася з мясцовымі жыхарамі, слухала іх гісторыі. Многія скардзіліся: ад'язджае з Лактышоў моладзь. “Не хапае на ўсіх працы”, — разводзяць рукамі бабулі і дзядулі. Расказвалі вяскоўцы і мясцовыя навіны: нядаўна да лактышанскіх Сергіеняў прыязджалі сваякі з Аргенціны, а ў загадчыка клуба Аляксандра Матусевіча знайшлася траюрадная пляменніца ў гэтай далёкай заакіянскай краіне.

Сам Аляксандр Матусевіч пацвярджае: “У прадзеда Івана было шасцёра дзяцей: Пракоп, Пётр, Аляксандр (мой дзед), Кацярына, Анастасія, Ульяна. Адна з сясцёр, Ульяна,



Траюрадны пляменнік Ульяны Дрозд з беларускай вёскі Лактышы Аляксандр Матусевіч

пайшла за Платона Дразда. Той жа родам быў з суседняй вёскі. У Лактышах жыў у прымах (у сям'і жонкі). Памятаю, бабуля расказвала: жылося ў вёсцы ой як нялёгка. А ў Драздоў і хаты сваёй не было, хварэлі дзеці, двое, хлопчык і дзяўчынка, памерлі. У той час ездзілі па Заходняй Беларусі вярбоўшчыкі, клікалі ў Амерыку, абяцалі землі, грошы, шчаслівую будучыню. Ад голаду й галечы з некаторымі іншымі лактышоўцамі паехалі ў Аргенціну і Драздоў".

Вярнуўшыся ў Мінск, я спісалася з роднымі Аляксандра Матусевіча ў Аргенціне праз сацыяльныя сеткі. У іх дачкі Юліі — аж пяць унукаў, у сына Івана — чацвёра, у Аляксандра — двое. Дарэчы, адна з праўнучак Ульяны і Платона, Марыліна Дрозд, і шукала сваякоў у Лактышах…

А праз некаторы час на сувязь са мной выйшаў пісьменнік з гэтай краіны Анібал Гуараглія. Ён паведаміў, што добра ведаў Ульяну і Платона Драздоў. Дом яго бацькоў размяшчаўся па суседстве. "Гэта былі вельмі добрыя людзі, ад іх я даведаўся шмат цікавых рэчаў. Напрыклад, што такое салёныя агуркі з кропам. Платон Дрозд, пераехаўшы ў Аргенціну, уладкаваўся на працу ў кампанію Armour, якая займаецца пастаўкамі мяса ў Еўропу. Там жа працавала і яго жонка Ульяна. Некаторы час Дразды арандавалі дом, пакуль не купілі зямлю і не пабудавалі ўласны. Памятаю, мой бацька паказваў суседу, як тынкаваць сцены… Платон быў вельмі "хваткі" і хутка ўсяму вучыўся. Гэта быў выдатны цясляр. І ў вольны час ён майстраваў… скрыпкі. Ульяна Дрозд таксама заўсёды шмат працавала: у садзе і ў доме, разводзіла курэй і гусей. Я не памятаю, калі б яна сядзела без справы. А яшчэ — у сапраўдных драўляных бочках яна саліла гуркі і капусту. Часта частавала нас гэтымі незвычайнымі кулінарнымі вынаходствамі. Яна заўсёды хацела вярнуцца ў Беларусь і пабываць на магілах дзяцей, але ёй так і не ўдалося гэта зрабіць… Ведаю, што яе праўнук Хуга (ад сына Івана) збіраецца паехаць на радзіму прабабулі, пакланіцца зямлі… Мая суседка была вельмі добрай. Мы гаворым пра такіх людзей: мела вялікае шчырае сэрца. Ульяна часта спявала песні на рускай і беларускай мовах. А я слухаў і слухаў яе. Я вельмі яе любіў!"

Неўзабаве пасля такога кранальнага ліста Анібал Гуараглія даслаў у рэдакцыю апавяданне, галоўнай гераіняй якога стала беларуска Ульяна Дрозд. Аўтар просіць чытачоў часопіса "Беларусь" не судзіць строга, бо ён апісвае сваю былую суседку, імігрантку з невядомай яму краіны, па сваіх дзіцячых успамінах.

Кацярына **Мядзведская**

*Палеская вёска Лактышы ў Ганцавіцкім раёне Брэсцкай вобласці даволі каларытная. Размяшчаецца ў акружэнні ракі Лань і яе прытоку Начы. Вёска гэтая вядомая яшчэ з XVI стагоддзя як паселішча ў Навагародскім ваяводстве Вялікага Княства Літоўскага. У 1977 годзе там было створана вадасховішча Лактышы. І сёння, як, зрэшты, і гадоў 100 і 200 назад, там — сапраўдны рай для рыбакоў. Паводле слоў мясцовых рачных заўсёднікаў, водзіцца ў гэтых месцах больш за 30 розных відаў рыб. Трапляюцца і карп, і таўсталобік, і шчупак. Не гаворачы ўжо пра карасёў, акунёў ды падлешчыкаў…*

*Сёння ў вёсцы каля 400 двароў. Вядома, далёка не ўсе жылыя… Затое ў апошні час апусцелыя домікі ахвотна купляюць дачнікі. Адпачынак праводзяць там мінчане, пінчане, брастаўчане… На месцы пакрыўленых хатак узводзяць сапраўдныя палацы — катэджы, а замест агародаў — цяпер газоны… і туі па перыметры*





# Бабуля



Дачка Ульяны Дрозд Юлія з сынам

Калі я быў маленькім, было толькі сучаснае і мінулае, будучыня не значыла нічога. Тады я пазнаёміўся з ёю, маршчыністай бабулькай невялікага росту, з сівымі валасамі. Яна павольна перасоўвалася і адгукалася на імя “Баба”.

Яна дрэнна гаварыла па-іспанску. Я таксама, так што мы выдатна разумелі адзін аднаго.

З часам яе вобраз у маёй свядомасці стаў знікаць, і я пачаў задумвацца над тым, што ўсё беззваротна сыходзіць. Я больш ніколі яе бачыў.

З Бабай я адкрыў для сябе асалоду ад смачнай ежы і вытанчаных водараў. Яна гаварыла мала, лічыла за лепшае рабіць. Калі яна хавала талеркі чорнага колеру ў скрынку, выдаваліся ні з чым непараўнальныя гукі. Яна мяне не павучала, яна мяне вучыла атрымліваць асалоду.

Не было нічога мякчэйшага за яе падушкі.

Я быў шчаслівы тады.

Раніцай, яшчэ лежачы ў пасцелі пад коўдрай, я чуў скрозь сцяну скрып дзвярэй і разумеў, што яна ўжо ўстала. Скрозь сон уяўляў: цяпер яна стукне вобземлю сваёй палкай з жалезным наканечнікам і пойдзе саліць агуркі, затым пакорміць курэй, гусей, збярэ яйкі...

Пасля абуджэння я хутка снедаў і ўпрошваў маці адпусціць мяне пайсці да маёй суседкі.

Кожны новы год я нязменна чуў яе ціхі голас: “Анібел” (мяне завуць Анібал). Я пераводзіў вочы на месца, адкуль, як мне падавалася, даносіўся яе голас, і бачыў, як з-за краю сцяны, якая і цяпер падзяляе нашы дамы, з’яўляўся вялікі кавалак куліча на яе незвычайных руках.

Часам у мяне з’яўлялася задзірына на пальцы, і тады яна, разрэзаўшы нажом нейкую зялёную расліну з жэлепадобным змесцівам унутры (альяс?), што расла ў яе садзе, прымотвала яе бінтам да майго запаленага пальца, і на наступны дзень усё было ў парадку.

Калі мой бацька бачыў, як яна спрабуе залезці на лесвіцу, каб падрэзаць вінаград, асцерагаючыся, што можа ўпасці, пачынаў яе ўмаляць не рабіць гэтага і дазволіць яму зрабіць гэтую працу, толькі пасля доўгіх просьб яна пагаджалася. Зрабіўшы працу, яна прасіла майго бацьку паспрабаваць яе салёныя агуркі ды іншыя разнасолы, а таксама выпіць дзве-тры чаркі гарэлкі, ці інакш Баба пакрыўдзіцца.

Калі я зразумеў, што існуе нешта пад назвай час, я тут жа пасталеў. У сваю чаргу, Баба станавілася ўсё больш маленькага росту і ўсё павольней пачынала перасоўвацца. Але не пераставала працаваць. Я памятаю, як яна апрацоўвала зямлю, абапіраючыся на палку.

Яна была непісьменнай і так і не навучылася добра гаварыць па-іспанску, можа быць, таму захавала ўсё, што я страціў.

Без майго асаблівага жадання мае бацькі аддалі мяне ў школу. Я памятаю мой першы дзень у школе. Мае валасы былі ўложаны брыльянцінам, на нагах былі гольфы, у руках стары скураны партфель. Так я ператварыўся ў вучня.

Я пачаў вучыцца.

Мне расказалі, што Баба была вельмі старой жанчынай і што яе называлі так, бо на рускай мове менавіта так называюць пажылых жанчын. Я таксама даведаўся, што самым цудоўным месцам у яе доме была кухня, што падушкі ў яе доме былі набіты гусінымі пёрамі, што гукі, якія мне так падабаліся, называліся музыкай і што чорныя талеркі называліся пласцінкамі, а скрыня — прайгравальнікам. Я таксама даведаўся, якія бываюць прысмакі і што ў колераў ёсць імёны: сіні, чырвоны, жоўты...

Усё змянілася.

Кожны раз у мяне ўсё менш атрымлівалася бываць у доме ў маёй суседкі: на заняткі ў школе і дамашнія заданні ішоў увесь мой час.

Тым не менш, я павінен прызнаць, што ў школе я даведаўся шмат цікавых рэчаў: што краіны неабходныя, каб падзяляць людзей па месцы іх нараджэння, што ёсць расы, каб адрозніваць людзей у залежнасці ад колеру скуры. Таксама я даведаўся, дзе знаходзіцца поўнач багатых і поўдзень бедных, што такое “сапраўдная” рэлігія, якія пачуцці я мог паказваць і якія павінен быў утойваць. Я навучыўся стаяць у страі, трымаць дыстанцыю, дзяліць, аднімаць, спяваць гімн, маўчаць, не бегаць на пераменах і многаму іншаму.

У адзін пахмурны зімовы поўдзень я вярнуўся са школы і ўбачыў, што мая маці плача. Я атрымаў яшчэ адзін важны жыццёвы ўрок. Маці абняла мяне і сказала: “Сынок, я павінна паведаміць табе сумную вестку...”

Прайшло шмат гадоў, але ўрок, які пастаралася мне даць мая маці ў той дзень, я так і не змог засвоіць. Гледзячы праз сцяну, што аддзяляе нашы дамы і што раней мне падавалася такой высокай, я працягваю бачыць Бабу, якая павольна перасоўваецца дробнай хадой і раніцай, пакуль я ў школе, ідзе у свой сад, адразае кавалачак той самай расліны і з яе дапамогай не толькі пазбаўляе мяне ад задзірыны на пальцы, але і сябе ад смерці.

Анібал **Гуараглія**



ВАДЗІМ КАНДРАШОЎ

# Крылы для палёту, альбо Шлях да прафесіі

**Жыццёвая гісторыя пра тое, як дарослы сын маёй спадарожніцы знайшоў сябе. Яна можа быць карысная для ўсіх тых бацькоў, якім хацелася б захаваць сяброўства са сваімі дзецьмі на доўгія гады**

Цягнік мерна пастукваў коламі. За акном палі мяняліся лясамі і пералескамі. Сонца хілілася да захаду. І абрысы мігатлівых узгоркаў і дрэў набывалі нейкую графічную выразнасць. Люблю гэты час, калі, падаецца, дзень, які адпрацаваў сам сябе, ужо гатовы адпачыць. Не раз даводзілася і мне назіраць, як буйныя вятры пад вечар сціхаюць, уся прырода нібы супакойваецца. Заўважала таксама: у гэты час сутак святло асаблівае — добра фатаграфаваць. І размаўляць з тымі, хто да душы. Ды яшчэ ў цягніку з выпадковым спадарожнікам, які можа сыграць ролю душапрыказчыка. Яму лёгка ўсё пра сябе расказаць, таму што больш не сустрэнемся. Феномен гэты вядомы.

Светла і камфортна было ў той дзень у нашым паўпустым плацкартным вагоне хуткага фірменнага цягніка, які накіроўваўся ў Сімферопаль. Быў месяц май. Мы з мужам, які адразу ж заснуў на верхняй паліцы, ехалі да сяброў у Севастопаль, у адпачынак. Народ падабраўся ціхі: хто спаў, хто чай піў, пастукваючы лыжачкамі аб сценкі шклянак. Піла і я, гледзячы ў акно, і ў які раз адзначала для сябе: да чаго ж люблю піць чай у цягніку. Ды яшчэ са шклянкі ў падшклянку, няхай сабе і пакетаваны. Ёсць у гэтым дарожным рытуале нешта магічнае, асабліва калі наперадзе цябе чакае адпачынак у Крыме, дзе пах Чорнага мора, асабліва ў Севастопалі, на паўночным баку, непараўнальны ні з якімі іншымі марскімі водарамі.

У Гомелі мая адзінота была парушана: увайшла маладжавая дама ў бэжавых джынсах і белай майцы, кіўнула мне і размясцілася на ніжняй паліцы насупраць. Чытаючы кнігу, я краёчкам вока назірала за яе рухамі. Яны былі спакойнымі і ўпэўненымі: так, па-мойму, паводзяць сябе людзі, якія адбыліся ў жыцці і ў прафесіі. Цікава, хто яна, падумалася. У галаве круцілася: падаецца, актрыса… Твар быў знаёмы. Годнасць, з якой тая трымалася, умацоўвала ў думцы: яна не стане ладзіць са мною гутарку, і я буду атрымліваць асалоду ад чытання. Потым дама піла чай, уткнуўшыся ў планшэт, як мне

здалося на першы погляд, паглыбілася ў гульнявыя дадаткі. Але потым я зразумела: думкі яе былі далёка… У нейкі момант нашы погляды сустрэліся — і, о, багі, у яе зеленаватых вачах, у кожнай маршчынцы ззяла такое шчасце, што я не ўтрымалася і загаварыла, зрабіўшы сваёй візаві камплімент. І ўспомніўшы, з якога яна тэатра, сказала: ды вы проста свеціцеся ад шчасця, не гаворачы ўжо пра тое, што цудоўна выглядаеце…

*— Добра выглядаць і ў жыцці, і на сцэне — мая работа, — яна зразумела, што я яе пазнала. — У мяне сапраўды ўсё цудоўна!*

Заўважыўшы мой погляд, які зачапіўся на айпадзе, сказала:

*— Сын падарыў. Яму вельмі хацелася выказаць сваю падзяку.*

***Дзеці — люстэркі нашых пачуццяў, думак, учынкаў. Як важна не перашкаджаць ім рабіць правільны выбар у прафесіі. У жыцці, нарэшце. І дапамагаць шукаць свае, і толькі свае “гаджэты”, каб раскрыць свае і толькі свае таленты***

Я здзіўлена падняла брыво.

*— Не-не, вы няправільна мяне зразумелі, “дзякуй” ён гаворыць заўсёды, але каб так… Хочаце, раскажу?..*

Я пагадзілася, аб чым ні на хвіліну потым не пашкадавала.

У гэтай гісторыі імёны выдуманыя, бо людзі, пра якіх ідзе размова, мае сучаснікі. Ды і суразмоўніца, вядомая ў Беларусі актрыса, пазнаўшы ўва мне журналіста, які піша пра акцёраў, папрасіла: калі раптам мне калі-небудзь захочацца абнародаваць яе аповед, устрымацца ад сапраўдных імёнаў. І мякка дадала: ведаю я вас, журналістаў…

Ганна, назавём яе так, была выдатнай расказчыцай. Пачала яна здалёк.

*— ...Як і многія дзеці, Мішка рос дзіцем таленавітым. Ён маляваў, ляпіў, па дрэве выпальваў, выдатна дэкламаваў ужо ў тры гады, любіў тэатр і кіно. Былі і скачкі ў ваду з дзесяціметровай вышыні, і плаванне. Сам выбіраў віды спорту. І фехтаваў падлеткам, і на спартыўным веласіпедзе ганяў, і штангу паднімаў. Гітару асвоіў самастойна… А ў школе з мастацкім ухілам, дзе вучыўся, маляваў так добра, што мог бы стаць мастаком. А потым нечакана, калі арганізавалі ваенны клас, ён туды перайшоў. У сувязі з чым мы з мужам успаміналі не раз, якія ён ваенныя баталіі яшчэ ў пяцігадовым узросце маляваў. То былі цэлыя палотны ваенных дзеянняў. Калі я пытала, што гэта, сын адказваў: вайнушка…*

*Адкуль, чаму раптам вайна? Няўжо праз гены дзеда-франтавіка нешта перадалося? Напэўна, так і ёсць, хоць гэта зразумець цяжка. Яшчэ вельмі доўга Мішку сніўся адзін і той жа сон, які не даваў спакою яму з малых гадоў. Ён часта прачынаўся з крыкам: мама, баюся вайны. І доўга не мог супакоіцца. Я, суцяшаючы яго, пераконвала: вайны не будзе, сынок. Калі ён вырас, то расказаў, як часта сніўся яму малады салдат з вусамі колеру пшаніцы, і быў то як бы ён сам, а потым быў асляпляльны выбух, ад чаго сын прачынаўся… Вось так тая жудасная Вялікая Айчынная, відаць, праз гены закранула і нашых дзяцей. Бо мой бацька незадоўга да канца вайны быў цяжка паранены: прамое пападанне снарада ў штаб дывізіі. Як расказваў, быў наймагутны выбух, які яго асляпіў…*

*У турпаходы Мішка з сябрамі хадзіў, пачынаючы са старэйшых класаў, спяваў ля кастра пад гітару. Барытон у яго прыгожы, аксамітны… Акцёр з яго атрымаўся б цудоўны. Гэта я цяпер разумею… Але ў тыя гады мне вельмі не хацелася, каб тэатр стаў яго прафесіяй, бо выдатных сярод нас не так ужо і шмат. Мысленна моцна супраціўлялася, баючыся, што сын лёгка паступіць у тэатральны інстытут. А на словах гаварыла: вырашай сам. Імкнулася ў яго вачах падавацца сучаснай, разумнай маці. У дні летніх канікул, калі сын у дзясяты клас перайшоў, паехалі мы да маіх бацькоў ва Украіну. І Мішка з намі. Аднойчы прыйшоў дадому з кнігай пра таямніцы мозга. Бацька мой нябожчык, які душы не чуў ва ўнуку, убачыўшы тую кнігу, сказаў: ну вось, Міха, урачом станеш, дзеда лячыць будзеш…*

*Лячыць бацьку не давялося, ён пайшоў з жыцця, калі Мішка вучыўся на першым курсе мёдінстытута. Як жа дзед ганарыўся ўнукам, калі той паступіў! Часам я думала, што сын пайшоў у медыцыну дзеля дзеда, якога таксама вельмі*



*любіў. Так-так, мне так хацелася думаць, каб пазбавіцца ад пачуцця віны перад сынам…*

Ганна хвалявалася. Часам паўзы ў яе аповедзе зацягваліся, але я ні пра што яе не пытала: пытанні маглі парушыць музыку апавядання, у якую пачалі прарывацца драматычныя ноты. Здавалася, яна падыходзіла да галоўнага, да таго, што мучыла яе доўгія гады…

— *Ведаеце, я ж таксама горача хацела, каб Міша стаў урачом. І муж. Тут мы абодва былі саўдзельнікамі. І хоць не наўпрост, але ўплывалі на сына ўнутрана. Нездарма ж гавораць, што сувязь маці і сына застаецца на гады вельмі моцнай. А знешне гэта выглядала, што гэта яго і толькі яго выбар. Больш за тое, наша прыяцелька, якая працавала ў мединстытуце, параіла рэпетытараў, прайшоўшы праз якіх дзеці абавязкова паступаюць. Так і здарылася. Паступіў сын, паўтаруся, лёгка, і вучыўся з лёгкасцю. Мы дзівіліся, як мала часу ў яго ідзе на падрыхтоўку да семінараў, на зубрэнне анатамічных тэрмінаў. Я ганарылася сынам, яго фенаменальная памяць здзіўляла. А потым раптам пасля першага семестра, паспяхова здаўшы сесію, Мішка вырашыў інстытут кінуць. Гэта быў шок для нас. Нічога не прадвяшчала гэтай, як нам з мужам тады падавалася, бяды. Сын заявіў: буду паступаць у тэатральны інстытут, не паступлю — у армію пайду. І тут я запярэчыла адкрыта, прывёўшы кучу аргументаў на карысць медыцыны. Усе сябры, знаёмыя мне гаварылі: утрымай, у 18 гадоў дзеці не могуць прымаць сур'ёзных рашэнняў… І я ўтрымала… Як мне падавалася, Мішка ўсё зразумеў.*

*Сын з медыцыны пайшоў пасля таго, як пасля заканчэння інстытута пяць гадоў прарабіў у рэанімацыі. Яго сябры, шкадуючы аб тым, не раз мне гаварылі: урач ён ад Бога, рэальны доктар Хаус, і дыягностыка — ягоная стыхія. Дагэтуль яму тэлефануюць, кансультуюцца па розных нагодах: то жывот у каго забаліць, то ўдар, то рана, то дзеці вірус падхапілі… І такіх выпадкаў шмат у яго невялікай практыцы ўрача. І цяпер тэлефануюць, просяць то пракансультаваць, то масаж зрабіць... Часам і я эгаістычна шкадую аб сыходзе Мішкі з бальніцы, не-не, і падумаю: ну вось, быў бы свой урач…*

Мне не цярпелася хутчэй даведацца, чым жа скончыцца гэтая гісторыя. Я прадбачыла яе фінал, мяркуючы, што сын маёй суразмоўніцы ўсё ж у медыцыну вярнуўся, таму і выказаў маці падзяку. Але я памылілася.

Ганна супакоілася і ўжо працягвала свой аповед больш стрымана.

— *"Зямны свой шлях прайшоўшы да паловы, я апынуўся ў змрочным лесе"… Памятаеце гэтыя радкі Дантэ, якімі пачынаецца "Боская камедыя"? Як найлепш, яны ілюстравалі стан майго дарослага сына да нядаўняга часу. Ён не раз гаварыў нам з бацькам, што ў выбары прафесіі памыліўся: не ляжала яго душа да ўрачэбнай справы. "І навошта я толькі пайшоў у медыцынскі, столькі часу страчана", — ён часта паўтараў гэтую фразу. А я хітравала, гаворачы: ты сам зрабіў свой выбар. Каюся, гэта была хлусня. Хоць знешне гэта выглядала праўдай.*

*Я ж бачыла, назірала, як Мішка пастаянна нешта рукамі тварыў. То драўляны пярсцёнак з бурштынам мне падорыць, то абруч з медзі для валасоў. То карандашны малюнак накідае. Многія яго дзіцячыя і школьныя малюнкі ў маёй памяці. Аднойчы ён намаляваў старога, які сядзіць на лаўцы. Той малюнак, ад якога, падавалася, ішло цяпло, незабыўны. Чамусьці такім мудрацом і добрым простым чалавекам, якога можна сустрэць у жыцці, я ўяўляю сабе святога Мікалая. А потым з кавалка бурштыну стварыў вобраз Божай Маці з немаўлём. І проста так аддаў аднакурсніцы, у якую нават не быў закаханы…*

Было відаць, як ганарыцца Ганна сваім сынам, якая безумоўная яе любоў да яго і якой шчаслівай маці яна сябе адчувае.

— Але ж вы прызналіся яму, нарэшце, у тым, што гэта вы з мужам падштурхнулі яго ў медыцынскі? — спытала я.

— *Дагэтуль баюся яму прызнацца… На днях, у дзень майго нараджэння, гаворачы тост, Мішка пры ўсёй радні падзякаваў за тое, што з мяне пачалася яго вялікая творчасць і рамяство. "Гэта ты, мама, зрабіла такі заказ, што я паверыў у сябе", — сказаў сын. А мне было сорамна, і вы ўжо ведаеце чаму. Бо перш чым гэта здарылася, прайшлі гады. Сын жанаты, у яго*



У гэтага зубра з металу адметны характар



Крэсла ў падарунак творцу

*двое дзяцей: дарослая дачка і сын, які гэтай вясной будзе рабіць свой выбар у прафесіі. А Мішку 40, і толькі нядаўна ён стаў на ногі. Яму не прыйшлося б даганяць самога сябе, калі б я, маці, не ўтрымлівала яго…*

Ганна, як прызналася, разумее, што ёсць лёс і ўсё не проста так здарылася. Ды і, як вядома, набыты жыццёвы досвед не знікае.

*— Сын, мабыць, не хацеў і нас засмучаць, і таму пайшоў па шляху, які падабаўся ўсім нам. Гэта мы маглі падавіць яго бацькоўскім аўтарытэтам. Але не яго гэта быў выбар! Не яго!*

І яна расказала пра той вялікі заказ, які сын выканаў для сябра яе сям'і, вядомага ў Беларусі пісьменніка.

*— Мы з мужам ужо і не ведалі, што падарыць Алегу на юбілей. За гады сяброўства шмат чаго дарылі. А юбілей салідны — 60. Хацелася зарыгінальнічаць. Ды так, каб падарунак быў карысным. Тэлефаную Мішку. Так, маўляў, і так, што можна зрабіць для дзядзькі Алега, можа быць, што прыдумаеш і зробіш. Можа, сервіровачны столік, такі, як ты камусьці падарыў, або свяцільню. У сына выдатна атрымліваюцца прадметы ў вінтажнай тэхніцы… І Мішка прыдумаў. Разам з жонкай Кацярынай яны зрабілі эскіз крэсла ў яго натуральную велічыню прама на сцяне спальні, на шпалерах… Яно нават да трона падобнае. І сын стварыў крэсла за тыдзень. Начамі працаваў: трэба было паспець да даты. Без ілжывай сціпласці скажу: атрымаўся шэдэўр. А спінка крэсла з крыламі анёла, які як бы ахоўвае таго, хто ў ім будзе сядзець, як на троне. Крэсла атрымалася эрганамічным. А колькі цяпла і душы туды ўкладзена! Кожны з нас, хто ў ім паспрабаваў пасядзець, гэта адчуў. Юбіляру падарунак спадабаўся…*

Аказалася, сын маёй спадарожніцы, цяпер мастак-рамеснік. Працуе з металам і дрэвам. Ганна паказала мне фатаграфіі "дома" для кулера з вадой, як выказалася, і зубра. Брутальны зубр мяне ўразіў. Яго нават захацелася пакратаць.

*— Мне гэтага зубра нават з рук выпускаць не хацелася: такі цёплы ён атрымаўся. Але сёння нават не паспяваю паглядзець усе работы Мішкі: шчыльна ў тэатры занята, ды і сын таксама. Я так радуюся яго ўпэўненасці ў сваім майстэрстве. І ведаеце, цяпер нават радуюся ўдвая, што ён не ў медыцыне. Бо столькі хворых людзей, якія не хочуць дапамагаць сабе самі.*

Ганна ўздыхнула з палёгкай. Падавалася, што яна нібы выдыхнула нешта важнае, нарэшце сфармуляванае. Відаць, яшчэ раз хацела зразумець, ці пазбавілася ад пачуцця віны перад сынам, ці даравала самой сабе.

Мы гутарылі дапазна. І зноў пілі чай з гранёных шклянак у падшклянках. Я любавалася Ганнай, чые вочы працягвалі ззяць шчасцем маці, на якую дзіця не ў крыўдзе. Наадварот, сын стаў бліжэйшы да яе, хоць і не часта яны сустракаюцца. Гаварылі і пра тое, як важна не перашкаджаць дзецям рабіць правільны выбар у прафесіі. У жыцці, нарэшце. І дапамагаць шукаць свае і толькі свае "гаджэты", каб прыстасаваўшыся да яго, раскрыць свае і толькі свае таленты. Сышліся ў меркаванні: нашым дзецям з дзіцячых гадоў мы ў большасці сваёй, пра тое не задумваючыся, не дазваляем чуць рытм мелодый іх жыццяў, прымушаючы падхопліваць нашы рытмы. А то і навязваем ім нерэалізаваныя асабістыя жаданні: як рабіць кар'еру, з кім сябраваць і з кім ажаніцца, шчыра жадаючы сваім дзецям шчасця. Ганна артыстычна працытавала словы, магчыма, з нейкай п'есы:

*— Усім нам хочацца, каб у дзяцей было шмат надзейных, адданых, добрых сяброў і, наадварот, каб з кепскімі людзьмі яны не вадзіліся. Але нашы дзеці маюць права мець зносіны, з кім захочуць… Больш за тое, нам прыйдзецца прызнаць: чым старэйшыя яны становяцца, тым менш у нас, бацькоў, магчымасцяў у рэальным жыцці паўплываць на іх выбар. І ўсё, што мы можам зрабіць, — закласці ім, пакуль яны маленькія, такую сістэму каштоўнасцяў і асабістыя якасці, каб добрыя людзі да іх цягнуліся, а са злымі ім было не па дарозе. Таму, як самі жывём, напэўна, важнейшае за ўсё…*



Вежа для кулера

І пра тое, што правільна і няправільна ў выхаванні, мы гаварылі. І што дзеці — люстэркі нашых пачуццяў, думак, учынкаў. І на ўнукаў пераключыліся. І не вохкалі наконт іх захопленасці гаджэтамі, сышоўшыся на тым, што не трэба баяцца сучасных электронных устройстваў, у якія тыкаюць пальчыкі дзеці нашых дарослых дзяцей. Бо і мы ўжо не абыходзімся без смартфонаў, планшэтаў, разумеючы, як гэта зручна. Калі, дарэчы, і мой сямейны клан збіраецца з нагоды святаў, і мой дарослы сын, гледзячы, як мы з пляменніцай ці ўнучкай абменьваемся фотаздымкамі або перакідваем мелодыі па блютузе, жартуе: ну вось, хіба тут пагутарыш, нашы дзяўчаты — у гаджэтах. А дзяўчатам — ад 5 да 55 і вышэй… Але мы і размаўляем, і спяваем, і чуем адзін аднаго — электронныя ўстройствы не перашкаджаюць. Таму што з гадамі ўсё больш і больш цэнім жывыя зносіны, адчуваючы, як душэўна цёпла і камфортна ў атмасферы родных і сяброў, дзе мы ўсе адзін аднаму цікавыя.

Валянціна **Ждановіч**



## Густы ва ўсіх розныя. І кандытары гэта добра ведаюць

**Беларусаў можна смела назваць ласунамі: наш рынак кандытарскіх вырабаў за год — гэта 250 тысяч тон шакаладу, цукерак, зефіру, пячэння ды іншых дэсертаў**

Прыкладна 70 тысяч тон прысмакаў да нас трапляюць з-за мяжы, а з айчынных палова паступае з прадпрыемстваў канцэрна "Белдзяржхарчпрам", у склад якога ўваходзяць усім вядомыя "Камунарка", "Спартак", "Чырвоны харчавік", "Чырвоны Мазыранін", "Слодыч", "Конфа", "Іўкон" і "Першая шакаладная кампанія".

Штогод на прадпрыемствах "Белдзяржхарчпрама" з'яўляецца больш як сотня новых відаў прадукцыі. У 2016-м на прылаўках пакупнікі ўжо заўважылі новыя віды шакаладу, пасцілы, казінакі, а яшчэ — больш дэсертаў з паніжаным утрыманнем цукру. Здзіўляюць нашы кандытары і густам. Як вам начынкі з цукровага апельсіна з каньякам ці з бананавай нугі з клубнічным жэле?

Беларускі шакалад і цукеркі з задавальненнем дораць на святы ў розных кутках свету, асабліва нашы прысмакі запатрабаваныя ў Расіі, ЗША, Украіне, Манголіі. Хоць з бліжэйшымі суседзямі ёсць разыходжанне, якое спецыялісты спрабуюць прывесці да адной роўніцы ў тэхрэгламенце: наш шакалад нярэдка аказваецца даражэйшы за расійскі ці ўкраінскі. Прычына — мы робім стаўку на какава-масла, а на долю заменнікаў толькі ў крайніх выпадках можа выпасці 5 працэнтаў, у той час як у суседзяў гэты працэнт у разы большы. А вось для кітайцаў беларускія цукеркі і шакалад занадта салодкія, таму тэхнолагам даводзіцца праяўляць гнуткасць, вывучаць густы і падстройвацца пад рынак Паднябеснай. У выніку толькі сёлета ад канцэрна "Белдзяржхарчпрам" у КНР адправіліся цукеркі і шакалад на 500 тысяч долараў.

## Жамчужыне вакалу не трэба хваляваца

**Ангеліна Васілеўская перамагла на прэстыжным еўрапейскім вакальным конкурсе Berliner Perle ("Берлінская жамчужына"). Упершыню за 15-гадовую гісторыю гэтага спаборніцтва ўзнагарода дасталася Беларусі.**



У конкурсе ўдзельнічала больш за 40 фіналістаў з Украіны, Расіі, Літвы, Латвіі, Азербайджана, Арменіі, Балгарыі, Германіі, Вялікабрытаніі, Румыніі, Казахстана, Швецыі ды іншых краін.

Конкурс праходзіў у тры этапы: кастынгі, нацыянальны фінал і міжнародны. Ангеліна Васілеўская атрымала магчымасць прадставіць краіну, стаўшы пераможцай пасля нацыянальнага адборачнага тура ў Беларусі.

У фінале ўдзельнікі конкурсу выступалі ў трох узроставых катэгорыях. Ангеліна выканала дзве песні і па выніках двух конкурсных дзён стала лідарам.

## Сустракаюць па адзежцы

**Наша праслаўленая біятланістка Дар'я Домрачава з нараджэннем дачкі не сышла ў цень. Пасля невялікай паўзы яна пачала актыўныя трэніроўкі, а паміж справай прыгатавала падарунак балельшчыкам, адкрыўшы ўласны інтэрнэт-магазін адзення і сувеніраў.**




— Вельмі спадзяюся, што, надзеўшы футболку ці павязку з біятлонным прынтам, хто-небудзь прымусіць сябе прабегчы на кіламетр больш, установіць маленькі асабісты рэкорд або купіць нарэшце абанемент у спартзалу. Займацца спортам становіцца куды больш прыемна, калі на табе надзета штосьці, у чым ты адчуваеш сябе ўпэўнена, — так спартсменка растлумачыла мэту свайго праекта. — Хацелася дадаць да спартыўнай формы, у якой я праводжу большую частку часу, нейкую "разыначку" — сваю індывідуальную рысу. Акрамя таго, для мяне было важна прыдумаць нешта такое, што змагло б дадаткова матываваць людзей на занятк і спортам.

Цікава, што для здымак каталога магазіна Дар'я запрасіла не прафесійных мадэляў, а звычайных балельшчыкаў са стажам. У чэмпіёнкі склалася цвёрдае перакананне, што абсалютна ўсе людзі, прыгожыя ўнутры, прыгожыя і звонку. І яшчэ адна цікавая дэталь: уся прадукцыя, прадстаўленая ў інтэрнэт-магазіне, беларускай вытворчасці. Дар'я Домрачава патрыятычная не толькі на лыжні:

— Мне было важна паказаць свету, ды і нам самім, што пры належным падыходзе і ўвазе да дэталяў у Беларусі можна ствараць добрыя якасныя рэчы з прынтамі, якія не сатруцца пасля мыцця.

## Пушча дзеліцца таямніцамі

**Падчас маніторынгу пушчанскага лесу польскія навукоўцы знайшлі на мяжы з Беларуссю невядомыя археалагічныя аб’екты — каменныя канструкцыі шырынёй каля двух метраў і вышынёй да 20 сантыметраў**

Навуковы супрацоўнік Нацыянальнага парку “Белавежская пушча” Руслан Кніга расказаў, што даследаванні праводзіліся з выкарыстаннем лазернага сканавання зямной паверхні:

— Знойдзеныя аб’екты размешчаны ў асноўным на ўзвышаных месцах. Сям-там правялі раскопкі, убачылі каменныя канструкцыі. На думку польскіх калег, яны рукатворныя і, верагодней за ўсё, гэта рэшткі межаў сельскагаспадарчых палёў. Цікава, што канструкцыі ў некаторых месцах залягаюць пад магільнікамі і курганамі часоў ранняга Сярэднявечча. Значыць, яны намнога старэйшыя, чым дрэвы, якія растуць у пушчы. Вядома ж, цікава ўстанавіць дакладнае датаванне гэтых аб’ектаў, іх функцыі. Потым даследчыкі маюць намер дэталёва вывучыць тое, што знаходзіцца ўнутры лінейных канструкцый, якія дадуць усім нам новыя цікавыя звесткі пра гісторыю рэліктавага лесу.

На беларускай частцы Белавежскай пушчы археалагічныя даследаванні вядуцца кожнае лета з 2008 года. Падчас раскопак навукоўцы выявілі больш за паўсотню археалагічных аб’ектаў каменнага, бронзавага і жалезнага вякоў. Некаторыя артэфакты можна ўбачыць у Музеі прыроды.



Руслан Кніга расказаў, як прасоўваецца будаўніцтва музея-скансэна ў нацыянальным парку:

— Музей будуецца па Дзяржпраграме аховы навакольнага асяроддзя і ўстойлівага выкарыстання прыродных рэсурсаў на 2016-2020 гады. Ужо гатовы праект скансэна. У 2017 годзе вылучаецца 100 тысяч рублёў на будаўніцтва камунікацый і аўтастаянкі перад скансэнам.

## Турыстам на заметку

**Аднойчы мінскаму краязнаўцу Уладзіславу Хількевічу прыйшла ў галаву ідэя зрабіць даведнік па Мінску для дзяцей. Задуманае ўдалося ўвасобіць у жыццё, і вось маляўнічае выданне з’явілася ў кнігарнях.**



Уладзіслаў Хількевіч з дачкой Лізаветай

Але самае цікавае, што ажыццявіла мару Уладзіслава яго дачка Лізавета. Працаваць над даведнікам яна пачала ў 11 гадоў, а скончыла ў 14. Першыя паўтара года дзяўчынка збірала інфармацыю ў багатай хатняй бібліятэцы ды інтэрнэце, перапрацоўвала яе, хадзіла ў музеі і на экскурсіі. Аднойчы, успамінаюць бацькі, падчас аднаго з выездаў з класам Ліза вельмі здзівіла аднакласнікаў, якія сядзелі побач у аўтобусе, аповедамі пра славутасці, што мільгалі за акном.

Першы тэкст Лізаветы быў пра Нацыянальную бібліятэку. “Энергіі там расходуецца нямала. Таму для эканоміі святла ўнутры будынкаў вісяць спецыяльныя панэлі-святлоадбівальнікі і збудавана празрыстая шкляная падлога, якая вытрымлівае вагу ў некалькі тон, скачы — не хачу!” — напісала яна. Пасля тэкст давялося скарачаць, і гэта адзінае, што зрабіў у даведніку Уладзіслаў. Дзеля чысціні эксперыменту ён прынцыпова вырашыў не ўмешвацца ў творчасць дачкі. Калі тэкст быў гатовы, паўстала пытанне з ілюстрацыямі. Праілюстраваць кніжку ў выдавецтве прапанавалі самой Лізе. На малюнкі пайшоў яшчэ год.




З даведніка юныя мінчане, іх бацькі і, вядома ж, замежныя госці атрымаюць адказы на многія пытанні. Напрыклад, даведаюцца, дзе размяшчаўся старажытны Мінск, якая вуліца самая кароткая і якая самая вузкая, колькі гадоў найстарэйшаму з захаваных мінскіх храмаў, якая вышыня вежы гарадской Ратушы, чым знакаміты граф Чапскі, пад якой мінскай плошчай жыў крывважэрны дракон і яшчэ шмат цікаўнай інфармацыі.

Лізавета цяпер гатовая стварыць даведнікі і па іншых гарадах. А пакуль яна малюе знакамітыя мінскія будынкі, якія злучае з сусветнымі славутасцямі. Напрыклад, сумясціла “Вароты Мінска” з Трыумфальнай аркай у Парыжы.

# Рух у сваю прастору

**Нататкі ў стылі флэшбэк — вяртанне ў мінулае, — навеяныя адным з арыгінальных дзён, што святкуецца ў ЗША і Канадзе 2 лютага — Днём сурка. Да яго праяўляюць цікавасць і беларусы, параўноўваючы гэтага прадказальніка прыходу вясны са славянскім сіноптыкам — Пеўнем.**

Зрэшты, гэта ўсяго толькі падстава яшчэ раз паглядзець культавую галівудскую кінастужку “Дзень сурка” Дэні Рубіна і Харальда Рэміса ды прыйсці да ўстоянай высновы: усё ў нашым жыцці ўзаемазвязана. Здавалася б, ну якое дачыненне мае Дзень сурка да фільма, тым больш да майго асабістага шляху ў журналістыку ды работы над дысертацыяй? Аказваецца, мае. І ланцужок прасочваецца. Пасля гэтай рамантычнай камедыі 1993 года, дзе ёсць і містыка, і філасофскі падтэкст з яго ідэяй духоўнага перараджэння, традыцыйнае амерыканскае свята стала папулярным ва ўсім свеце. А карані яго святкавання — у Старажытным Рыме. Як паведамляюць розныя інфармацыйныя крыніцы, 2 лютага фільм круцяць па многіх амерыканскіх каналах. Паказвалі яго ў той дзень і на беларускім тэлебачанні. Акрамя таго, нашы СМІ надалі ўвагу і Пеўню. У народным календары беларусаў 2 лютага — гэта Грамніцы, калі зіма ўпершыню з вясною сустракаецца. І калі певень нап’ецца вады з лужыны, вясна будзе цёплай і ранняй. А вясну, вядома, з яе абнаўленнем мы ўсе чакаем. І так паўтараецца з году ў год. Пэўная цыклічнасць уласцівая і нашым успамінам, ды ўсведамленню не толькі свайго жыццёвага шляху, але і ўласных думак аб падзеях, з’явах ды пра сябе саміх. Часам тое, што падавалася зразумелым, скажам, мінулай вясной, разгадваеш як новы рэбус. Альбо, да прыкладу, узяць хоць бы вядомы твор “Аліса ў краіне цудаў” Льюіса Кэрала. Перачытваючы яго час ад часу, даведваюся і пра жыццё, і пра сябе нешта новае — праз азарэнне. Таму на гэты раз і цытую тое, што наноў спадабалася. Але пра ўсё па парадку.

## “Некаторыя не бачаць выхад, нават калі знойдуць. Другія ж проста не шукаюць”

Па сюжэце галоўны герой “Дня сурка” Філ Конарс, фанабэрысты вядучы прагнозу надвор’я, якога сыграў Біл Мюрэй, штогод прыязджае у амерыканскі гарадок Панксатоні на фестываль у гонар сурка Філа, якога будзяць, каб, убачыўшы, як паводзіць сябе жывёла, прадказаць прыход вясны. У чарговы раз журналіст 2 лютага туды адпраўляецца, каб зрабіць абрыдлы рэпартаж, і там трапляе ў часавую пятлю. Кожны дзень ён выяўляе, што новы дзень не настае. Зразумеўшы, што заўтра не прыходзіць, Філ вырашае жыць, што называецца, на “поўную катуш-

> ***“Куды-небудзь ты абавязкова патрапіш. Трэба толькі даволі доўга ісці”***



ку"… Але гэта не прыносіць яму задавальнення… Вырвацца з часавай пятлі Філу ўдасца толькі пасля таго, як, пачаўшы рабіць добрыя справы, ён зразумее, што яго радуе і жыццё, і праца… Філ адкрывае сябе для самога сябе нанава, разумеючы, што ўсе мінулыя гады, падобна да Сурка, ён знаходзіўся ў спячцы…

## "Калі дарога ўяўляе з сябе загадку, паспрабуй крочыць наўздагад. Нясіся па ветры…"

Я не перастаю здзіўляцца мудрасці жыцця, якое прадастаўляе шырокія магчымасці для таго, каб знайсці ў ім сваю прастору, дзе ўсё будзе, як гаворыцца, у тэму. Як цяпер кажуць, пакоціць. І ў вучобе, і ў кар'еры, і ў асабістым жыцці. Так, без сумнення, удалы выбар свайго шляху змаладу — вялікая рэч. І шчаслівыя, напэўна, тыя асобы, якія з падлеткавага ўзросту ведаюць, кім быць, куды ды навошта ісці. Асэнсаванне месца чалавека ў жыцці, сябе самога ў ім, пошукі яго сэнсу — прадмет мастацтва, літаратуры з даўніх часоў.

Памятаеце дыялог любіміцы дзяцей ды дарослых Алісы і Чэшырскага ката з казкі "Аліса ў краіне цудаў"?

— Скажыце, калі ласка, куды мне адгэтуль ісці?

— А куды ты хочаш патрапіць? — адказаў Кот.

— Мне ўсё роўна… — сказала Аліса.

— Тады ўсё роўна, куды і ісці, — заўважыў Кот. — Куды-небудзь ты абавязкова патрапіш.

Трэба толькі даволі доўга ісці.

Так і я ішла. Амаль што праз "усё роўна". У свае 17 не магла зразумець, ці правільны зрабіла крок, паступіўшы пасля школы на філалагічны факультэт Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пра тое нават амаль не задумвалася. Адчуванне: ты, дзяўчынка з правінцыі, будзеш вучыцца ў Кіеве, бударажыла кроў, як і новыя французскія лакіраваныя туфлі з квадратнымі насамі ды бантамі па тагачаснай модзе, набытыя з нагоды паступлення ў сталічны ўніверсітэт. Хоць і марыла апынуцца сярод абітурыентаў, якія штурмавалі факультэт журналістыкі ў той жа ВНУ, гэта было ўжо не такім істотным, калі паступіла на філфак. Як забыліся і настаўленні паэта ды журналіста Юрыя Стаднічэнкі, які прыязджаў у наш украінскі гарадок Ваўчанск, што на Харкаўшчыне, у камандзіроўку ў раённую газету "Хлібароб"ды меў зносіны з намі, юнымі гуманітарыямі з 9 класаў, чые літаратурныя опусы зрэдку публікаваліся на яе старонках.

Дагэтуль перад вачамі тая газетка, дзе ў левай калонцы на чацвёртай паласе размешчаны мой наіўны вершык пра вясновыя пупышкі-сычы, якія патрэсквалі, напаўняючы сад вясновымі гукамі. Памятаю, як прыемна было бачыць сваё прозвішча, а таксама пільны погляд



ВАДЗІМ КАНДРАШОЎ

харкаўскага госця. Ды яго пытанне: “Що, в поети підеш або може все ж таки в журналістику?”

Вось так тая яркая, як у такіх выпадках гавораць, лёсавызначальная сустрэча з будучым заслужаным журналістам Украіны і пасеяла ў маім сэрцы славалюбівую мару…

Пасеяць — пасеяла, але з усходамі давялося пачакаць. Рэальнасць была такая: “жаўтаротых” птушанят, накшталт мяне, на журфак бралі неахвотна, нават калі ты сямі пядзяў у лбе. Дасведчаныя дзеячы ў дэканаце накіравалі на шлях правільны, паведаміўшы маёй маці: маўляў, калі ёсць у дачкі схільнасць пісаць, то ў журналістыку праб’ецца і пасля філфака, пасталее, розуму набярэцца… Ды як жа яны мелі рацыю…

## “Як бы ты ні глядзела, ты павінна глядзець у правільным напрамку”

Не так даўно я, як і сын маёй спадарожніцы з папярэдняй публікацыі (стар.38), думала: колькі часу страчана дарэмна. Трэба было адразу спрабаваць паступіць на журфак, не слухаць ні маці, ні тых, хто ёй параіў адправіць дачку на філалагічны. Калі б журналістыка, падавалася мне, здарылася раней, то гады жыцця паміж заканчэннем універсітэта ды пачаткам кар’еры журналіста не былі б доўгімі пошукамі шляху ў сваю прастору, у якой цікава жыць і працаваць. Але, як вядома, гісторыя не ведае ўмоўнага ладу.

Цяпер жа перакanaна: калі б не трапіла я, як Філ з “Дня сурка”, у сваю часавую “пятлю” з дысертацыяй, наўрад ці калі-небудзь прыняла б рашэнне — пайсці ў журналістыку, займацца тым, што падабаецца. І мара б засталася пустой ды безразважнай.

## “Збірай усё, што знойдзеш карыснага. Акрамя абыякавасці і невуцтва. І тады ты, можа быць, выжывеш”

Выразкі … Як жа я іх ненавіджу… Ад паху газетнай паперы ды канцылярскага клею сціскае галаву… Я, лабарант аддзела тэатра Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук Беларусі, злуюся на ўвесь свет, седзячы адна ў халодным кабінеце да 6 вечара. Аспіранты, малодшыя навуковыя супрацоўнікі, не гаворачы ўжо пра старшых, пасля абеду разышліся па сваіх справах: хто ў бібліятэку, хто на канферэнцыю, а хто, як некаторыя, — дадому: пісаць свае навуковыя працы. Вось гэта жыццё, думала я... Ды працягвала злавацца. У першую чаргу на доктара мастацтвазнаўства, прафесара Уладзіміра Няфёда, светлая яму памяць (у студзені споўнілася сто гадоў з дня яго нараджэння), які даручыў мне самую сумную, як мне тады падавалася, работу. Ён вучыў мяне розуму, абавязаўшы прывесці ў парадак архіў з газетнымі выразкамі і сістэматызаваць тэатральны архіў рукапісаў і фатаграфій. Праца, на першы недасведчаны мой погляд, пыльная, не творчая і нікому не патрэбная. Але, як вядома, калі мы добра робім працу, яна робіць нас. Паступова напаўняючы яе сваёй энергіяй, я ўбачыла ў гэтай рабоце і прыгажосць, і карысць. Паступова архівы былі прыведзены ў сістэму, і з імі было зручна працаваць усім, хто пісаў навуковыя працы. Гэта заўважылі мае старэйшыя калегі. Незаменны быў архіў і пры стварэнні вялікай працы ўсяго аддзела — “Гісторыі беларускага тэатра” ў 3-х тамах, у якую і я ўклала свае сілы, выконваючы тэхнічную работу. Да яе ў мяне было ўжо іншае стаўленне. Відаць, я зразумела нешта вельмі важнае, таму мне прапанавалі паступаць у аспірантуру на вочнае аддзяленне. Наперадзе маячыла тры гады свабоднага творчага жыцця, якое мне марылася такім прывабным. І бачыўся вынік: усім дакажу, што таксама магу быць навукоўцам — не толькі архіварыусам. Такая была мая матывацыя. Я была абсалютна ўпэўнена ў тым, што зраблю гэта хутка ды ў тэрмін. Але ўпэўненасць ды безразважнасць, як выказваецца Чэшырскі кот, два бакі аднаго медаля…

## “Няважна, чаму значнае стала нязначным. Стала, і ўсё тут”

Я наведвала курсы англійскай мовы, зубрыла англійскія словы ды рабіла пераклады з таўшчэзнага англійскага часопіса, паглыблялася ў гісторыю тэатра Беларусі, штудзіравала філасофію ды здавала кандыдацкія мінімумы. І, сабраўшы неабходны матэрыял, пісала раздзелы дысертацыі пра Змітрака Бядулю, тэатральнага крытыка, публіцыста ды драматурга. Як жа мяне грэла думка пра тое, што да гэтага ніхто не паднімаў гэты пласт тэатразнаўчай навукі. Ідэя належала двум тэатразнаўцам, кандыдатам мастацтвазнаўства Клары Кузняцовай і Тамары Гаробчанка. Тамара і была маім навуковым кіраўніком. Яна вучыла мяне сістэмна думаць, бачыць галоўнае сярод другараднага, у тым ліку і ўяўнага. І я бясконца ёй удзячная. Тамара Яўгенаўна была кіраўніком неабыякавым, кіраўніком-энтузіястам, зацікаўленым у маёй эвалюцыі будучага навукоўца. І прыйшоў дзень, калі плод паспеў. Чарнавы варыянт дысертацыі абмеркавалі калегі, зрабілі заўвагі, выказалі пажаданні… Прычым, што падавалася дзіўным, усе супрацоўнікі аддзела ўхвалілі маю працу, акрамя Уладзіміра Іванавіча Няфёда. Памятаю, Тамара сказала, што не разумее яго прадузятага, занадта крытычнага погляду.

Ці была задаволена я? Да драбнюткіх падрабязнасцяў памятаю сваё адчуванне ад рукапісу: мне не спадабалася, як я гэта зрабіла, хоць, здавалася, усё было правільна. І нават адчула расчараванне. Ні адабрэнне калег, ні іх пахвала не радавалі. Шлях у навуку, які падаваўся такім важным і патрэбным, раптам такім быць перастаў. І заўвагі Няфёда не закранулі. Я, слухаючы іх, як бы і не чула. Галоўнае, што вынесла са свайго аспіранцкага досведу ды работы ў аддзеле тэатра: у жыцці так шмат добрых людзей, здольных і гатовых табе дапамагчы. І з лёгкасцю паклала рукапіс у пісьмовы стол, быўшы перакананай у тым, што ніколі да яго не вярнуся.

## “Глядзі, вучыся, дзейнічай”

Жыццё з зайздросным пастаянствам вяртае нас у падобныя сітуацыі, каб мы засвоілі нейкі ўрок. І, як гавораць псіхолагі, да таго часу, пакуль ты не зразумееш, што сам ствараеш сваю рэальнасць, якая можа ой як не падабацца, сітуацыі будуць паўтарацца зноў ды зноў. Памятаю, як мы з мужам, абходзячы Беларусь уздоўж Дзяржаўнай граніцы пешшу, у самым пачатку нашага шляху моцна пасварыліся. І, не прымірыўшыся, пайшлі далей. Лес, дарогі, ні душы… І о, жах, мы зноў прыйшлі туды, адкуль выйшлі. Гэта была прыгранічная вёска Карасіна ў Браслаўскім раёне. Пятля “Карасіна” вучыла нас адказнасці адно да аднаго, за свае словы, узаемапаваге…

Так і я, паўтаруся, зрабіўшы сваю часавую “пятлю” з дысертацыяй, зразумела, навошта патрэбны быў гэты бясцэнны досвед. У мінулым я не ўбачыла ў асобе Змітрака Бядулі-класіка жывога чалавека, не захапілася ім, адкрываючы як крытыка, публіцыста і драматурга. І таму мне самой было нецікава працаваць над тэмай

Рукапіс праляжаў у пісьмовым стале сем гадоў. Неяк я дастала яго ды перачытала. І о, эўрыка! Зразумела, чаму праца не прынесла мне ў мінулым пачуцця задавальнення: яна была безжыццёвай, не пругкай па думцы, таму што я, дадам, не палюбіла свайго героя. Відаць, гэта і адчуў Уладзімір Няфёд, чалавек, апантаны навукай і тэатрам.Таму горача і пераконваў усіх, хто ўдзельнічаў у абмеркаванні: аспірантка да абароны не гатовая.

Рашэнне перапісаць дысертацыю падагрэлі мае новыя калегі ў рэдакцыі часопіса “Роднае слова”, даведаўшыся, што я пахавала такую “выдатную” тэму. Туды мяне ўзялі на службу, хоць і не мела абсалютна ніякага досведу работы адказнага сакратара. Магчыма, зноў спрацавала славалюбства — жаданне даказаць сабе ды іншым, што я, ледзь не без пяці хвілін кандыдат навук, змагу працаваць у навукова-метадычным часопісе, ды яшчэ адказным… І я змагла. З будняў адказнага сакратара ды паралельнай работы над новым варыянтам дысертацыі ды публікацыямі ў СМІ пачаўся мой сапраўдны шлях у прафесію журналіста. Я ўдзячная ўсім, хто даваў арыенціры, няхай часам і ў жорсткай форме. І цяпер мая вучоба працягваецца, бо кожны новы дзень у прафесіі, калі яна табе да душы, гэта ўрокі жыцця ў радасці творчасці.

…На абароне гучалі добрыя словы маіх апанентаў, у тым ліку і тагачаснага дырэктара Інстытута літаратуры Акадэміі навук Беларусі, літаратуразнаўцы Віктара Каваленкі. Ён, скажу без ілжывай сціпласці, гаварыў, што гэта першая на яго памяці дысертацыя-эсэ, у якой навука цёплая, ачалавечаная …

## “Лепшы спосаб растлумачыць — гэта самому зрабіць”

Дзіўнае супадзенне…2 лютага ў Дзень сурка мы з мужам сядзелі ў лесе ля кастра. Такая традыцыя: выязджаць у выхадны на прыроду нават узімку склалася ўжо даўно, яшчэ з часоў нашага падарожжа. Ды ўмацавалася з тых пор, як мая старэнькая маці стала жыць з намі. Ёй вельмі падабаўся лес, агонь ды рытуал падкладвання дроў у мангал, асабліва ў мароз. Чуць перастанеш падкладваць — змерзнеш.

Так і з марамі. Ім цяжка ўвасабляцца, калі мы проста чакаем. Проста спадзяёмся. На чараўніцтва, на іншых, на асаблівыя жыццёвыя абставіны. На ўдачу…Не рухаемся. Няхай сабе і навобмацак.

І яшчэ напрыканцы пра цуды.

— А што гэта за гукі, вунь там? — спытала Аліса.

— А, гэта цуды, — абыякава растлумачыў Чэшырскі кот.

— І што ж яны там робяць? — пацікавілася дзяўчынка.

— Як і мае быць, — Кот пазяхнуў. — Здараюцца.

Разаўю гэтую думку, ды прабачыць мне Льюіс Кэрал. Цуды здараюцца, вядома, але толькі пры ўмове, у чым сама не раз пераконвалася ды працягваю пераконвацца: калі ў агонь, на якім яны гатуюцца, мы ўвесь час падкідваем дровы.

Валянціна **Ждановіч**



# Сардэчна запрашаем у Навагрудак



## Дзіўны горад, дзе жыве гісторыя, асабліва прыгожы ўзімку



**Гісторыя Навагрудка ўтойвае шмат таямніц і загадак. Першая звязана з яго заснаваннем. Па адной з версій, крэпасць на Замкавай гары заснаваў Яраслаў Мудры, па другой — першы кіраўнік Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага Міндоўг. А яшчэ гісторыкі называюць адразу тры даты заснавання Навагрудка: 1044, 1116 і 1252 гады.**

### Далучыцца да караля Артура

Лепш за ўсё глядзець на горад з Замкавай гары, падняўшыся да руін старажытнай крэпасці. Усё як на далоні — касцёлы, цэрквы, манастыры, мячэць, яўрэйскія могілкі, рыначная плошча, гандлёвыя рады, крапасны роў і вал. Ля магутных сцен крэпасці лёгка ўявіць сабе эпоху рыцараў і каралёў. Таму ўлетку тут праводзяць грандыёзны рыцарскі турнір “Белая вежа”. На ім ёсць магчымасць “далучыцца” да атрада Рычарда Львінае сэрца ці караля Артура.

Маляўнічы ўзгорак непадалёк ад замчышча, які называюць Гарой Міндоўга, — яшчэ адна загадка. Паводле паданняў, тут недзе пахаваны князь.

Пра высокі статус Навагрудка ў старадаўнія часы гаворыць шкляная разная чаша “Кубак Святой Ядвігі”, знойдзеная падчас раскопак. На ёй адлюстраваны леў, грыфон і дрэва жыцця ў выглядзе дзвюх змей, што абвіваюць чашу жыцця. Пасудзіна захоўваецца ў Эрмітажы, спецыялісты Брытанскага музея адносяць яе да першай сотні самых знакамітых твораў матэрыяльнай культуры агульначалавечай цывілізацыі.





## Пабываць на радзіме Адама Міцкевіча

Казус класіка польскай літаратуры Адама Міцкевіча ў тым, што ён ніколі не жыў у Польшчы, а родным называў Навагрудак. У доме, дзе жыла сям'я Міцкевічаў, ёсць музей. Адноўлена сядзіба Завоссе, дзе нарадзіўся паэт. Тут шануюць яго памяць, побач з Замкавай гарой насыпаны Курган бяссмерця.

Лёсы Міцкевіча і Пушкіна перапляліся самым мудрагелістым чынам. У XIX стагоддзі ў тамтэйшых месцах кватараваў 13-ы гусарскі Нарвскі полк пад камандаваннем яго старэйшага сына палкоўніка Аляксандра Пушкіна. У горадзе ён жыў з сям'ёй. Магіла аднаго з унукаў вялікага рускага паэта — Пятра — добра захавалася.



## Убачыць легендарнае возера Свіцязь

Пра паходжанне возера можна даведацца з балад Міцкевіча "Свіцязь", "Свіцязянка" і "Рыбка". Паводле легенды, раней тут стаяў горад Свіцязь. Вораг асадзіў горад, людзі сталі падпальваць свае дамы. У гэты момант усё і правалілася пад зямлю і пайшла вада.

Шмат загадак і з азёрнай флорай і фаўнай. Навукоўцы ламаюць галовы, як сюды трапілі некаторыя мікраарганізмы і водарасці, якія ў Беларусі больш нідзе не сустракаюцца.

А вось гаючыя ўласцівасці азёрнай вады — не міфы, а чыстая праўда. Яна змяшчае шмат срэбра, што дапамагае амаладзіцца.

## Пажыць у нумары Уладзіміра Высоцкага

Навагрудак — горад паэтаў. У дамініканскай школе вучыўся яшчэ адзін класік — беларускі паэт Ян Чачот. Тры гады назад адкрылі помнік Высоцкаму. Ён прыязджаў сюды ў 1969 годзе. Тады беларускі рэжысёр Віктар Тураў здымаў тут свой фільм "Сыны ідуць у бой". Бард напісаў для яго некалькі песень, у тым ліку знакамітую "Он не вернулся из боя".

Праведаць мужа прыязджала Марына Владзі. Яны жылі ў мясцовай гасцініцы. Гэты нумар — 325-ы — захаваўся ў першародным выглядзе. Лічыцца, што песня "Здесь лапы у елей дрожат на весу…" з'явілася пасля гэтай паездкі ў Беларусь.



ПАВЕЛ ЧУЙКО

## Паглядзець на свет звысоку

Горад размешчаны ў цэнтры нейкага "магічнага кола": амаль на аднолькавай адлегласці ад замкаў Нясвіжа, Ліды і Міра.

За трыццаць кіламетраў ёсць старадаўняе мястэчка Любча са старажытнай крэпасцю на высокім беразе Нёмана. За ім — бяскрайнія лясы Налібоцкай пушчы, месцы рыбалкі і палявання, у тым ліку і "каралеўскага" — на фазана.

Спыніцца можна ў адной з аграсядзіб. Паспытаць смажаніны, печыва і знакамітай налібоцкай пушчанкі.



Сяргей Кавальчык, галоўны рэжысёр Нацыянальнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя М. Горкага

# Сяргей Кавальчык: Я адчуваю сябе шчаслівым, калі зала думае

**Не памятаю выпадку, каб у Беларусі хто-небудзь стаў мастацкім кіраўніком акадэмічнага тэатра ў 38 гадоў і ўзначальваў яго амаль дзесяцігоддзе. Сяргей Кавальчык пакуль без званняў, але ўпэўнены лідар у беларускай тэатральнай прасторы. Гаворачы спартыўнай тэрміналогіяй, працуе па юніёрскай праграме, дазваляючы сабе гарэзаваць, эксперыментаваць, шчодра насычаць спектаклі імпэтнай музыкай, прымушаць маладых акцёраў узлятаць у паднябессе.**

За плячыма — акцёрская і рэжысёрская прафесія, служба ў арміі, работа па меншай меры ў пяці тэатрах, стварэнне музычнага праекта "Вясёлыя жабракі", спробы на тэлебачанні, выхаванне траіх дзяцей і рэпутацыя таленавітага стваральніка якасных капуснікаў. Мы знаёмыя з яго нараджэння — і дазволю сабе звяртацца да Кавальчыка на ты.

## "У нас агульныя карані"

*— Ты нарадзіўся, вырас, вучыўся ў Беларусі. Пастаянна працаваў то на беларускай, то на рускай мове. Да цябе прыходзяць акцёры-беларусы. У глядзельнай зале — беларуская публіка. Ці сутыкаўся наш рускі тэатр, як у іншых рэспубліках былога СССР, з нацыяналістычнымі праблемамі?*

— У нашай краіне моўнае асяроддзе рускае. Яно шмат у чым вызначае вектар культуры. Да таго ж у назве тэатра ёсць слова "нацыянальны". Мы ставім беларускіх драматургаў, чые многія п'есы напісаны на рускай мове. Нядаўна правялі беларускія сезоны: "Зацюканы апостал" Андрэя Макаёнка, "Экзекутар" Аляксея Дударава, "Пане Каханку" Андрэя Курэйчыка, "Пясняр" Васіля Дранько-Майсюка. Двухмоўную Беларусь можна параўнаць са Швейцарыяй, дзе лёгка пераходзяць з французскай мовы на нямецкую ды італьянскую. Якія канфлікты?! Якое нацыянальнае пытанне?! У нас агульныя славянскія карані.



***— У каго сёння рэжысёр Сяргей Кавальчык вучыцца?***

— Зараз вярнуўся з Санкт-Пецярбурга з культурнага форуму. Вучыўся таму, што пакуль сам не ўмею рабіць — ультрасучасным формам. Я ўсё-такі традыцыяналіст — паважаю літаратурны матэрыял, адзяваю плашч драматурга і прыслухоўваюся, як ён сябе ў ім адчувае. Не магу забыць цудоўны спектакль “На ўсякага мудраца даволі прастаты” з Уладзіміра. Рэжысёр Сяргей Марозаў цудоўна папрацаваў з тэкстам Астроўскага. Таксама прастатой і яснасцю трактоўкі ўразіў мяне спектакль Марка Захарава “Вішнёвы сад”. З нашых беларускіх рэжысёраў для мяне настаўнікамі з’яўляюцца лялечнік Аляксей Ляляўскі ды майстар пластычных фантазій Вячаслаў Іназемцаў.

***— Твае адносіны з музыкай? З усіх нашых рэжысёраў ты ў гэтым плане самы прасунуты.***

— Пачалося са звычайнага хлапечага супраціўлення. Бацька літаральна сілай прымусіў у 5-м класе пайсці ў музычную школу вучыцца іграць на акардэоне. Школу скончыў і да фіналу адчуў цікавасць да музыкі. Іграю на ўсіх інструментах, акрамя скрыпкі. Умею выбіраць мелодыі і кампазітараў. Вельмі люблю свой спектакль у Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі “Адвечная песня”. Гэта фолк-рок-опера. Ёй больш за дзесяць гадоў, і яна мае мноства ўзнагарод, у тым ліку ў Расіі.



Фолк-рок-опера “Адвечная песня” ў Рэспубліканскім тэатры беларускай драматургіі



Трагікамедыя “Бег” паводле бессмяротнага рамана М. Булгакава

## Дыялог з гледачом

***— Ты паставіў два спектаклі ў Тамбове, удзельнічаў у фестывалі “Акцёры Расіі”. Ці ёсць розніца паміж акцёрскай расійскай школай і нашай?***

— Невялікая, але ёсць. Напэўна, на карысць асобы. У Расіі з сістэмай Станіслаўскага і псіхалагічнай акцёрскай школай лепш. Хто іх больш культывуе, той дабіваецца большага поспеху. У Расіі акцёр умее выбудоўваць сваю ролю ў рэчышчы задумы рэжысёра. У нас часта рэжысёра не чуюць.

***— У цябе сёння тры дыпламаваныя прафесіі — акцёр, рэжысёр, кіраванец. Для чаго трэба было заканчваць Акадэмію кіравання пры Прэзідэнце? Можа быць, ёсць жаданне стаць яшчэ і дырэктарам тэатра?***

— Я хачу ведаць пра тэатр усё, пачынаючы ад работы бухгалтара да манціроўшчыка і рабочага сцэны. У Акадэміі я вывучаў эканоміку і кіраўніцкую справу. Думаю, што для рэжысёра такія веды вельмі важныя, каб не лунаць у аблоках і не будаваць неажыццявімыя планы. За час вучобы ў Акадэміі я, як самалёт на ўзлётнай паласе, прадзьмуў усе маторы, праверыў усе тэхнічныя складнікі, агледзеў узлётную дарожку, прадумаў стратэгію. Вучыўся мастацтву арганізацыі працэсу ў шырокім сэнсе.

***— Што менавіта табе сёння цікавае ў тэатры?***

— Адкрыты дыялог з гледачом. Люблю з залы назіраць за рэакцыяй публікі. Раней яна адгукалася на эзопаву мову. Сёння часам рэагуе непрадказальна. Заўсёды кранае вастрыня праблем. Я адчуваю сябе шчаслівым, калі ўстанаўліваецца звінячая цішыня, як у нашым “Бегу”, і ўсе слухаюць акцёра. “Бег” злучае два светы. Адзін — вялікі белагвардзейскі разгублены свет расійскай гісторыі. Другі — прыватнае трагічнае жыццё асобных людзей. Бываюць спектаклі, якія цікава глядзець, але пры гэтым зусім не хочацца думаць разам з яго стваральнікамі. Бывае, што і глядзець, і думаць хочацца. “Бег” быў маім першым спектаклем у Рускім тэатры. Ідзе дагэтуль, і я пераканаўся — на ім публіка думае, суперажывае, жыва рэагуе.

***— Хочацца зрабіць выснову, што вы адпрацавалі мадэль творча перспектыўнага тэатра.***

— Хацелася б у гэта верыць.

Таццяна **Арлова**

# Шэдэўры, якія заўсёды побач

**У фондах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі — нямала прадметаў мастацтва, якія маюць не толькі еўрапейскую, але і сусветную каштоўнасць. У большай ступені гэта датычыцца жывапісу: работ як айчынных мастакоў, так і прадстаўнікоў іншых краін, чые карціны ў свой час былі набытыя музеем. Сёння тут ёсць што паглядзець сапраўдным знаўцам — і ў пастаяннай экспазіцыі, і на рэгулярна праводзімых выставах, калі ўвазе наведвальнікаў прадстаўляюцца лепшыя работы з музейных запаснікаў. Вось і ў нашым цыкле публікацый мы раскажам пра сапраўдныя шэдэўры беларускага і сусветнага выяўленчага мастацтва, убачаныя ў галоўным музеі краіны.**

Для беларускага мастацтва імя Язэпа Драздовіча ўнікальнае і сімвалічнае. Дзейнасць гэтага мастака была звязана з Заходняй Беларуссю. Сучаснікі параўноўвалі Драздовіча з Леанарда да Вінчы па ўніверсальнасці яго інтарэсаў і захапленняў. Драздовіч вывучаў гісторыю, археалогію, этнаграфію Беларусі. Ён займаўся графікай, скульптурай, жывапісам, літаратурай, вёў дзённікі, выкладаў. Менавіта ў Вільні (сучасным Вільнюсе) у 1930-я гады Язэп Драздовіч ствараў свае касмічныя серыі. Дбайна вывучаў астранамічную літаратуру ў бібліятэцы Віленскага ўніверсітэта і распрацоўваў свае тэорыі ўзаемадзеяння планет і праекты лятаючых касмічных ракет. У той час навука лі-



чыла, што ўсе планеты заселены. Сваю задачу, як мастака, Драздовіч бачыў у тым, каб падрабязна расказаць нам пра жыццё на іншых планетах. У музейнай экспазіцыі прадстаўлены дзве яго жывапісныя работы з серыі “Жыццё на Сатурне”. Мастак стварае пейзажы, у якіх падрабязна паказваецца свет, убачаны ва ўяўных касмічных падарожжах. Архітэктура, прырода, геаграфічныя асаблівасці на іншых планетах, адлюстраваныя аўтарам, шмат у чым нагадваюць зямныя пейзажы. У вугле карціны мастак абавязкова ставіў знак ці сімвал планеты, на адвароце дэталёва апісваў само месца.

Сёння для даследчыкаў работы Язэпа Драздовіча — гэта ўнікальны прыклад навуковай фантастыкі, якая існавала ў беларускім мастацтве. Прыклад таго, як творчая асоба здольная перайначваць атрыманыя веды і ствараць новы нябачаны свет.

Карціна народнага мастака Беларусі Мая Данцыга “Мой горад старажытны, малады”, напісаная аўтарам у 1972 годзе, адрозніваецца вялікімі памерамі, сакавітасцю фарбаў, манументальнай кампазіцыяй і незвычайным ракурсам, узятым нібы з вышыні птушынага палёту. У гэтым творы жывапісец захаваў від цэнтральнай часткі Мінска, у якім ён нарадзіўся і вырас. Май Данцыг імкнецца асэнсаваць гістарычны і псіхалагічны змест гарадской тэмы, да якой звяртаўся на працягу ўсёй сваёй творчасці. Жывыя фарбы штодзённасці, рух людзей, машын адушаўляюць халодную прыгажосць формаў новай архітэктуры. У выбраным мастаком ракурсе бачныя адначасова і старажытныя, і сучасныя будынкі. Адлюстраваная вуліца Няміга вядомая з XII стагоддзя. Яе назва паходзіць ад аднайменнай рэчкі, якая з часам абмялела і на працягу XIX — пачатку XX стагоддзяў была ўзята ў калектар. Да пачатку 1970-х гадоў Няміга ўяўляла з сябе вуліцу, забудаваную пераважна старажытнымі будынкамі XVI-XIX стагоддзяў. Падчас рэканструкцыі самой вуліцы і пракладкі праспекта Пераможцаў была знішчана вялікая колькасць помнікаў архітэктуры, у тым ліку і гатычная Халодная сінагога XVI стагоддзя, якая адлюстравана на карціне ў правым ніжнім вугле каля будынка, які ўзводзіцца. У XVIII — пачатку XX стагоддзяў захаваны ў творы раён засяляла пераважна яўрэйская беднота. У гады Другой сусветнай вайны на гэтым месцы размяшчалася Мінскае гета. За будынкам Белпрампраекта, які будуецца, у карціне адлюстраваны помнік архітэктуры XVII стагоддзя — храм, які захаваўся да нашых дзён. Месца, дзе ён размяшчаецца, сёння называецца вуліцай Кірылы і Мяфодзія. Першапачаткова ж гэты будынак быў касцёлам Благавешчання і належаў жаночаму манастыру бернардзінак. У 1870 годзе манастыр быў перададзены праваслаўнай царкве. Пасля Другой сусветнай вайны былы касцёл стаў праваслаўным Свята-Духавым кафедральным саборам. За ім у творы Мая Данцыга можна ўбачыць будынак самога манастыра. Ён добра захаваўся і ў пасляваенны час выкарыстоўваўся пад жыллё. У пачатку 1990-х гадоў яго перадалі праваслаўнай царкве. Адлюстраваны ў карціне архітэктурны комплекс знаходзіцца ў Верхнім горадзе, які захоўваў вядучую ролю ў жыцці Мінска з канца XVI стагоддзя аж да сярэдзіны XX-га. Яго архітэктурны ансамбль, які сфарміраваўся на працягу некалькіх стагоддзяў, з’яўляецца ўнікальным запаведнікам горадабудаўнічага мастацтва з рысамі готыкі, рэнесансу, барока і класіцызму. У глыбіні карціны відаць яшчэ адзін помнік архітэктуры, створаны ўжо ў XX стагоддзі, — Нацыянальны акадэмічны Вялікі тэатр оперы і балета, які знаходзіцца ў скверы, акружаным вуліцамі з чатырох бакоў. Некалі на месцы сквера размяшчалася плошча, якая называлася Траецкай. Яна ўзнікла ў XVI стагоддзі. У хуткім часе на ёй быў пабудаваны касцёл. У пачатку XIX стагоддзя храм згарэў і больш не аднаўляўся. Да сярэдзіны XX стагоддзя плошча выконвала выключна гандлёвыя функцыі. Аднак у 1935-1937 гадах тут быў узведзены тэатр оперы і балета. Манументальны будынак уражвае сваім маштабам, прытым што ён зменшаны амаль удвая ад першапачатковага праекта. Падчас Другой сусветнай вайны ўся плошча перад тэатрам была абнесена калючым дротам і ператворана ў лагер для ваеннапалонных. У далейшым яе засадзілі дрэвамі і ператварылі ў сквер. Такім чынам, карціна Мая Данцыга ўяўляе з сябе не толькі мастацкую, але і гістарычную каштоўнасць. Яна свед-



Я. Драздовіч. “Сустрэча вясны на Сатурне”. 1932



Я. Драздовіч. “Сатурніянскі пейзаж”. 1931



М. Данцыг. “Мой горад старажытны, малады”. 1972





В. Сумараў. "Мой дом". 2008-2009

чыць пра існаванне тых архітэктурных помнікаў, якія не захаваліся да нашых дзён.

Пранікаючы ў гісторыю, Май Данцыг імкнецца сінтэтычна ахапіць сутнасць горада. Гэта не проста панарамны пейзаж з шэдэўрамі старажытнага дойлідства, які сведчыў бы пра захапленне мастака даўнінай і нацыянальнымі традыцыямі. У дадзеным творы майстрам робіцца акцэнт, перш за ўсё, на працягласці жыцця архітэктуры ў часе, біяграфіі горада. Май Данцыг нібы імкнецца да пераадолення факта ў вобразнай перадачы паняццяў дзеля выражэння свайго светапогляду. Пластычнае вырашэнне гэтага твора з'яўляецца ўнікальным у выяўленчым мастацтве Беларусі. У кампазіцыйнай прасторы спалучаюцца манументальная выразнасць і экспрэсія формы, даведзенай аўтарам да "звінячай" цэласнасці і прастаты, дэкаратыўнасць колеравых вырашэнняў і нечаканыя ракурсы. У гэтым праяўляецца своеасаблівасць творчай манеры Мая Данцыга, якая непарыўна звязана з вобразна-жывапісным мысленнем майстра.

Карціна "Мой дом", напісаная ў 1972 годзе заслужаным дзеячам мастацтваў Беларусі Васілём Сумаравым, увайшла ў шэраг маштабных твораў нацыянальнага жывапісу, якія даюць магчымасць сцвярджаць, што беларуская мастацкая школа займала прыкметнае месца ў разнастайнай панараме савецкага мастацтва 1970-х гадоў. На Усесаюзнай выставе 1973 года ў Маскве твор, які стаў пасля адной з самых вядомых работ Васіля Сумарава, адразу ж прыцягнуў увагу шырокага кола гледачоў. Неўзабаве пасля выставы жывапісец быў уключаны ў лік маладых мастакоў з розных рэспублік Савецкага Саюза, творчыя партрэты якіх выдавецтва "Савецкі мастак" рыхтавала для серыі публікацый "Новыя імёны".

У дадзеным творы адлюстраваны від Мінска з вышыні птушынага палёту. Цэнтральнае месца ў карціне займае чырвоны двухпавярховы драўляны дом. Менавіта ў ім, у доме, які знаходзіўся паблізу ад чыгункі, нарадзіўся і вырас мастак. У тыя гады карціна дзякуючы святочнай атмасферы ўспрымалася як аптымістычны лозунг.

У шматлікіх, увасобленых, як кадры з фільма, сцэнках Васіль Сумараў прадстаўляе свет свайго дзяцінства. У адным з вокнаў дома адлюстраваны суседзі, якія святкуюць вяселле, у другім — сушаць рыбу. На вуліцы героі карціны гутараць, займаюцца фізкультурай, чытаюць кнігу. У некаторых дзіцячых вобразах мастак адлюстраваў самога сябе. Свет роднага дома насычаны падрабязнымі дэталямі побыту, якія запомніў дзіцячы погляд. Жывапісец апускае ўсё сумнае, што захоўваецца ў памяці, і паказвае нам чысціню дзіцячых надзей, памкненняў і ўвагу старэйшых, якая саграває душэўным цяплом. Поліфанічны характар палатна, які вызначае мантажны прынцып стварэння, не парушае цэласнасці яго ўспрымання.

Асаблівай увагі заслугоўвае драўляная рама твора. Яна была выканана Васілём Сумаравым уласнаручна. Кампазіцыя рамы арганічна спалучаецца з прасторай карціны, дапаўняючы яе на сэнсавым і фармальным узроўнях. На ёй мастак намаляваў сябе, а таксама сваіх бацькоў.

Карціна "Мой дом" пазней мела некалькі аўтарскіх паўтораў.

Большая частка творчай біяграфіі жывапісца была звязана з работай з адоранымі дзецьмі. Адразу ж пасля заканчэння Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута (цяпер — Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў) Васіль Сумараў стаў кіраўніком адной з самых вядомых дзіцячых студый выяўленчага мастацтва пры мінскім Палацы тэкстыльшчыкаў. Праца з дзецьмі, якая

доўжылася многія гады (з 1965 года па 1986 год), аказала ўплыў на творчы метад мастака. Яго спецыфіка заключаецца ў тым, што ў сваёй творчасці Васіль Сумараў абапіраецца не толькі на досвед пластычных мастацтваў. У творах жывапісца прысутнічае і тэатральна-гульнявы пачатак, і элементы фальклору. У цэлым жа, мастак імкнецца прытрымлівацца традыцый рэалістычнага мастацтва.

На Першай Усебеларускай выставе 1925 года, з якой пачынае адлік стабільнага існавання беларускае мастацтва савецкага часу, экспанаваўся пейзаж Уладзіміра Кудрэвіча (1884-1957) "Раніца вясны", створаны ў 1924 годзе. І, напэўна, цяжка знайсці іншы твор таго часу, які так бы адпавядаў радаснаму натхненню і аптымізму 1920-х гадоў.

Мастак надае, падавалася б, выпадкова выбранаму матыву сімвалічны настрой. Гай, які зіхаціць каштоўнымі блікамі ад кветак, расы, ранішняга святла, паказвае адчуванне прыўзнятага стану душы майстра. На першым плане пахіленая бярозка — знак смутку. Але напрамак нахілу — ад левага ніжняга вугла ў правы верхні — як вядома, выклікае мажорны настрой і неўсвядомленае адчуванне ўздыму і росту.

Уладзімір Кудрэвіч выкарыстоўвае прыёмы імпрэсіянізму, імкнецца перадаць пленэрны настрой.

Гэта адзіны твор Уладзіміра Кудрэвіча 1920-х гадоў, які захаваўся пасля Вялікай Айчыннай вайны. Астатнія "імпрэсіяністычныя" палотны былі знішчаны самім мастаком ці загінулі падчас ваеннага ліхалецця.

Мастацкае жыццё Расіі мяжы XIX-XX стагоддзяў носіць складаны, часам супярэчлівы характар. Праблема пошуку гармоніі і прыгажосці кожным мастаком вырашаецца па-свойму, творчыя метады многіх з іх унікальныя і часцяком не могуць разглядацца ў рамках якога-небудзь напрамку. Менавіта на мяжы стагоддзяў ствараецца небывалая колькасць мастацкіх аб'яднанняў. Сярод іх можна вылучыць такія, як "Свет мастацтва", "Саюз рускіх мастакоў", "Бубновы валет", "Блакітная ружа".

Адной з прыкметных фігур мастацкага жыцця Расіі гэтага перыяду быў Барыс Кустодзіеў, які меў унікальны, толькі яму ўласцівы стыль. У кожнай карціне майстра адчуваецца прысутнасць свята, радасці жыцця. Відаць, таму адным з любімых кустодзіеўскіх сюжэтаў стала вясёлая, шумная і гасцінная масленіца. Атмасфера раздольнага гуляння захапляе нас амаль адразу. У бясконцай "сумятні" шматлікіх сюжэтаў карціны можна адкрываць усё новыя і новыя павароты. Святочны настрой узмацняе пейзаж. Горад прыгожы і прыбраны, нібы цацачны. Прырода захапляе незвычайным багаццем яркіх фарбаў.

Назіральнасць, іронія, уменне знайсці радасць у малазначным, шчырыя і ветлівыя адносіны да людзей вызначылі характар творчасці мастака. Крытыкі пісалі пра яго: "Яго цікавіць жыццё — жывое, кіпучае, разнастайнае, рознакаляровае жыццё". Творы Кустодзіева нясуць у сабе зарад дзіўнай энергіі, прамяністага адчування паўнаты жыцця.

У 1910 годзе ў Маскве з вялікім скандалам прайшла першая выстава маладых мастакоў, якія аб'ядналіся ў творчую садружнасць пад назвай "Бубновы валет". На ёй паказалі свае карціны Аляксандр Купрын, Пётр Канчалоўскі, Васіль Раждзественскі, Роберт Фальк, Арыстарх Лянтулаў, Ілья Машкоў, Міхаіл Ларыёнаў, Наталля Ганчарова. Вернісаж выклікаў абурэнне публікі і мастацкай крытыкі, якая



У. Кудрэвіч. "Раніца вясны". 1924



Б. Кустодзіеў. "Масленіца". 1924







І. Машкоў. “Нацюрморт з дынямі і гарбузамі”. 1914-1915

адгукнулася пра ўбачанае так: “...гэта нейкі кашмар, суцэльнае гарачкавае трызненне, галюцынацыя вар'ятаў... Удзельнікі выставы ўсё прыгожае, дзеля чаго варта і трэба жыць, вырашылі знішчыць дашчэнту, затаптаць і апляваць слінай злосці і адчаю перад сваім бяссіллем спазнаць сапраўдную прыгажосць. Яны пагрэбавалі ўсімі законамі творчасці...яркія фарбы і нявечанне твараў, фігур, краявідаў! Убоства і глумленне!”

Але перш за ўсё мастакі “Бубновага валета” хацелі вярнуць жывапісу характэрныя толькі яму ўласцівасці — колер, лінію, пластыку формаў і аб'ёмаў, надаць яму новае гучанне. У “Бубновых валетаў” шмат сапраўднай таленавітасці і “вясёлага рамяства”, а галоўнае, маладосці.

“Найбольшы жывапісец з усіх, напэўна, Ілья Машкоў. Яму бліжэй за ўсіх знаёмыя алейныя фарбы, і яны яму падпарадкоўваюцца...” — пісаў дружалюбна настроены паэт Максіміліян Валошын.

Ілья Машкоў нарадзіўся ў 1881 годзе ў станіцы Міхайлаўская-на-Доне Саратаўскай губерні. Вучыўся ў Маскоўскім вучылішчы жывапісу, скульптуры і дойлідства ў Канстанціна Каровіна, Валянціна Сярова, Апалінарыя Васняцова. Наведаў Аўстрыю, Германію, Францыю, Англію, Італію, Іспанію, Турцыю, Грэцыю, Егіпет. З 1918 года — прафесар.

Выкладаў ва ўласнай студыі, Дзяржаўных вольных мастацкіх майстэрнях, Вышэйшых мастацка-тэхнічных майстэрнях, Вышэйшым мастацка-тэхнічным інстытуце. Жыў і працаваў у Маскве. Быў адным з арганізатараў аб'яднання “Бубновы валет”.

Сёння ў зборы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь знаходзіцца дзесяць твораў Ільі Машкова. Набытыя на працягу другой паловы 1940-х — 1970-х гадоў у сям'і мастака і прыватных калекцыянераў, яны з'яўляюцца гонарам калекцыі рускага жывапісу.

Цікавасць да прадмета, яго формы, масы, колеру, зрабіла вядучым жанрам у творчасці мастакоў “Бубновага валета” нацюрморт. Вялікае ўздзеянне на іх аказалі карціны французкага мастака Поля Сезана. Мастакі “Бубновага валета” пасвойму пераасэнсоўвалі яго дасягненні. Нацюрморты Машкова вылучае гарачая ўлюбёнасць у натуру, прага раскрыць усе яе “сакрэты”, спасцігнуць законы “ўнутранага жыцця” прадметаў.

Адзін з лепшых твораў Ільі Машкова ў зборы музея — “Нацюрморт з дынямі і гарбузамі” 1914-1915 гадоў. Мастак захоплены самім актам “тварэння” карціны. У гэтым таксама выяўляецца ўплыў Сезана, які “адным з першых...убачыў у фарбе не толькі яе колеравую функцыю і фарбавальную ўласцівасць, але адчуў эмоцыі, што ўзнікаюць ад успрымання самога рэчыва, цеста фарбы, фактуры”.

На фоне сіне-зялёнай драпіроўкі, якая ляжыць прыгожымі складкамі, раскладзены і расстаўлены фарфоравыя і шкляныя вазы з яблыкамі і слівамі, гарбузы, кавун, кветкі ў гліняных гаршках. Інтэнсіўным, насычаным колерам мастак выяўляе “канструкцыю” кожнага прадмета. Яго захапляе разнастайнасць формаў, іх першародная моц, пластычная дасканаласць, выразнасць ліній. Нацюрморт напісаны з такім магутным жывапісным тэмпераментам, што ўзнікае адчуванне, быццам перад намі кветкі і плады першых дзён тварэння, як бы “першаўзоры” рэчаў. Карціна ўспрымаецца як урачысты гімн вялікім творчым сілам Прыроды.

На гэтым мы, бадай што, прыпынім наша падарожжа па залах музея да наступнага разу. Бо сапраўдных шэдэўраў жывапісу там нямала. Прадоўжым з імі знаёмства ў будучым выпуску часопіса.

Веніямін **Міхееў**